

# «ДЗЕЦІ»

## НАПАД НА ДАНЕЦКІ АКАДЭМІЧНЫ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР У МАРЫУПАЛІ, УКРАІНА

AMNESTY INTERNATIONAL

**Amnesty International – гэта рух, які аб’ядноўвае 10 мільёнаў чалавек, што звяртаюцца да чалавечнасці ў кожным з нас і выступаюць за тое, каб усе мы маглі карыстацца правамі чалавека.**

**Мы імкнёмся да свету, у якім тыя, што валодаюць уладай, паважаюць міжнароднае права і нясуць адказнасць за свае дзеянні.**

**Мы не залежым ні ад якіх урадаў, палітычных ідэалогій, эканамічных інтарэсаў ці рэлігійных перакананняў і атрымліваем сродкі пераважна з сяброўскіх унёскаў і прыватных ахвяраванняў.**

**Мы перакананыя, што дзейнасць у духу салідарнасці і спагады да людзей ва ўсім свеце можа змяніць наша грамадства да лепшага.**

© Amnesty International 2022
Калі іншае не згаданае, змест гэтага дакумента прадстаўляецца паводле ліцэнзіі Creative Commons (з указаннем аўтарства, некамерцыйна, без вытворных, сусветная 4.0).
Https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/4.0/legalcode

Дадатковую інфармацыю пра дазволы можна знайсці на нашым сайце: www.amnesty.org

Калі ёсць згадка, што матэрыял належыць не Amnesty International, а іншаму праваўладальніку, гэты матэрыял не падлягае дзеянню ліцэнзіі Creative Commons.

Упершыню апублікавана ў 2022 г. Amnesty International Ltd,
Peter Benenson House, 1 Easton Street, London WC1X 0DW, UK

**ІНДЭКС: EUR 50/5713/2022 Belarusian**
**МОВА АРЫГІНАЛУ: АНГЛІЙСКАЯ**

**amnesty.org**

***Здымак на вокладцы:***
Спадарожнікавы здымак разбуранага Данецкага акадэмічнага абласнога драматычнага тэатра 26 сакавіка 2022 г. © 2022 CNES/Airbus

AMNESTY INTERNATIONAL

# ЗМЕСТ


**КАРОТКІ ЗМЕСТ** **2**

**МЕТАДАЛОГІЯ** **6**

**1. АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ** **9**

1.1 БЯГУЧЫ КАНФЛІКТ 10

**2. ЖЫЦЦЁ Ў ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ ДА НАПАДУ** **13**

**3. НАПАД** **28**

3.1 НАЙБОЛЬШ ІМАВЕРНАЯ ВЫКАРЫСТАНАЯ ЗБРОЯ: СКІНУТЫЯ РАСІЙСКІЯ АВІЯБОМБЫ 32

3.2 ПРАЎДАПАДОБНАЯ АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ ТЭОРЫЯ: РАСІЙСКАЯ КРЫЛАТАЯ РАКЕТА 37

3.3 НЕПРАЎДАПАДОБНЫЯ ТЭОРЫІ 39

3.4 СТРАТЫ 42

3.5 АЦЭНКА ШКОДЫ І НЕЗАРЭГІСТРАВАНЫХ СТРАТАЎ 43

3.6 ПАВЕДАМЛЕННІ З ПЕРШЫХ РУК ПРА СТРАТЫ 52

**4. МІЖНАРОДНАЯ ПРАВАВАЯ АСНОВА** **57**

4.1 НАПАД НА ТЭАТР ПАВОДЛЕ МІЖНАРОДНАГА ПРАВА 63

**5. ВЫСНОВЫ І РЭКАМЕНДАЦЫІ** **67**

# КАРОТКІ ЗМЕСТ

16 сакавіка 2022 года, неўзабаве пасля 10:00, расійскі авіяўдар зруйнаваў Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр у Марыупалі, Украіна. Падчас нападу ў тэатры і вакол яго знаходзіліся сотні цывільных асобаў; многія з іх загінулі. Тэатр выразна ўспрымаўся як цывільны аб’ект, магчыма, нават у большай ступені, чым любое іншае месца ў горадзе. *Сведчанні, сабраныя Amnesty International, паказваюць, што напад быў ваенным злачынствам.*

У перыяд з 16 сакавіка па 21 чэрвеня Amnesty International сабрала і прааналізавала шэраг сведчанняў, звязаных з нападам на тэатр, у тым ліку атрыманыя з першых рук паказанні 53 выжылых і тых, хто быў сведкам нападу і яго наступстваў, 28 з якіх знаходзіліся падчас нападу у тэатры ці побач з ім; спадарожнікавыя здымкі, зробленыя перад самым нападам і неўзабаве пасля яго; дадзеныя з радараў перад нападам і пасля яго; пацверджаныя фота- і відэаматэрыялы, атрыманыя ад выжылых і сведкаў, два камплекты праектных планаў тэатра і інфармацыю з адкрытых крыніцаў.

З пачатку вайны 24 лютага і да разбурэння тэатр служыў прытулкам для цывільных асобаў, якія ратаваліся ад гвалту ў іншых частках горада, цэнтрам размеркавання ежы, вады і крытычна важнай інфармацыі пра адчайна чаканыя калідоры эвакуацыі, а таксама вызначаным месцам збору для меркаваных эвакуацый. З пачатку вайны да моманту нападу ў тэатры жыло больш за тысячу чалавек.

З часам насельніцтва тэатра істотна вырасла. З пачатку вайны да 4 сакавіка тут хавалася каля ста чалавек. Гэтыя першыя прыбышы былі пераважна тагачаснымі ці колішнімі супрацоўнікамі тэатра і чальцамі іх сем’яў, а таксама людзьмі, якія ўцяклі ад гвалту ў пачатку канфлікту. 5 сакавіка колькасць людзей, якія хаваліся ў тэатры, рэзка павялічылася. Напярэдадні па горадзе імкліва разышлася навіна, быццам 5-га з’явіцца «афіцыйны» гуманітарны калідор, якім людзі змогуць пакінуць горад на аўтобусах ці ўласных аўтамабілях. Людзям наказалі падысці да трох пунктаў збору ў горадзе, адным з якіх быў драматычны тэатр.

Раніцай 5 сакавіка ў тэатры сабралася мноства людзей — магчыма, некалькі тысячаў. Калі чаканая эвакуацыя ў той дзень не пачалася, некалькі сотняў чалавек засталіся ў тэатры.

З 5 да 14 сакавіка гарадскія баі набліжаліся, і ў тэатр прыбыла больш людзей. Паколькі іх колькасць расла, зрабілася складана знайсці для ўсіх бяспечнае месца для жыцця. Некаторыя часткі будынка, якія лічыліся самымі бяспечнымі, былі запоўненыя так шчыльна, што было цяжка засяліць туды кагосьці яшчэ. І наадварот, некаторыя зоны, у прыватнасці, сцэна і канцэртная зала, лічыліся ў выпадку нападу на тэатр найбольш уразлівымі. Валанцёры схілялі людзей не заставацца ў гэтых зонах.

14 сакавіка колькасць людзей, якія хаваліся ў тэатры, крыху зменшылася, а 15 сакавіка зменшылася кардынальна. Гэта тлумачылася частковым поспехам «неафіцыйных» гуманітарных калонаў. 14 сакавіка адной калоне аўтамабіляў удалося эвакуявацца з горада. Многія з іх ад'язджалі ад тэатра. Паведамляецца, што гэта была першая буйная эвакуацыя пасля таго, як горад трапіў у аблогу. Хутка разышліся навіны, што машыны здолелі дабрацца да падкантрольнай Расіі тэрыторыі ці тэрыторыі, што ўтрымлівалася Украінай. На наступны дзень, 15 сакавіка, сотні аўтамабіляў – і тысячы чалавек – гэткім жа чынам пакінулі горад. Сотні людзей, якія жылі ў тэатры, эвакуяваліся, забраўшы са стаянкі ля тэатра большасць аўтамабіляў. Няспынны гвалт і разуменне, што эвакуацыя магчымая, прывялі да таго, што раніцай 16 сакавіка з'ехала яшчэ больш чалавек.

Напад на тэатр адбыўся 16 сакавіка неўзабаве пасля 10:00. Падчас удару ў тэатры і ля яго ўсё яшчэ былі сотні цывільных асобаў.

Невядома дакладна, колькі чалавек загінула, але іх, імаверна, было нашмат менш, чым паведамлялася раней. Адразу пасля нападу Марыупальская гарадская рада заявіла, што загінула каля 300 чалавек. Правёўшы наступнае расследаванне, Associated Press прыйшло да высновы, што загінуць магло парадку 600 чалавек.

Апытаныя назвалі Amnesty International імёны і прозвішчы чатырох чалавек, якія загінулі ў выніку авіяўдару. Таксама апытаныя назвалі Amnesty імёны (без прозвішчаў) яшчэ траіх чалавек, якіх яны ведалі і якія, на іх думку, загінулі ў выбуху. Апроч гэтага, некалькі выжылых і іншыя сведкі паведамілі, што бачылі трупы людзей, якіх не маглі апазнаць. Amnesty таксама правяла грунтоўны агляд традыцыйных СМІ і сацыяльных сетак (на англійскай, украінскай і рускай мовах), каб высветліць, ці не паведамлялася публічна пра іншыя смяротныя выпадкі. Amnesty International высветліла, што традыцыйныя СМІ паведамілі пра тры, а сацыяльныя сеткі – яшчэ пра тры іншыя смяротныя выпадкі. Грунтуючыся на аналізе паказанняў сведкаў і гэтых крыніцах, Amnesty International мяркуе, што ў выніку нападу загінула не менш за дзесяць чалавек і што многія іншыя смерці, імаверна, застаюцца незарэгістраванымі.

Удар, магчыма, забраў менш жыццяў, бо праз няспынны гвалт і здзейсненыя паблізу нядаўнія напады людзі былі менш схільныя, чым звычайна, выбірацца вонкі і, што, магчыма, самае важнае, у тэатры засталося менш людзей, і большасць з іх змагла перамясціцца ў тыя часткі будынка, якія лічыліся бяспечнейшымі.

Сведчанні даводзяць, што напад на тэатр амаль дакладна быў авіяўдарам, нанесеным расійскімі вайскоўцамі. Расійскі тактычны знішчальнік, хутчэй за ўсё, ударыў па тэатры дзвюма 500-кілаграмовымі бомбамі. Шматлікія выжылыя і сведкі паведамлялі, што непасрэдна перад ударам чулі ў гэтым раёне гук самалёта. Пашкоджанні, выкліканыя выбухам, характэрныя для ўзрыву дзвюх (але, імаверна, і адной) вялікіх авіябомбаў, скінутых адначасова, якія ўдарылі побач адна з адной у межах дасягальнасці цэлі. Для сведкаў адначасовы (ці амаль адначасовы) узрыў двух боепрыпасаў у будынку будзе выглядаць і гучаць як адзін асобны выбух.

Amnesty International разгледзела некалькі альтэрнатыўных тэорый адносна таго, хто здзейсніў напад і якая зброя выкарыстоўвалася. Наяўныя дадзеныя сведчаць, што адна з гэтых тэорый – удар расійскай крылатай ракетай, – імаверная, але малаверагодная. Следства не знайшло вартых даверу доказаў, якія б падмацавалі іншыя магчымыя тлумачэнні, у тым ліку засведчылі б напад украінскіх войскаў з прымяненнем бомбаў ці балістычных ракет ці выкарыстанне любым з бакоў канфлікту лягчэйшай зброі, такой, як рэактыўная артылерыя. Акрамя таго, следства не знайшло пераканаўчых доказаў, якія падмацавалі б версію Міністэрства абароны РФ, нібыта напад быў аперацыяй пад фальшывым сцягам палка ўкраінскіх войскаў «Азоў», які, як сцвярджаецца, мэтаскіравана зруйнаваў будынак знутры.

Хаця сведчанні паказваюць, што на драматычны тэатр напалі расійскія войскі, Amnesty International не можа з усёй дакладнасцю акрэсліць, *чаму* напад адбыўся, а гэта важна для вызначэння таго, ці з'яўляецца ён ваенным злачынствам. Amnesty разгледзела чатыры магчымыя тлумачэнні, чаму расійскія войскі напалі на тэатр:

1. Тэатр зрабілі цэллю з веданнем, што гэта цывільны аб'ект.
2. Тэатр зрабілі цэллю, мяркуючы, што гэта сапраўдны ваенны аб'ект.
3. Тэатр не быў цэллю, а пацярпеў у выніку невыбіральнага нападу.
4. Тэатр не быў цэллю, а памылкова пацярпеў у нападзе на іншае месца, здзейсненым з думкай, што яно з'яўляецца ваенным аб'ектам.

Сведчанні пераканаўча даводзяць, што драматычны тэатр быў намечанай цэллю нападу. Тэатр быў вялікім пазнавальным будынкам і культурнай славутасцю горада. Да таго ж, ён стаяў адасоблена ў цэнтры вялікага парку, аточаны прыкладна 100-метровай зялёнай зонай, вакол якой ішла шырокая дарога. Удар адбыўся ясным ранкам і прыйшоўся на ўнутраную частку асноўнага корпуса тэатра.

Цывільны характар тэатра і прысутнасць у ім мноства цывільных асобаў былі відавочныя. Цывільныя асобы пастаянна і яўна прысутнічалі вакол тэатра, іх «вобраз жыцця» быў лёгка пазнавальны. Як мінімум за тры дні да нападу на зямлі ля галоўнага і задняга ўваходаў у тэатр напісалі па-руску слова «ДЗЕЦІ», прычым літары былі дастаткова вялікімі, каб іх можна было ўбачыць з самалётаў.

Тэатр не быў сапраўднай ваеннай цэллю. Нягледзячы на тое, што ў час нападу ў іншых частках горада непадалёк ад тэатра ішлі баі, а ў яго ваколіцах у дні перад нападам ненадоўга з’яўлялася невялікая колькасць салдатаў (большасць з іх дапамагала эвакуяваць цывільных асобаў, дастаўляла ежу ці іншую гуманітарную дапамогу ці інфармавала пра эвакуацыю), няма ніякіх сведчанняў пра тое, што тэатр некалі страчваў свой цывільны статус.

Побач з тэатрам не было законных ваенных цэляў. У час нападу або на працягу некалькіх дзён да нападу ўнутры тэатра ці побач з ім не было значнай ваеннай прысутнасці. Нішто ў характары, размяшчэнні, прызначэнні ці выкарыстанні будынка не давала любому з бакоў канфлікту падставы меркаваць, што тэатр з’яўляецца ваеннай цэллю. Ніхто з 28 выжылых у нападзе, апытаных Amnesty International, і ніхто з іншых сведкаў, што былі ў тэатры ці каля яго ў дзень нападу, не паведаміў нічога, што ўказвала б на выкарыстанне ўкраінскімі вайскоўцамі тэатра ў якасці аператыўнай базы або месца для захавання зброі ці пачатку наступаў.

Актыўнасць цывільных асобаў у тэатры, якая лёгка ідэнтыфікавалася, у спалучэнні з адсутнасцю хоць нейкай значнай ваеннай прысутнасці дазваляе меркаваць, што расійскія войскі, хутчэй за ўсё, наўмысна нанеслі ўдар па тэатры, ведаючы, што гэта цывільны аб’ект, і гэта з’яўляецца ваенным злачынствам. Усе следчыя, якія даследуюць інцыдэнт, у тым ліку супрацоўнікі Канцылярыі Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда (МКС), мусяць старанна разгледзець такое тлумачэнне інцыдэнту як найбольш імавернае. Аднак сведчанні таксама паказваюць, што пры любой разумнай інтэрпрэтацыі трох іншых, менш імаверных сцэнароў – што тэатр зрабілі цэллю, лічачы яго сапраўдным ваенным аб’ектам, што ён пацярпеў памылкова падчас нападу на іншую цэль ці ў выніку невыбіральнага нападу, – удар усё адно з’яўляецца ваенным злачынствам.

Сур’ёзнасць парушэння і выкліканыя ім чалавечыя пакуты падкрэсліваюць неабходнасць правесці далейшыя неадкладныя і празрыстыя расследаванні, каб вызначыць поўны маштаб чалавечых стратаў і прыцягнуць вінаватых да крымінальнай адказнасці за гібель і сур’ёзныя раненні цывільных асобаў і шкоду, нанесеную цывільнай інфраструктуры.

# МЕТАДАЛОГІЯ

Гэты даклад – вынік палявых і дыстанцыйных даследаванняў, праведзеных у перыяд з 16 сакавіка да 21 чэрвеня 2022 г. У сваіх выніках і высновах справаздача абапіраецца на некалькі тыпаў доказаў, у тым ліку на непасрэдныя паказанні тых, хто выжыў і быў сведкам нападу на Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр, правераныя фота- і відэаматэрыялы, атрыманыя ад выжылых і сведкаў, і афіцыйныя дакументы, улучна з праектнымі планамі. Да таго ж, падчас даследавання адкрытых крыніцаў быў прааналізаваны лічбавы кантэнт, у тым ліку відэа, фотаздымкі і радыёперахопліванні, а таксама спадарожнікавыя здымкі і дадзеныя з радараў, атрыманыя перад самым нападам і неўзабаве пасля яго.

Інтэрв’ю ладзіліся асабіста ў Дняпры, Львове і Запарожжы, а таксама па тэлефоне з людзьмі ў некаторых іншых месцах ва Украіне, Расіі і ў іншых краінах Еўропы. Amnesty International не мела доступу да Марыупаля і падчас правядзення даследавання не магла правесці там дыстанцыйныя інтэрв’ю з выжылымі і сведкамі, бо гарадская тэлекамунікацыйная сетка не функцыянавала. Даследчыкі Amnesty International апыталі 53 чалавекі, у тым ліку 28 выжылых у нападзе, 6 іншых сведкаў, што былі ў тым раёне падчас нападу, 8 сведкаў, якія пабывалі ў тэатры неўзабаве пасля нападу, і 4 чалавек, якія жылі ў тэатры ў дні перад нападам. Брыфінг таксама абапіраецца на паказанні сведкаў, сабраныя і прааналізаваныя журналістамі і іншымі праваабарончымі арганізацыямі.

Amnesty International паінфармавала усіх апытаных пра характар і мэты даследавання і пра тое, як будзе выкарыстоўвацца атрыманая ад іх інфармацыя. Перад інтэрв’ю ад усіх апытаных была атрыманая вусная згода. Ніякага матэрыяльнага заахвочвання ў абмен на аповеды апытаным не прапаноўвалася. Інтэрв’ю звычайна доўжылася ад адной да трох гадзінаў. Большасць інтэрв’ю праводзілася з дапамогай перакладчыкаў, якія свабодна валодаюць украінскай і рускай мовамі; некалькі інтэрв’ю прайшло па-англійску.

З прычынаў канфідэнцыйнасці і бяспекі – асабліва бяспекі сваякоў, якія ўсё яшчэ жывуць у Марыупалі, – 24 інтэрв’ю праводзілася з умовай, што Amnesty International устрымаецца ад

публікацыі імёнаў апытаных і любой інфармацыі, якая дапаможа ідэнтыфікаваць іх саміх, іх сваякоў ці некага яшчэ, хто можа аказацца ў небяспецы, калі яго ідэнтыфікуюць.

Каб правесці адкрытае расследаванне нападу, Лабараторыя крызісных доказаў Amnesty International вывучыла і праверыла 46 фотаздымкаў і відэа з месца ўдару, узятых з такіх сацыяльных сетак, як твітар і тэлеграм. Таксама лабараторыя праверыла яшчэ 99 атрыманых даследчыкамі фотаздымкаў і відэа, якія былі прыватнымі і не размяшчаліся публічна ў сацыяльных сетках. Таксама Amnesty International атрымала доступ да трох архіваў, якія ўтрымліваюць 268 радыёзапісаў, звязаных з дзеяннямі расійскіх войскаў ва Украіне 16 сакавіка 2022 г.

27 чэрвеня 2022 г. Amnesty International накіравала лісты ў Міністэрства замежных справаў і Міністэрства абароны Расіі. У лістах рабіўся запыт на канкрэтную інфармацыю адносна нападу на драматычны тэатр. Таксама там рабіўся запыт пра любыя звязаныя з ім крымінальныя расследаванні. Апроч гэтага, у лісце прыводзіўся кароткі пераказ доказаў Amnesty International, якія маюць дачыненне да нападу. На момант публікацыі Amnesty International не атрымала адказу ці ад цывільных, ні ад ваенных уладаў.




↑ *Карта Марыупаля, Украіна © Складальнікі OpenStreetMap*

# 1. АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ

Марыупаль знаходзіцца на паўднёвым усходзе Украіны на паўночным узбярэжжы Азоўскага мора непадалёк ад вусця ракі Кальміус. Да бягучага канфлікту тут жыло прыкладна паўмільёна чалавек. Амаль палова жыхароў горада вызначае сябе як этнічныя рускія і амаль палова – як этнічныя ўкраінцы; у горадзе таксама ёсць значная супольнасць этнічных грэкаў. Марыупаль быў вялікім прамысловым цэнтрам, у ім знаходзіліся два найбуйнейшыя ўкраінскія металургічныя заводы: металургічны камбінат імя Ілліча і металургічны камбінат «Азоўсталь».

Марыупаль дзеліцца на чатыры адміністрацыйныя раёны:

- Прыморскі раён, які часта называюць «портам»;
- Кальміускі раён, які часта называюць «заводам» і дзе знаходзіцца металургічны камбінат імя Ілліча;
- Левабярэжны раён, які часта называюць «Левым берагам» і дзе знаходзіцца металургічны камбінат «Азоўсталь»;
- Цэнтральны раён, які часта называюць «гарадскім цэнтрам» і дзе знаходзіцца Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр.

Лічыцца, што Марыупаль мае стратэгічнае значэнне для ваеннай кампаніі Расійскай Федэрацыі ва Украіне: яго неабходна захапіць дзеля кантролю над усім Азоўскім морам і стварэння непарыўнага сухапутнага моста паміж расійскімі войскамі ў Расіі і ў Крыме, які быў акупаваны і незаконна анексаваны Расіяй у 2014 г.[1] У 2014 г. Марыупаль быў арэнай сур'ёзных баёў паміж украінскімі войскамі і войскамі Расіі і так званай Данецкай Народнай Рэспубліцы, якую Расія падтрымлівала[2].

Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр – цэнтр мастацкай адукацыі і выканальніцкага мастацтва, пабудаваны ў 1960 г., – быў адной з культурных славутасцяў горада.

1 BBC News, “Mariupol: Why Mariupol is so important to Russia's plan,” 21 сакавіка 2022 г., bbc.com/news/world-europe-60825226

2 Reuters, “Ukrainian forces reclaim port city from rebels,” 13 чэрвеня 2014 г., reuters.com/article/us-urkaine-crisis-mariupol#idUSKBN0EO0KP20140613

## 1.1 БЯГУЧЫ КАНФЛІКТ

Войскі Расійскай Федэрацыі ўварваліся ва Украіну 24 лютага 2022 г.[3] 28 лютага Генеральная Асамблея ААН пастанавіла, што ўварванне з'яўляецца незаконным прымяненнем сілы, якое парушыла Статут ААН[4]. 16 сакавіка Міжнародны суд прыняў у дачыненні да Расіі часовыя меры, каб прыпыніць яе ваенную аперацыю[5].

Баі ў ваколіцах Марыупаля пачаліся ў першы ж дзень вайны[6]. Першай часткай горада, якая зазнала напад, быў жылы масіў Усходні ў Левабярэжным раёне. Баі паступова распаўсюдзіліся амаль на ўсе часткі горада. На працягу першых некалькіх дзён вайны цывільныя асобы маглі пакінуць горад. Многія зрабілі гэта на ўласных аўтамабілях або ў экавуацыйных цягніках (паводле некаторых звестак, поўных толькі напалову). У канцы лютага чыгунка пацярпела ад нападу і зрабілася непрыдатнай для эксплуатацыі. Да 2 сакавіка расійскія войскі атачылі горад, і яго жыхары фактычна аказаліся ў аблозе[7]. У гэты час дарогі былі перакрытыя, і зрабілася амаль немагчыма пакінуць горад на аўтамабілі. З гэтага моманту значная частка цывільнага насельніцтва з трывогай чакала з'яўлення так званых эвакуацыйных калідораў, якія дазволілі б бяспечна выехаць з горада калонам з аўтамабіляў і эвакуацыйных аўтобусаў.

Кожны дзень пасля пачатку вайны гуманітарная сітуацыя ў Марыупалі пагаршалася, узброеныя канфлікты ахоплівалі новыя часткі горада, а праз амаль поўнае знішчэнне гарадской тэлекамунікацыйнай сеткі жыхары рабіліся ўсё больш ізаляванымі адно ад аднаго і ад вонкавага свету. Большая частка насельніцтва, не хочучы ці не могучы пакінуць горад, хавалася ў калідорах, падвалах і бамбасховішчах, часам – ва ўласных дамах ці суседніх будынках.

Тыя, у каго не было доступу да бяспечных прытулкаў па месцы жыхарства ці побач ці хто знаходзіўся ў частках горада, дзе баі зрабіліся занадта інтэнсіўнымі, уцякалі ў буйнейшыя сховішчы, часта ў тых частках горада – у тым ліку ў гарадскім цэнтры, – якія здаваліся бяспечнейшымі. Драматычны тэатр быў адным з найбуйнейшых сярод такіх калектыўных сховішчаў.

Паколькі баявыя дзеянні ўзмацняліся і распаўсюджваліся па ўсім горадзе, гуманітарная сітуацыя кардынальна пагаршалася. Да 6 сакавіка ніводная з сістэм забеспячэння – электрычнасцю,

3 Reuters, "Missiles rain down around Ukraine," 24 лютага 2022 г., reuters.com/world/europe/putin-orders-military-operations-ukraine-demands-kyiv-forces-surrender-2022-02-24

4 Генеральная Асаблея ААН, Рэзалюцыя, прынятая Генеральнай Асамблеяй 2 сакавіка 2022 г., 18 сакавіка 2022 г., дасяжная тут: documents-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/N22/293/36/PDF/N2229336.pdf?OpenElement

5 Міжнародны суд ААН, "Заявы пра генацыд у адпаведнасці з Канвенцыяй аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго (Украіна супраць Расійскай Федэрацыі)", 16 сакавіка 2022 г., icj-cij.org/public/files/case-related/182/182-20220316-ORD-01-00-EN.pdf

6 Reuters, Aleksandar Vasovic, "Port city of Mariupol comes under fire after Russia invades Ukraine," 24 лютага 2022 г., reuters.com/world/europe/strategic-city-mariupol-wakes-blasts-russia-invades-ukraine-2022-02-24/

7 BBC News, "Mariupol: Key moments in the siege of the city," 17 траўня 2022 г., bbc.com/news/world-europe-61179093; Reuters, Max Hunder, "Timeline: Russia's siege of the Ukrainian city of Mariupol," 30 сакавіка 2022 г., reuters.com/world/europe/russias-siege-ukrainian-city-mariupol-2022-03-30https://www.reuters.com/world/europe/russias-siege-ukrainian-city-mariupol-2022-03-30/

цяплом, газам і вадой – не працавала[8]. Акрамя таго, многія з гарадскіх прадуктовых крамаў і аптэкаў былі знішчаныя ці разрабаваныя. Значная частка цывільнага насельніцтва харчавалася, збіраючы дрэва і гатуючы ежу на адкрытых вогнішчаў. У некалькіх крамах, якія засталіся, былі надзвычай доўгія чэргі, якія часта траплялі пад расійскія ракетныя ці артылерыйскія абстрэлы[9].

У пачатку сакавіка перастала працаваць сістэма грамадскага транспарту. Электронная сувязь пасля гэтага моманту таксама была амаль недасяжная і спарадычна лавілася толькі ў некалькіх месцах. Праз адсутнасць сігналу і немагчымасць зарадзіць мабільныя прылады большая частка насельніцтва засталася без магчымасці дачыняцца з вонкавым светам[10].

Баі прывялі да маштабнага разбурэння гарадской інфраструктуры і перамяшчэння большай часткі яго цывільных жыхароў[11]. Паведамлялася пра вялізныя страты сярод цывільнага насельніцтва. Паводле ацэнак мэра Марыупаля Вадзіма Бойчанкі, загінула не менш за 20 000 цывільных асобаў[12].

Цэнтральны раён горада, дзе знаходзіцца тэатр, быў акупаваны расійскімі войскамі 17 сакавіка 2022 г. 21 красавіка Расійская Федэрацыя афіцыйна заявіла пра перамогу ў Марыупалі, аднак украінскія войскі кантралявалі часткі металургічнага камбіната «Азоўсталь» да 17 траўня[13].

8 Associated Press, Mstyslav Chernow, “20 days in Mariupol: The team that documented city’s agony,” 21 сакавіка 2022 г., apnews.com/article/russia-ukraine-europe-edf7240a9d990e7e3e32f82ca351dede

9 Associated Press, “’Why? Why? Why? Ukraine’s Mariupol descends into despair,” 16 сакавіка 2022 г., apnews.com/article/russia-ukraine-war-mariupol-descends-into-despair-708cb8f4a171ce3f1c1b0b8d090e38e3

10 Wired, “The Last Cell Tower in Mariupol,” 31 сакавіка 2022 г., wired.com/story/mariupol-ukraine-war/; Forbes, Thomas Breawster, “The Last Dats of Mariupol’s Internet”, 31 сакавіка 2022 г., forbes.com/sites/thomasbrewster/2022/03/31/the-last-days-of-mariupols-internet/?sh=64242cb65962

11 The Telegraph, “‘The destruction is enormous’: Thousands more flee Mariupol and 350,000 remain hidden in shelters,” 17 сакавіка 2022 г., telegraph.co.uk/global-health/terror-and-security/destruction-enormous-thousands-flee-mariupol-350000-remain-hidden/

12 Al Jazeera, “Ukraine war latest updates: ’20,000 civilians killed in Mariupol’”, 11 красавіка 2022 г., aljazeera.com/news/2022/4/11/three-killed-in-russian-attacks-ukraine-donetsk-liveblog

13 Reuters, “Putin claims victory in Mariupol; Ukrainian fighters hold on,” 21 красавіка 2022 г., reuters.com/world/middle-east/leading-putin-ally-predicts-mariupol-victory-thursday-2022-04-20/; Reuters, “Hundreds of Ukrainians defending Azovstal plant surrender to uncertain fate,” 17 траўня 2022 г., reuters.com/world/europe/russia-backed-separatists-say-256-ukrainian-fighters-surrendered-azovstal-2022-05-17/

## УКРАІНСКІЯ І РАСІЙСКІЯ ВОЙСКІ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЛІ Ў МАРЫУПАЛІ З 24 ЛЮТАГА 2022 Г.

На момант нападу на Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр у склад украінскіх войскаў, якія абаранялі горад Марыупаль, уваходзілі 12-я брыгада і 18-ы батальён аператыўнага прызначэння Нацыянальнай гвардыі, 36-я асобная брыгада марской пяхоты[14] і 56-я асобная мотапяхотная брыгада[15]. У паведамленнях СМІ 18-ы батальён часам згадваецца як «часць 3057»; у яго склад уваходзіць полк «Азоў», які першапачаткова дзейнічаў як крайне правы нацыяналістычны добраахвотніцкі батальён, пакуль у 2014 г. не быў афіцыйна ўключаны ў склад Нацыянальнай гвардыі[16].

Паводле розных адкрытых крыніцаў, у тым ліку правераных фотаздымкаў і паведамленняў ваенных аналітыкаў, а таксама паведамленняў у сацыяльных сетках самога палка «Азоў», незалежна пацверджаных геалакацыяй[17], у момант нападу на тэатр байцы «Азова» базаваліся пераважна на Левым беразе ці на ўсходнім баку Марыупаля, у прыватнасці, на металургічным камбінаце «Азоўсталь»[18]. Абарона Цэнтральнага раёна, у тым ліку тэатра, была ў зоне адказнасці 56-й асобнай мотапяхотнай брыгады.

Расійскія войскі, якія напалі на Марыупаль, уключаюць 810-ю асобную брыгаду марской пяхоты[19] і 150-ю мотастралковую дывізію, а таксама знішчальную авіяцыю з авіябазаў у Крыме і Расіі[20]. Гэтыя сілы мелі доступ да выведкі, назірання і рэкагнасцыроўкі ў рэжыме рэальнага часу (ISR), у тым ліку да пастаяннага відэа ў рэжыме рэальнага часу, якое патрабуецца для аналізу «вобразу жыцця» цэлі, з дапамогай такіх беспілотных платформаў, як «Арлан-10»[21].

14 Holcomb, Franklin. “The Order of Battle of the Ukrainian Armed Forces: A Key Component in European Security,” Інстытут вывучэння вайны, снежань 2016 г., understandingwar.org/sites/default/files/ISW%20Ukrainian%20ORBAT%20Holcomb%20 2016_0.pdf; Associated Press, “EXPLAINER: Who were Mariupol’s Last Defenders?” 21 May 22, https://apnews.com/article/russia-ukraine-government-and-politics-c5123a3bd2cca1de1a836670b278fbea.

15 France 24, “In Mariupol, a war of images to prove who controls the city,” 30 траўня 2022 г., observers.france24.com/en/europe/20220330-mariupol-war-images-propaganda-azov-chechen-soldiers

16 Washington Post, “Right-wing Azov Battalion emerges as a controversial defender of Ukraine,” 6 красавіка 2022 г., washingtonpost.com/world/2022/04/06/ukraine-military-right-wing-militias

17 Напрыклад, твіт @jominiW, 27 сакавіка 2022 г., twitter.com/JominiW/status/1508276407381762052

18 Напрыклад, Ukraine Weapons Tracker, твіт ад 7 красавіка 2022 г., twitter.com/UAWeapons/status/1512060297607065602

19 Clark, Mason, et al. “Russian Offensive Campaign Assessment, March 16,” Інстытут вывучэння вайны, 16 сакавіка 2022 г., understandingwar.org/backgrounder/russian-offensive-campaign-assessment-march-16.

20 Прысутнасць 150 мсд у Марыупалі зрабілася відавочнай, калі з’явілася паведамленне пра смерць яе камандзіра генерал-маёра Алега Міцяева. BBC, “War in Ukraine: Fourth Russian general killed – Zelensky,” 16 сакавіка 2022 г., bbc.com/news/world-europe-60767664

21 Airforce Technology, “Orlan-10 Unmanned Aerial Vehicle (UAV), 15 сакавіка 2021 г., airforce-technology.com/projects/orlan-10-unmanned-aerial-vehicle-uav/

# 2. ЖЫЦЦЁ Ў ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ ДА НАПАДУ

Падчас вайны Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр зрабіўся прытулкам для цывільных асобаў, якія ўцякалі ад гвалту ў іншых частках горада, цэнтрам для размеркавання ежы, вады і крытычна важнай інфармацыі пра адчайна чаканыя калідоры эвакуацыі, а таксама вызначаным пунктам збору для меркаваных эвакуацый[22]. Многія людзі ўцякалі ў тэатр пехатой. Іншых эвакуявалі на машынах, якімі кіравалі валанцёры ці вайскоўцы, паліцыянты ці служба па надзвычайных сітуацыях. Большасць людзей, якія хаваліся ў тэатры, былі дзецьмі, жанчынамі ці старымі. З пачатку вайны да нападу на тэатр у ім жыло больш за тысячу чалавек.

З часам насельніцтва тэатра істотна вырасла. З пачатку вайны да 4 сакавіка тут хавалася каля ста чалавек. Гэтыя першыя прыбышы былі пераважна тагачаснымі ці колішнімі супрацоўнікамі тэатра і чальцамі іх сем'яў, а таксама людзьмі, якія ўцяклі ад гвалту на Левым беразе ў пачатку канфлікту. Яўгенія Забагонская, мастачка па святле, разам з дачкой і іншым супрацоўнікам тэатра былі першымі, хто прыбыў сюды[23]. Яе муж Сяргей Забагонскі, актор, прыбыў праз некалькі дзён. Яны зрабіліся неафіцыйнымі адміністратарамі тэатра[24].

Наталля Ганчарова, былая рэпетытарка сцэнічнага маўлення ў тэатры, яе муж, Валер, і іх дзеці ўцяклі ў тэатр у першыя дні вайны, бо жыць у іх кватэры зрабілася небяспечна. «Спачатку гэта былі пераважна калегі [і іх сем'і]… але з кожным днём людзей прыбывала ўсё больш», – сказала Наталля[25]. Анастасія Карпеева, 15-гадовая студэнтка і баксёрка-пачаткоўка, прыбыла ў тэатр разам са сваім братам 27 лютага: яны ўцяклі ад гвалту на Левым беразе[26]. Ігар Мацюшын,

22 Падрабязней пра жыццё ў драматычным тэатры да нападу гл.: Wall Street Journal, "Ukrainians Who Sheltered in the Mariupol Theatre Made it a Thriving Village: For nearly three weeks before the Russian bombing, residents escaped the onslaught by working together," 31 сакавіка 2022 г., wsj.com/articles/life-inside-the-mariupol-theater-before-the-russian-bombing-11648741948

23 Інтэрв'ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 20 чэрвеня 2022 г.

24 Інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 8 траўня 2022 г.

25 Інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй Ганчаровай, 22 красавіка 2022 г.

26 Інтэрв'ю Amnesty International з Анастасіяй Карпеевай, 19 красавіка 2022 г.

драматург і былы дырэктар па адміністрацыйнай частцы (які таксама працаваў паліцыянтам), яго жонка, Алена Мацюшына, доктарка, і іх дзіця прыбылі ў канцы лютага ці пачатку сакавіка[27].

Падчас першых трох тыдняў вайны многія з былых супрацоўнікаў тэатра і іншыя людзі, якія прыбылі ў тэатр у першыя дні вайны, каардынавалі нефармальную сетку валанцёраў, што аказвалі базавыя паслугі ўсім жыхарам тэатра (падрабязней гл. у блоку ніжэй: «Тэатр як гуманітарны цэнтр»).

5 сакавіка колькасць людзей, якія хаваліся ў тэатры, рэзка павялічылася. Напярэдадні ў горадзе разышлася навіна, быццам 5-га будзе адкрыты «афіцыйны» гуманітарны калідор, якім людзі змогуць пакінуць горад на аўтобусах ці ўласных аўтамабілях[28]. Інфармацыя распаўсюджвалася ў вуснай форме ці праз СМС-паведамленні. Людзям наказалі падысці да трох пунктаў збору ў горадзе, адным з якіх быў драматычны тэатр.

Раніцай 5 сакавіка ў тэатры сабралася мноства людзей, магчыма, некалькі тысячаў. Многія прыбылі на ўласных аўтамабілях, спадзеючыся далучыцца да аўтакалоны, іншыя прыйшлі пехатой, разлічваючы на месца ў эвакуацыйных аўтобусах. Ігар Наўка, які працаваў на металургічным камбінаце імя Ілліча, яго жонка і маці ўцяклі ў тэатр 5 сакавіка пасля таго, як вокны ў іх кватэры выбіла выбухам непадалёк. «Мы вырашылі, што бяспечней перабрацца ў драматычны тэатр», – сказаў Ігар Amnesty International[29]. Вікторыя Дубавіцкая і яе дзеці прыбылі ў тэатр 5 сакавіка. «Сябар пазваніў камусьці знаёмаму ў войску, які расказаў нам пра эвакуацыю. Сусед дапамог нам дабрацца да тэатра», – сказала яна[30]. Марыя Радыёнава, сацыяльная работніца, жыла ў кватэры са сваёй бабуляй, калі ёй сказалі, што тэатр будзе пунктам збору для эвакуацыйных аўтобусаў. «Паколькі ў мяне не было машыны, [эвакуацыйная калона] была маёй адзінай надзеяй... Бабуля ехаць адмовілася», – сказала яна[31].

Міхаіл Грабянецкі, кіроўца таксі, і Наталля Грабянецкая, аператарка на чыгуначным вакзале, жылі ў Валнавасе, горадзе пад Марыупалем зусім побач з тэрыторыяй, якую кантралявалі расіяне. «24 лютага нас абудзілі выбухі», – паведаміла Наталля Amnesty. Яны вырашылі пакінуць Валнаваху і адправіцца ў большы горад з маці Міхаіла. Яны знайшлі прытулак у кватэры свайго сына Яўгена на заходнім беразе. «Тры дні было адносна ціха, але пасля 28-га кожны дзень быў пеклам на зямлі», – сказала Наталля[32]. Кожную ноч яны хаваліся ў падвале будынка, у той час як навокал, у суседніх кварталах, разгараліся баі. 5 сакавіка паліцыя сказала ім ісці да тэатра, каб эвакуявацца. «Пасля таго, як яны сказалі нам [пра эвакуацыю], мы сабраліся за хвіліну... [пазней] суседзі сказалі,

27 Інтэрв'ю Amnesty International з Аленай Мацюшынай, 25 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Мацюшыным, 30 красавіка 2022 г.

28 Reuters, "Russian forces to open Mariupol humanitarian corrido for 5 hours," 5 сакавіка 2022 г., reuters.com/world/europe/russian-forces-open-mariupol-humanitarian-corridor-5-hours-2022-03-05

29 Інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Наўкам, 22 красавіка 2022 г.

30 Інтэрв'ю Amnesty International з Вікторыяй Дубавіцкай, 8 красавіка 2022 г.

31 Інтэрв'ю Amnesty International з Марыяй Радыёнавай, 7 красавіка 2022 г.

32 Інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй Грабянецкай і Яўгенам Грабянецкім, 16 красавіка 2022 г.

што нашу кватэру абстралялі з мінамётаў праз 30 хвілінаў пасля таго, як мы з'ехалі... З нашай машынай былі праблемы, яна зламалася, калі мы дабраліся да тэатра, таму мы не маглі адправіцца кудысьці яшчэ», – расказаў Яўген[33].

Праз некалькі гадзін пасля таго, як ля тэатра сабраўся вялікі натоўп, паліцыя і вайскоўцы абвясцілі, што эвакуацыі не будзе. З'явіліся звесткі, што дамовіцца наконт меркаваных бяспечных калідораў не ўдалося, і абодва бакі абвінавачвалі адзін аднаго ў парушэнні рэжыму спынення агню[34]. Таксама натоўпу паведамілі, што эвакуацыя чакаецца ў будучыні. Многія людзі, якія жылі побач, вярнуліся дадому; некалькі сотняў чалавек вырашылі застацца ў тэатры.

Кожны дзень пасля 5 сакавіка людзі чакалі ў самім тэатры або падыходзілі да яго ў спадзеве эвакуявацца ці здабыць інфармацыю пра эвакуацыю. Паколькі тэлекамунікацыйная сетка пераважна не функцыянавала, электронная сувязь зрабілася для большасці недасяжнай; інфармацыя распаўсюджвалася ў асноўным у вуснай форме ці праз лістоўкі, падрыхтаваныя валанцёрамі. Штодня познім ранкам да тэатра прыходзілі некалькі паліцыянтаў ці вайскоўцаў – звычайна адзін ці два чалавекі – і дзяліліся інфармацыяй.

Ігар Мароз, архітэктар, які жыў ля тэатра, расказаў Amnesty, што пасля 5 сакавіка падыходзіў да тэатра штодня, каб даведацца пра чаканую эвакуацыю. «Мы атрымалі звесткі пра гуманітарныя калідоры і аўтобусы Чырвонага Крыжа. Людзі – гарадская рада, паліцыя – прыходзілі туды і давалі інфармацыю. Мабільнай сувязі не было, таму тэатр быў нібыта інфармацыйным штабам», – сказаў ён[35]. Рыгор Галаўнёў, які жыў усяго ў некалькіх сотнях метраў ад тэатра, паведаміў Amnesty, што наведваўся туды амаль кожны дзень:

> **З 28 [лютага] мы штодня хадзілі [у тэатр] правяраць інфармацыю пра калідоры эвакуацыі. Я прыходзіў каля 8 ці 9 раніцы і заставаўся да 14 ці 15 гадзінаў... Мы заставаліся ў вестыбюлі. Я хадзіў з жонкай і дачкой, і там былі некаторыя нашы суседзі... Гэта было месца збору і зносінаў. Прыязджала паліцыя і дзялілася інфармацыяй. Гэты быў адзіны спосаб атрымаць інфармацыю. Там стаяла шмат машынаў. Людзі чакалі вестак пра эвакуацыю[36].**

З 5 да 14 сакавіка колькасць людзей, што жылі ў тэатры і наведваліся да яго, працягвала расці. Чым бліжэйшымі рабіліся баі ў горадзе, тым больш людзей з'яўлялася ў тэатры. Наталля Ткачэнка, 67-гадовая інжынерка на пенсіі, прыбыла ў тэатр 12 сакавіка. Яна расказала Amnesty International, што калі пачалася вайна, яна адмовілася пакінуць свой дом, але вырашыла ўцякаць пасля таго, як яе кватэра моцна пацярпела ў выніку баёў па суседстве:

---

33 Інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй Грабянецкай і Яўгенам Грабянецкім, 16 красавіка 2022 г.

34 Guardian, "Mariupol evacuation postponed as Russia accused of breaking ceasefire: Local authorities in Ukrainian city ask resident to return to shelter and wait for further information," 5 сакавіка 2022 г., theguardian.com/world/2022/mar/05/zelenskiy-lashes-out-at-nato-over-no-fly-zone-as-russian-attacks-intensify

35 Інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Марозам, 20 красавіка 2022 г.

36 Інтэрв'ю Amnesty International з Рыгорам Галаўнёвым, 10 красавіка 2022 г.



↑ *Валанцёры гатуюць ежу для людзей, якія хаваюцца ў тэатры, за некалькі дзён да нападу. © Яўгенія Забагонская*



↑ *Людзі, у тым ліку дзеці, хаваюцца ў пярэдняй частцы тэатра. © Ігар Мароз*

→ *Людзі, якія хаваюцца ў пярэдняй частцы тэатра. © Ігар Мароз*





↑ *Галоўны ўваход у драматычны тэатр 13 сакавіка 2022 г. Дзве вялікія аўтацыстэрны забяспечваюць пітной вадой. На зямлі вялікімі літарамі напісанае слова «ДЗЕЦІ». © Рыгор Галаўнёў*





↑ *Людзі ля тэатра ў раёне палявой кухні, якая абароненая драўлянымі паддонамі. © Ігар Мароз*

→ *Людзі, у тым ліку дзеці, якія хаваюцца ў падвале ля пярэдняй часткі тэатра. © Антон Гузь*

**Я не магла ўявіць, што пакіну свой дом. Гэта мой дом. Я тут усё жыццё... Па суседстве ішлі баі. У нас было мала ежы. Людзі казалі пра [эвакуацыйныя] калідоры. А пасля [11 сакавіка] быў вялікі выбух, які выбіў у маіх вокнах шыбы... Было вельмі холадна. Я ляжала ў ложку, і ён быў пакрыты шклом... Я пайшла на ноч да суседа, але батарэі [замерзлі і трэснулі]… Так што 12-га [сакавіка] я адправілася ў драматычны тэатр[37].**

Аказаўшыся ў тэатры, Наталля пазнаёмілася з Дзмітрыем Сіманенкам, псіхолагам, які таксама прыехаў 12 сакавіка разам з сябрам, уцёкшы ад гвалту ля іх кватэры. Наталля, Дзмітрый, яго сябар і яшчэ адна пара, Любоў Свірыдава і яе муж Анатоль, пасяліліся разам і спалі ў канцэртнай зале[38].

Многія людзі, што прыбылі ў тэатр пасля 5 сакавіка, былі эвакуяваныя вайскоўцамі, паліцыяй, службай па надзвычайных сітуацыях ці валанцёрамі з раёнаў горада, якія пацярпелі ад нападу. Amnesty апытала некалькіх чалавек, якіх эвакуявалі ў тэатр, а таксама старшага супрацоўніка ўкраінскай службы па надзвычайных сітуацыях, якія падзяліўся звесткамі пра 56 чалавек – у тым ліку 10 дзяцей, – эвакуяваных у тэатр 8 сакавіка[39]. 9 сакавіка быў здзейснены напад на Марыупальскі радзільны дом; некалькіх цяжарных жанчын і маладых маці эвакуявалі са шпіталя ў тэатр[40].

Amnesty апытала мужа і жонку, якіх вайскоўцы суправадзілі з Усходняга ў 23-ці мікрараён на Левым беразе[41]. Яны паведамілі Amnesty, што ўцяклі з дому, калі неўзабаве пасля пачатку вайны іх раён пацярпеў ад нападу; затым яны знайшлі прытулак у 23-м мікрараёне. 8 сакавіка баі ў раёне, куды яны ўцяклі, узмацніліся, і вайскоўцы пачалі эвакуяваць людзей. «[Вайскоўцы] сказалі нам уцякаць у бяспечнейшае месца... спачатку забіралі жанчын і дзяцей... Мы адправілі сваё дзіця і маю маці [у ваеннай машыне]… затым [праз дзве гадзіны] мы паехалі на сваім аўтамабілі за іншай ваеннай машынай», – паведаміў Amnesty муж. Ваенная калона, за якой яны рухаліся, даставіла іх у драматычны тэатр. Іх дзіця і яго бабулю ў тэатр не прывезлі. Сувязь з імі страцілася. Праз тры дні іх знайшлі ў іншым сховішчы і забралі ў тэатр[42].

Паколькі колькасць людзей у тэатры расла, зрабілася складаным знайсці для ўсіх бяспечнае месца для жыцця. Некаторыя часткі будынка, якія лічыліся самымі бяспечнымі, былі запоўненыя так шчыльна, што было цяжка засяліць туды кагосьці яшчэ. Меркавалася, што тоўстыя сталі і апорныя сцены забяспечваюць максімальную абарону. У прыватнасці, бяспечнымі былі прызнаныя наступныя зоны:

---

37 Інтэрв’ю Amnesty International з Наталляй Ткачэнка, 6 красавіка 2022 г.

38 Інтэрв’ю Amnesty International з Наталляй Ткачэнка, 6 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 4 красавіка 2022 г.

39 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 6 траўня 2022 г.

40 The Wall Street Journal, “Ukrainians Who Sheltered in the Mariupol Theatre Made it a Thriving Village: For nearly three weeks before the Russian bombing, residents escaped the onslaught by working together,” 31 сакавіка 2022 г., wsj.com/articles/life-inside-the-mariupol-theater-before-the-russian-bombing-11648741948

41 Мікрараён – запраектаваная жылая забудова.

42 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 7 траўня 2022 г.

- падвал пад пярэдняй часткай тэатра;
- прастора паміж галоўным уваходам у тэатр і сцяной канцэртнай залы, за выключэннем зоны непасрэдна пад вялікімі вокнамі;
- памяшканні і часткова падвал ля задняй часткі тэатра.

І наадварот, некаторыя зоны, у прыватнасці, сцэна і канцэртная зала, лічыліся найбольш уразлівымі ў выпадку нападу на тэатр. Гэта тлумачылася меркаванай тонкасцю даху і масіўнай жырандоллю над цэнтрам канцэртнай залы. Валанцёры схілялі людзей не заставацца ў гэтых зонах[43]. “Мы спрабавалі казаць людзям, каб яны не спалі пад вялікімі вокнамі [спераду тэатра]”, – сказала Яўгенія Забагонская[44]. Некалькі чалавек паведамілі Amnesty, што валанцёры казалі ім не заставацца ў канцэртнай зале[45]. «Валанцёры ад пачатку не хацелі, каб людзі знаходзіліся ў канцэртнай зале, бо гэта самае ўразлівае месца. Там была тонкая столь і жырандоль», – сказала Марыя Радыёнава[46]. «Мы забаранілі людзям заставацца на сцэне на ноч», – паведаміў Amnesty International Сяргей Забагонскі[47].

Тыя, у каго не было іншага варыянта, апроч як застацца ў канцэртнай зале, стараліся трымацца на балконах вакол залы, а не ў зоне перад сцэнай, дзе размяшчаліся крэслы. Яўген, Наталля і Міхаіл Грабянецкія былі сярод тых, хто хаваўся ў канцэртнай зале. «Мы засталіся ў канцэртнай зале [на балконе першага паверха збоку ад сцэны], бо ў падвале было поўна жанчын і дзяцей... Адказныя людзі заўжды турбаваліся, што жырандоль заб’е людзей», – паведаміў Яўген Amnesty[48].

---

43 Інтэрв’ю Amnesty International з Дзмітрыем Пласкіным, 21 чэрвеня 2022 г.

44 Інтэрв’ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 20 чэрвеня 2022 г.

45 Інтэрв’ю Amnesty International з Марыяй Радыёнавай, 7 April 2022; інтэрв’ю Amnesty International з Вікторыяй Дубавіцкай, 6 красавіка 2022 г.

46 Інтэрв’ю Amnesty International з Марыяй Радыёнавай, 7 красавіка 2022 г.

47 Інтэрв’ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 6 траўня 2022 г.

48 Інтэрв’ю Amnesty International з Наталляй Грабянецкай і Яўгенам Грабянецкім, 16 красавіка 2022 г.

# ТЭАТР ЯК ГУМАНІТАРНЫ ЦЭНТР

Амаль на тры тыдні Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр быў перапрафіляваны ў сховішча ад вайны. Валанцёры, некаторыя з якіх былі тагачаснымі ці колішнімі супрацоўнікамі тэатра, працавалі над тым, каб абараніць і паклапаціцца пра людзей, якія хаваліся ў тэатры, і, у меншай ступені, пра тых, хто хаваўся ў суседніх раёнах. Яны арганізавалі дастаўку медыцынскай дапамогі, ежы, вады і тавараў першай неабходнасці[49].

Рэчы першай неабходнасці, такія, як адзенне, коўдры і прадметы гігіены, дастаўляліся ў тэатр вайскоўцамі, паліцыяй і валанцёрамі, захоўваліся на «складзе» за кулісамі сцэны і адтуль жа размяркоўваліся. У будынку былі два невялікія генератары, размешчаныя на сцэне, якія нядоўга працавалі на працягу дня[50].

Лекі ў памяшканні ў задняй частцы тэатра выдавалі доктарка Алена Мацюшына і дзве медсястры. Валанцёры прывозілі лекі, сабраныя ў аптэках. Алена расказала Amnesty International пра тое, як гэта – аказваць медыцынскую дапамогу ў тэатры.

> **Даводзілася працаваць амаль кругласуткава. Без перапынку. На дварэ было ніжэй за нуль градусаў [па Цэльсію]. Людзі мерзлі. Усё яшчэ быў кавід. Яшчэ былі пнеўманія і бранхіт. У нас было шмат дзяцей, усяго некалькі месяцаў ад нараджэння. І было многа пажылых людзей...**
>
> **Я сутыкнулася з... многімі дзецьмі з высокай тэмпературай. У дзяцей была дыярэя і ваніты ад якасці вады і ежы. Было складана лячыць дзяцей да года – праз высокую тэмпературу і абязводжванне...**
>
> **І было шмат людзей сярэдняга і пажылога ўзросту, у якіх былі цяжкія псіхалагічныя рэакцыі. У людзей былі панічныя атакі і іншыя псіхалагічныя расстройствы... у нас былі лекі для лячэння панічных атакаў... іншая група была абязводжаная і з паніжаным ціскам... Да таго, як [расійскія войскі] зруйнавалі хірургічнае аддзяленне ў абласным шпіталі №2, мы маглі кагосьці эвакуяваць [у шпіталь][51].**

Валанцёры не толькі аказвалі медыцынскую дапамогу, але і прыглядалі за дзецьмі ў тэатры, многія з якіх бавілі ўнутры цэлы дзень. «Я валанцёрыла. Я шмат часу працавала з дзецьмі», – расказала Amnesty International Анастасія Карпеева[52].

49 Падрабязней пра жыццё ў драматычным тэатры да нападу гл.: Wall Street Journal, “Ukrainians Who Sheltered in the Mariupol Theatre Made it a Thriving Village: For nearly three weeks before the Russian bombing, residents escaped the onslaught by working together,” 31 сакавіка 2022 г., wsj.com/articles/life-inside-the-mariupol-theater-before-the-russian-bombing-11648741948

50 Інтэрв’ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 8 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае).

51 Інтэрв’ю Amnesty International з Аленай Мацюшынай, 25 красавіка 2022 г.

52 Інтэрв’ю Amnesty International з Анастасіяй Карпеевай, 19 красавіка 2022 г.

Валанцёры таксама займаліся тым, што дапамагалі абараніць людзей, якія хаваліся ў тэатры. Яны не толькі накіроўвалі людзей у самыя бяспечныя месцы, але і дапамагалі забіць дошкамі вокны і дзяжурылі ноччу, спрабуючы не даць людзям зайсці ці выйсці пасля камендантскай гадзіны[53]. «Людзі пазменна дзяжурылі ля дзвярэй, сачылі, каб ніхто не сыходзіў [пасля камендантскай гадзіны] і супакойвалі людзей уночы», – расказаў Amnesty Ігар Наўка[54].

Насосныя станцыі ў Марыупалі – электрычныя. З 3 сакавіка, калі перастала функцыянаваць электрасетка, насельніцтва больш не мела доступу да вадаправоднай вады. Людзі па ўсім горадзе адпраўляліся – часта з вялікай рызыкай – да ручаёў і іншых прыродных крыніцаў вады. Гарадскі водаканал і прыватныя водныя кампаніі развозілі пітную ваду па розных раёнах у вялікіх цыстэрнах на грузавіках. Адным з такіх месцаў быў тэатр – кожны дзень да яго ўвахода прыязджаў грузавік (ці два), і людзям з тэатра і яго ваколіц выдавалі порцыю чыстай пітной вады. Вада для мыцця і кіпячэння была таксама дасяжная ў двух найбліжэйшых рэзервуарах, дзе яна захоўвалася для службы па надзвычайных сітуацыях.

Таксама валанцёры збіралі дрэва на паліва і гатавалі ежу для людзей, якія жылі ў тэатры. Жыхарам тэатра двойчы на дзень, ранкам і вечарам, выдавалі кіпень і раз на дзень – ежу, прыкладна апоўдні. Валанцёры стараліся вылучыць дадатковае харчаванне для дзяцей. Прадукты ў тэатр перыядычна прывозілі паліцыя, вайскоўцы і валанцёры. Ежу гатавалі звонку, але раздавалі ўнутры

Большую частку ежы, аднак, гатавалі на «палявой кухні», якая прылягала да тэатра. Ігар Мацюшын, драматург і  былы дырэктар па адміністрацыйнай частцы, які таксама служыў у паліцыі, расказаў Amnesty, што гаварыў са сваім начальнікам у паліцыі, каб дамовіцца пра дастаўку палявой кухні – і вайскоўцы прывезлі яе[55]. Некаторыя жыхары тэатра таксама гатавалі ежу на адкрытым агні ля палявой кухні. «Паміж 8 і 9 гадзінамі раніцы ўсім раздавалі гарачую ваду... Прыкладна апоўдні нас кармілі супам... Каля 16 гадзін [мы атрымлівалі перакус]… каля 17 ці 18 быў яшчэ кіпень... Валанцёры ўвесь час працавалі над тым, каб быў кіпень», – сказаў Дзмітрый Сіманенка[56].

53 Інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 2 траўня 2022 г.

54 Інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Наўкам, 22 красавіка 2022 г.

55 Інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Мацюшыным, 30 красавіка 2022 г.

56 Інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 6 красавіка 2022 г.

14 сакавіка колькасць людзей, якія хаваліся ў тэатры, крыху зменшылася. 15 сакавіка іх колькасць зменшылася кардынальна. А раніцай 16 сакавіка, за некалькі гадзінаў да нападу, яна зменшылася яшчэ больш.

Гэта тлумачылася частковым поспехам арганізацыі «неафіцыйных» гуманітарных калонаў. 14 сакавіка, калі гуманітарная сітуацыя пагоршылася і баі ахапілі большую частку горада бліжэй да тэатра, «неафіцыйнай» калоне аўтамабіляў удалося эвакуявацца з горада[57]. Многія з іх ад’язджалі ад тэатра. Паведамляецца, што гэта была першая буйная эвакуацыя пасля таго, як горад трапіў у аблогу. Хутка разышліся навіны пра тое, што прынамсі некалькі машын, якія паспрабавалі пакінуць горад, паспяхова дабраліся да падкантрольный Расіі тэрыторыі ці праехалі праз яе да тэрыторыі ля Запарожжа, што ўтрымлівалася Украінай. На наступны дзень, 15 сакавіка, сотні аўтамабіляў – і тысячы чалавек – гэткім жа чынам пакінулі горад[58]. Многія з гэтых аўтамабіляў ад’язджалі ад тэатра. Сотні людзей, што жылі ў тэатры, эвакуяваліся, на стаянцы ля тэатра не засталося большай часткі машын. Служба па надзвычайных сітуацыях таксама рассылала паведамленні, раячы маршруты, якімі трэба пакінуць горад.

Весткі пра тое, што эвакуацыя магчымая, пачалі цыркуляваць сярод насельнікаў тэатра і па ўсім горадзе, таму людзі адчулі, што з’язджаць трэба як мага хутчэй, бо месца баявых дзеянняў змянілася. За некалькі дзён да нападу на тэатр тэрыторыя горада, якую кантралявалі ўкраінцы, зменшылася, а гвалт і разбурэнні набліжаліся да гарадскога цэнтра, дзе знаходзіўся драматычны тэатр. Людзі ў тэатры паведамлялі, што чулі стральбу ў ноч 14 сакавіка. «У ноч 14-га было чуваць артылерыю... Потым [15 сакавіка] з’ехала 100-200 машын – 95% [тых, якія стаялі перад тэатрам]. Людзі панікавалі. Некаторыя кіроўцы прапаноўвалі вольныя месцы ў машынах. Іншыя бралі 6000 грыўняў. Мы вырашылі не сыходзіць, бо не было зразумела, куды ісці. Мы баяліся, што давядзецца начаваць на холадзе», – сказаў Amnesty Дзмітрый Сіманенка[59].

За некалькі дзён да нападу на тэатр у раёне побач было як мінімум два невялікія ўдары з паветра. Незразумела, ці былі месцы гэтых удараў спецыяльна абраныя ў якасці цэлі або здарыўся промах. Пра смяротныя выпадкі паведамленняў не было, аднак у выніку аднаго з удараў некалькі чалавек атрымалі раненні. Паведамляецца, што праз гэтыя ўдары людзі пачалі баяцца хавацца ў тэатры. Першы ўдар адбыўся за некалькі дзён да нападу на тэатр – ён прыйшоўся на сасну ля палявой кухні. Некалькі чалавек атрымалі раненні[60]. Адзін з выжылых у нападзе 16 сакавіка гатаваў на палявой кухні ежу, калі ў сасну трапіў удар. «Я лічу сябе шчаслівчыкам: шрапнель была блізка...

57 Al Jazeera, “First convoy of civilians escapes besieged Mariupol: More than 160 private cars manage to leave the Ukrainian city, the first evacuation in two weeks of Russian bombardment,” 14 сакавіка 2022 г., aljazeera.com/news/2022/3/14/ukraine-russia-war-mariupol-evacuation-convoy

58 BBC News, “Mariupol theatre: ‘We knew something terrible would happen’,” 17 сакавіка 2022 г., bbc.com/news/world-europe-60776929

59 Інтэрв’ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 6 красавіка 2022 г.

60 Інтэрв’ю Amnesty International з Анастасіяй Карпеевай, 19 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 28 красавіка 2022 г.

Пасля гэтага выбуху многія спалохаліся. І яны пачалі з’язджаць на сваіх машынах... Думаю, калі б не гэты удар [па палявой кухні], пацярпела б больш людзей [ва ўдары па тэатры 16 сакавіка], бо паліцыя гарантавала, што [драматычны тэатр – самае бяспечнае месца]», – сказаў ён[61].

Пасля ўдару, які прыйшоўся на дрэва, валанцёры забілі рэшту вокнаў у тэатры. Другі суседні ўдар адбыўся каля 2 гадзінаў ночы 16 сакавіка. Некалькі чалавек у тэатры прыгадалі вельмі гучны выбух ля суседняга скрыжавання вуліц Міру і Нільсена. У выніку ў тэатры вылецела некалькі вокнаў[62]. «Уночы, паміж 2 і 3 гадзінамі, мы пачулі моцны выбух. Ён выбіў некалькі вокнаў. Жырандоль у канцэртнай зале шалёна гайдалася», – расказаў Amnesty Дзмітрый Сіманенка[63]. Было чуваць, як шкло падала між дошкамі [якімі былі закладзеныя вокны], – паведаміла Amnesty International Вікторыя Дубавіцкая[64].

Напад у ноч 15-га, няспынны гвалт і разуменне, што эвакуацыя магчымая, схілілі многіх людзей раніцай 16 сакавіка да ад’езду. Андрэй Грышын, 19-гадовы студэнт, які вучыўся на актора, пераехаў у тэатр са студэнцкага інтэрната 5 сакавіка, а пасля 15 сакавіка вырашыў з’ехаць. «Хадзілі чуткі, што лінія фронту насоўваецца на гарадскі цэнтр, і ў нас была магчымасць сысці берагам мора», – сказаў ён Amnesty International[65]. Іншы мужчына, які з’ехаў з тэатра 15 сакавіка з чатырма іншымі людзьмі, таксама сказаў, што зрабіў гэта праз няспынны гвалт. «14-га процьма [людзей] пачала пакідаць гарадскі цэнтр праз пажары і пастаянныя абстрэлы... мы адчувалі, што будзе горш… Я сеў у машыну [з іншымі людзьмі з тэатра], і мы самі арганізаваліся ў калону да Мялекіна»[66].

Amnesty International пагаварыла з іншымі людзьмі, якія спрабавалі эвакуявацца, але не змаглі. «Мы ўбачылі машыну з двума пажылымі людзьмі. Спыталі іх, ці возьмуць яны нас. Яны адмовіліся. Сказалі, што ззаду ў іх агародніна. [Мы раззлаваліся]», – сказаў адзін з выжылых[67]. Многія людзі эвакуяваліся [перад нападам]; на жаль, ніхто не пагадзіўся ўзяць нас», – рассказала Amnesty International Вікторыя Дубавіцкая[68].

Гвалт у горадзе як прыцягваў людзей у тэатр, так і выштурхоўваў іх адтуль. Пакуль адны эвакуяваліся з тэатра, іншыя уцякалі з розных частак горада ў гарадскі цэнтр і драматычны тэатр, шукаючы тут абароны і магчымасці з’ехаць далей. «Я прыйшоў у драматычны тэатр 15 сакавіка... Я прыйшоў у драматычны тэатр, бо чуў, што там ёсць [мабільная] сувязь, але яе не было. Я не мог

61 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 28 красавіка 2022 г.

62 Інтэрв’ю Amnesty International з Вікторыяй Дубавіцкай, 8 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.

63 Інтэрв’ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 6 красавіка 2022 г.

64 Інтэрв’ю Amnesty International з Вікторыяй Дубавіцкай, 8 красавіка 2022 г.

65 Інтэрв’ю Amnesty International з Андрэем Грышыным, 5 траўня 2022 г.

66 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 17 красавіка 2022 г.

67 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 5 красавіка 2022 г.

68 Інтэрв’ю Amnesty International з Вікторыяй Дубавіцкай, 8 красавіка 2022 г.

вярнуцца [туды, дзе хаваўся] праз абстрэлы, таму пайшоў у тэатр»[69]. Марыя Кутнякова, яе маці, Галіна, яе сястра, а таксама іх суседзі Лілія і Аляксей Міхайлюкі і іх дачка прыбылі ў тэатр раніцай 16 сакавіка[70]. Баі зачапілі будынак, дзе яны жылі, і ў выніку нападу ў папярэднія дні двое іх суседзяў былі забітыя. Марыі ўдалося атрымаць вестку ад бацькі, што яны эвакуююць людзей з тэатра, таму раніцай у дзень нападу яны вырашылі туды адправіцца[71].

Паведамляецца, што агулам 15 сакавіка і раніцай 16 сакавіка з тэатра з'ехала на сотні чалавек больш, чым прыбыла туды. Антон Гузь, аспірант, які з 5 сакавіка хаваўся ў падвале тэатра разам з маці і сястрой, раніцай 16 сакавіка, незадоўга да нападу, вырашыў сысці адтуль пехатой. Amnesty International атрымала ад яго здымкі тэатра да нападу, у тым ліку тыя, на якіх над тэатрам здалёк відаць воблака дыму і пылу – наступствы выбуху[72].

У выніку адыходу людзей з тэатра вызвалілася месца ў яго некаторых частках, якія лічыліся найбольш бяспечнымі. Таму многія людзі, якія хаваліся ў тэатры, 15 і 16 сакавіка перабраліся туды. «Калі мы прыехалі, то спыніліся на другім паверсе, побач з самым правым з трох вялізных вокнаў [у пярэдняй частцы тэатра], каля сходаў. Потым 15-га людзі сышлі. Я шукаў больш бяспечнае месца, таму перабраўся на першы паверх бліжэй да галоўнага ўвахода», – расказаў Amnesty International мужчына, які жыў і валанцёрыў у тэатры разам з жонкай і дзецьмі[73]. Сям'я, якую вайскоўцы эвакуявалі з 23-га мікрараёна, 15 сакавіка таксама перасялілася. «Мы сем дзён заставаліся на трэцім паверсе... Наш сябар [які жыў у падвале спераду тэатра] з'ехаў у Мялекіна [15 сакавіка]. Ён прапанаваў нам перабрацца ў падвал. Мы заставаліся там адну ноч», – сказаў муж[74].

Удар, магчыма, забраў менш жыццяў, бо ў дзень нападу ў тэатры было нашмат менш чалавек, чым раней, і праз няспынны гвалт і здзейсненыя паблізу нядаўнія напады людзі былі менш схільныя, чым звычайна, выбірацца вонкі. І, што самае важнае, у тэатры засталося менш людзей, таму большасць з іх магла перамясціцца ў тыя часткі будынка, якія лічыліся бяспечнейшымі.

69 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 6 красавіка 2022 г.

70 Інтэрв'ю Amnesty International з Марыяй Кутняковай, 30 сакавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Галінай Кутняковай, 1 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Ліліяй Міхайлюк і Аляксеем Міхайлюком, 10 красавіка 2022 г.

71 Інтэрв'ю Amnesty International з Марыяй Кутняковай, 30 сакавіка 2022 г.; гл. таксама: CNN, "The thought they would be safe in the theatre. Then it was bombed," 21 сакавіка 2022 г., cnn.com/2022/03/21/europe/mariupol-theater-survivors-escape-ukraine-cmd-intl/index.html

72 Інтэрв'ю Amnesty International з Антонам Гузем, 23 сакавіка 2022 г.

73 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 19 красавіка 2022 г.

74 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 7 траўня 2022 г.

# УКРАІНСКАЯ ВАЕННАЯ ПРЫСУТНАСЦЬ ПЕРАД НАПАДАМ І ПАДЧАС ЯГО

Данецкі акадэмічны драматычны тэатр не быў сапраўднай ваеннай цэллю. У час нападу або на працягу некалькіх дзён да яго ў тэатры ці побач з ім не было значнай ваеннай прысутнасці. Нішто ў характары, размяшчэнні, прызначэнні ці выкарыстанні будынка не давала любому з бакоў канфлікту падставы меркаваць, што тэатр з'яўляецца ваеннай цэллю.

Ніхто з 28 выжылых у нападзе, апытаных Amnesty International, і ніхто з іншых сведкаў, што знаходзіліся ў тэатры ці каля яго ў дзень нападу, не падаў Amnesty ніякай інфармацыі, якая ўказвала б на тое, што ўкраінскія вайскоўцы выкарыстоўвалі тэатр як аператыўную базу, месца для захавання зброі ці пачатку наступаў.

Гэтыя паказанні пацвярджаюцца спадарожнікавымі здымкамі, зробленымі праз некалькі хвілінаў пасля нападу, на якіх не відаць значнай ваеннай прысутнасці вакол тэатра. (Гл. спадарожнікавыя здымкі на ст. 31.) Паказанні таксама адпавядаюць фотаздымкам, якія атрымала Amnesty International ці якія былі размешчаныя ў сацыяльных сетках і правераныя Amnesty International, – на іх відаць, як за некалькі дзён да нападу цывільныя асобы свабодна перамяшчаюцца вакол тэатра і жывуць у ім. Ні на адным з фотаздымкаў ці відэа не відаць ваеннай прысутнасці ў тэатры ці вакол яго.

Вельмі нямногія вайскоўцы калі-небудзь знаходзілася ў тэатры ці побач з ім. Паводле сведкаў, за некалькі дзён да нападу ля тэатра ненадоўга з'яўлялася зусім невялікая колькасць салдатаў – звычайна адзін ці два; у асноўным яны дастаўлялі ежу, высаджвалі эвакуяваных з іншых частак горада ці распаўсюджвалі інфармацыю.

Таксама туды рэгулярна прыязджалі салдаты на ваенных ці цывільных машынах, каб даставіць ежу і тавары першай неабходнасці[75]. «Амаль кожны дзень прыязджалі паліцыянты ці вайскоўцы і раздавалі коўдры, паліто ці прадукты харчавання, – сказаў адзін са сведкаў. – Яны прыходзілі на 10-15 хвілінаў. Гэта быў адзін ваенны джып з двума ці трыма людзьмі»[76]. Вайскоўцы часта пакідалі ежу і іншыя рэчы звонку або часам ненадоўга заходзілі ў сярэдзіну. Вайскоўцы таксама забяспечвалі інфраструктуру для палявой кухні, дзе гатавалі ежу жыхары сховішча[77].

75 Інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Мацюшыным, 30 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Наўкам, 22 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 19 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 20 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 27 красавіка 2022 г.

76 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 27 красавіка 2022 г.

77 Інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Мацюшыным, 30 красавіка 2022 г.

Адзін ці два вайскоўцы, часам разам з паліцыяй, штодня каля поўдня прыходзілі ў тэатр, каб паведаміць пра эвакуацыю, часта раздаючы лістоўкі[78].

Ваенны персанал (а таксама паліцыя, служба па надзвычайных сітуацыях і валанцёры) рэгулярна эвакуяваў цывільных з зонаў актыўных баёў і дастаўляў іх у тэатр. «Вайскоўцы прывозілі людзей з разбураных раёнаў... Іх машыны былі абмотаныя сінім скотчам... Яны высаджвалі людзей... Гэта былі жанчыны і дзеці»[79].

Паведамлялася, што некалькі салдатаў наведалі свае сем'і ў тэатры. Большасць сведкаў расказалі Amnesty International, што тыя вайскоўцы, якія прыязджалі, заставаліся ў тэатры ненадоўга і ніколі – на ноч. «Шчыра кажучы, яны заходзілі ў сярэдзіну, – сказаў адзін са сведкаў, – па адным салдаце на раз, каб знайсці сям'ю. Стральбы не было. Зброі нідзе не было»[80]. Адна сведка, аднак, паведаміла следчым, што за некалькі начэй да нападу яна бачыла чатырох вайскоўцаў, якія спалі ў тэатры, іншая сказала, што чула, быццам некалькі вайскоўцаў елі ў тэатры за адзін вечар да нападу, але сама яна іх не бачыла[81].

Адзін ці два разы ў тэатр прыязджалі вайскоўцы і прасілі дазволу скарыстаць аўтамабілі цывільных. Калі гэта здарылася, ім адмовілі, і яны з'ехалі[82]. «Яны прыйшлі, [мая жонка] Яўгенія сказала ім, [што яны не могуць узяць машыну], і яны з'ехалі», – сказаў Amnesty International Сяргей.

У пачатку сакавіка два чальцы палка «Азоў» былі ў тэатры і здымалі відэа. Пазней, 10 сакавіка, полк «Азоў» апублікаваў відэа, размясціўшы яго ў інтэрнэце. На ім відаць, што цывільныя хаваюцца на розных паверхах тэатра[83]. На відэа Сяргей Забагонскі паказвае тэатр чальцам палка «Азоў». На відэа цёмна, людзі выкарыстоўваюць ліхтарыкі, што сведчыць пра адсутнасць электрычнасці. Затым здымачная група «Азова» пакідае будынак, каб апытаць цывільных звонку, дзе яны гатуюць ежу і набіраюць вады. Хаця відэа наўпрост указвае на тое, што чальцы «Азова» мелі доступ у тэатр, адзіныя салдаты «Азова», якія на ім з'яўляюцца, – гэта жменя чальцоў самой здымачнай групы (і чалавек, які здымаў відэа). Некалькі чалавек расказалі Amnesty, што бачылі, як рабілася відэа.

Апытаныя паведамлялі, што за некалькі дзён да нападу бачылі ваенныя машыны, якія ехалі ля тэатра, ці чулі пра іх і пра салдатаў, якія стралялі з суседніх будынкаў ці побач з імі, аднак

78 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 19 красавіка 2022 г.

79 Інтэрв'ю Amnesty International з Алегам Карыным, 3 красавіка 2022 г.

80 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 19 красавіка 2022; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 25 красавіка 2022 г.

81 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 7 April 2022; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 22 красавіка 2022 г.

82 Інтэрв'ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 2 траўня 2022 г.

83 Azov Media, 10 сакавіка 2020 г., youtu.be/Lg3JYn2JukA

усе гэтыя будынкі былі на іншым баку дарогі, якая атачае парк вакол тэатра[84]. У дзень нападу у раёне гарадскога цэнтра вяліся баі – некалькі чалавек казалі, што чулі стральбу здалёк, але вакол тэатра баёў не было. Чатыры чалавекі сказалі, што ім паведамілі (магчыма, адна і тая ж асоба), быццам раніцай у дзень нападу ўкраінскія вайскоўцы знаходзіліся ў цэнтры Тарута – групе будынкаў у 100-200 м ад тэатра, – але ніякіх салдатаў ніхто не бачыў[85]. «[Пасля таго, як мы пачулі, што побач могуць быць салдаты] мы забарыкадавалі некаторыя з дзвярэй на выпадак, калі да нас дойдзе вайна, але перад нападам салдаты да тэатра не падыходзілі», – сказала Amnesty International Яўгенія Забагонская[86].

84 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 24 сакавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 19 красавіка 2022 г.

85 Інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 2 траўня 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Пласкіным, 21 чэрвеня 2021 г; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 2 траўня 2022 г.; цэнтр Тарута называюць таксама цэнтрам «Азоў Інтэкс»; на спадарожнікавых здымках, якія захоўвае Amnesty International, відаць дым у раёне цэнтра Тарута 19 сакавіка 2022 г.

86 Інтэрв'ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 2 траўня 2022 г.

# 3. НАПАД

Напад на Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр адбыўся 16 сакавіка 2022 г. неўзабаве пасля 10:00. Падчас нападу ў тэатры ці вакол яго былі сотні цывільных асобаў. Тэатр выразна ўспрымаўся як цывільны аб’ект, магчыма, нават у большай ступені, чым любое іншае месца ў горадзе. У будынку ці побач з ім не было значнай ваеннай прысутнасці.

Напад, хутчэй за ўсё, быў здзейснены расійскім знішчальнікам з выкарыстаннем дзвюх 500-кілаграмовых бомбаў, якія адначасова ўзарваліся побач адна з з адной. Верагодна, але менш імаверна, што выкарыстоўвалася толькі адна бомба. Таксама верагодна, хаця і нашмат менш імаверна, што выкарыстоўваліся адна ці дзве расійскія крылатыя ракеты.

Вывучэнне спадарожнікавых здымкаў, а таксама фотаздымкаў і відэазапісаў, зробленых пасля ўдару, паказвае, што боепрыпасы выбуховага дзеяння прабілі дах ва ўсходняй частцы тэатра і ўзарваліся ў памяшканні для выступаў, хутчэй за ўсё, на ўзроўні сцэны. Наколькі можна меркаваць з паказанняў адной асобы, што прайшла калідорам пад сцэнай пасля выбуху (гл. ніжэй), боепрыпасы, верагодна, узарваліся на паверхні крохкай платформы сцэны, а не трапілі ў самы нізкі ўзровень тэатра. Такі эфект можа выклікаць галаўны ўзрывальнік, наладжаны на ўдар ці на ўдар з невялікай затрымкай[87].

Калі боепрыпасы выбухнулі, то разбурылі прылеглыя ўнутраныя сцены, якія абрамоўвалі кулісы сцэны і затым прабілі вонкавыя апорныя сцены, утварыўшы два асноўныя палі абломкаў на паўночна-ўсходнім і паўднёва-заходнім баках будынка. Абодва палі абломкаў відаць на спадарожнікавых здымках, зробленых праз некалькі хвілінаў пасля ўдару (гл. спадарожнікавыя здымкі на ст. 31). Пашкоджанне гэтых вонкавых сценаў, якое не распаўсюдзілася цалкам на аснову сцяны і не ўтварыла варонку ў фундаменце, адпавядае версіі, паводле якой боепрыпасы ўзарваліся на ўзроўні сцэны, а не пад зямлёй. Да таго ж, большае поле абломкаў на паўднёва-заходнім баку будынка ў параўнанні з полем на паўночна-ўсходнім баку ўказвае на тое, што боепрыпасы не трапілі сіметрычна ці дакладна ў цэнтр сцэны.

87 Напрыклад, расійскія ўзрывальнікі серыі АВУ, якія часта выкарыстоўваюцца ў бомбах ФАБ і ОФАБ, маюць настройкі затрымкі імгненнага дзеяння: кароткая затрымка (0.025 секундаў) і сярэдняя затрымка (0.075 секундаў), гл. «Калектыўная інфармаванасць пра боепрыпасы, якія не разарваліся» (CAT-UXO), “Узрывальнік АВУ-ЭТ”, cat-uxo.com/explosive-hazards/fuzes/avu-et-fuze

Як відаць на фотаздымках, зробленых сведкамі адразу ж пасля выбуху, асноўная частка насцілу даху абвалілася на паўночна-ўсходні бок будынка. Асноўная надбудова даху разбурылася і затым абрынулася на сцэну, накрыўшы месца, дзе адбыўся выбух[88].

Amnesty International замовіла два незалежныя вонкавыя аналізы інцыдэнту з выкарыстаннем розных метадаў і тыпаў доказаў, каб ацаніць выбуховую сілу боепрыпасаў, якія, імаверна, выкарыстоўваліся ў нападзе.

Першы аналіз прадугледжваў пабудову матэматычнай мадэлі выбуху – з выкарыстаннем стандартных спадарожнікавых здымкаў, зробленых да інцыдэнту і пасля яго, фотаздымкаў і відэа з тэатра адразу пасля ўдару і праектныя планы тэатра, – каб ацаніць чыстую масу выбуховага рэчыва, патрэбную для таго, каб выклікаць назіраныя разбурэнні[89]. Мадэль эксперта, у якой выкарыстаны аналіз крывой Джарэта, метад, які звычайна прымяняецца на этапе пасля выбуху, паказала, што «мінімальная магутнасць выбуху вагаецца прыкладна ад 400 да 800 кг у тратылавым эквіваленце»[90].

У другім аналізе выкарыстоўваліся дадзеныя радара з сінтэзаванай апертурай (РСА) з парогавым каэфіцыентам адлюстравання да і пасля нападу, каб нанесці на карту поле абломкаў выбуху з дапушчэннем, што моцныя адбівальнікі ў межах 25 м ад тэатра, якія ёсць у дадзеных пасля нападу і якіх няма да яго, адпавядаюць фрагментам узарванага будынка[91]. Радыяльнае картаванне поля абломкаў выкарыстоўвалася для лакалізацыі цэнтра выбуху і аналізу траекторыі выкіду абломкаў. Дынамічная мадэль руху абломкаў для групы выкіду выкарыстоўвалася для ацэнкі энергіі выбуху, неабходнай для тлумачэння пачатковых хуткасцяў выкіду з улікам атмасфернага супраціву. Важна згадаць, што вызначанае колькасна поле абломкаў мадэлявалася адносна зыходнай, давыбуховай геаметрыі будынка тэатра (напрыклад, размяшчэння вонкавых сценаў) без любых дапушчэнняў наконт анізатрапіі і трываласці будаўнічых матэрыялаў. Гэты аналіз ацэньвае тратылавы эквівалент выбуху як мінімум у 440 кг і яго імаверны дыяпазон – у 600-1200 кг[92].

Абодва аналітычныя метады, якія выкарыстоўваюць незалежныя дадзеныя, указваюць на агульную згоду адносна меркаванай выбуховай магутнасці прыменeных боепрыпасаў.

88 Падземныя выбухі ўтвараюць вялікія варонкі, але нават вялікая колькасць выбуховых рэчываў, якія ўзрываюцца на ўзроўні паверхні ці вышэй, утварае зусім маленькія варонкі ці ўвогуле іх не ўтварае. Статут палявой службы 3-34.214 (FM 5-250), "Выбухі і разбурэнне", ліпень 2007 г., info.publicintelligence.net/USArmy-Explosives.pdf

89 "Memo: Investigating the Mariupol Drama Theatre Bombing," Dr. F. Dalnoki-Veress, CNS/MIIS, 9 траўня 2022 г., дасяжная тут: oneamnesty.sharepoint.com/sites/app-secretariatopensend/_layouts/15/guestaccess.aspx?docid=090c6a9dba4114d5d84c30ba95e15d9f1&authkey=AawCljSCxpBcuXAtfOolx_g&e=M1YvE3

90 Аналіз крывой Джарэта – эмпірычны метад, які звязвае назіраныя пашкоджанні з магутнасцю выбуху з улікам адлегласці ад месца выбуху да канструкцый, стану гэтых канструкцый, а таксама асноўных матэрыялаў, з якіх яны ўзведзеныя, і будаўнічых тэхналогій.

91 Найбліжэйшы да даты нападу на марыупальскі гарадскі тэатр набор дадзеных РСА быў атрыманы праз 2 дні пасля расследаванага выбуху. Ёсць паведамленні пра артылерыйскія выбухі побач з тэатрам у прамежкавы перыяд, якія маглі прывесці да невялікага парушэння абстаноўкі да збору дадзеных РСА. Аднак малаверагодна, што нейкае парушэнне істотна змяніла б ацэнку выбуху з выкарыстаннем аналізу РСА, бо ён факусаваўся на мностве буйных абломкаў, адкінутых ад тэатра як мінімум на 10 м, на што наўрад ці паўплываў бы выбух, выкліканы выкарыстаннем лягчэйшай зброі, такой, як рэактыўная артылерыя.

92 "Папярэдняя справаздача РСА", праф. Манучэхр Шырзаі, ад'юнкт-прафесар гефізікі і дыстанцыйнага зандавання, Тэхналагічны інстытут Вірджыніі, дасяжны на: oneamnesty.sharepoint.com/sites/app-secretariatopensend/_layouts/15/guestaccess.aspx?docid=090c6a9dba4114d5d84c30ba95e15d9f1&authkey=AawCljSCxpBcuXAtfOolx_g&e=PI0eml




↑ *На спадарожнікавым здымку ад 14 сакавіка 2022 г. відаць драматычны тэатр у Марыупалі, Украіна. Сцэна размешчаная з ўсходняга боку будынка. На здымку відаць шмат аўтамабіляў і палявая кухня. На зямлі вялікімі літарамі напісанае слова «ДЗЕЦІ».*
*Здымак: 14 сакавіка 2022 г., 47.0960º, 37.5487º © 2022 CNES/Airbus*







*Два спадарожнікавыя здымкі ад 16 сакавіка паказваюць тэатр да і пасля нападу. У 10:02 па ўсходнееўрапейскім часе на здымку з разрозненнем 3 м відаць, што дах не пашкоджаны; аўтамабіляў на стаянцы больш не бачна. У 10:20 па ўсходнееўрапейскім часе на здымку з разрозненнем 60 см відаць, што дах над сцэнай разбураны; на поўнач і на поўдзень ад сцэны бачныя палі абломкаў. Аўтамабіляў на стаянцы не бачна.*

*↑↑ 16 сакавіка 2022 г. – 1002 EET, 47.0960º, 37.5487º © 2022 Planet Inc*

*↑ 16 сакавіка 2022 г. – 1020 EET, 47.0960º, 37.5487º © 2022 CNES/Airbus*

# 3.1 НАЙБОЛЬШ ІМАВЕРНАЯ ВЫКАРЫСТАНАЯ ЗБРОЯ: СКІНУТЫЯ РАСІЙСКІЯ АВІЯБОМБЫ

Пашкоджанні, выкліканыя выбухам, характэрныя для ўзрыву дзвюх (але, імаверна, і адной) вялікіх авіябомбаў, скінутых адначасова, якія ўдарылі побач адна з адной у межах дасягальнасці цэлі. Для сведкаў, асабліва тых, што знаходзяцца за межамі будынку, адначасовы (ці амаль адначасовы) узрыў двух боепрыпасаў у ім будзе выглядаць і гучаць як адзін асобны выбух.

Шматлікія выжылыя і сведкі паведамлялі, што непасрэдна перад ударам чулі ў гэтым раёне самалёты. Адна сведка таксама паведаміла, што бачыла, як прыкладна ў час удару па тэатры авіяцыя бамбавала металургічны камбінат «Азоўсталь»[93].

Amnesty International апытала шэсць чалавек, якія бачылі драматычны тэатр здалёк непасрэдна перад выбухам або неўзабаве пасля яго. Два сведкі, якія назіралі за ўдарам з адлегласці прыкладна 50 м адзін ад аднаго, паведамілі, што бачылі, як дах падняўся ў паветра, калі адбыўся выбух. У час выбуху Ігар Мароз быў прыкладна ў 200-300 м ад тэатра. «Усё адбылося перад нашымі вачыма. Мы былі ў 200 ці 300 м адтуль, [калі] адбыўся выбух... Я не бачыў, [каб нешта ўдарыла ў будынак]… Я чуў гук самалёта і падзення бомбаў... Бомба [выдавала гук, падобны на] пранізлівы свіст... Потым мы ўбачылі, як дах [на тэатры] падняўся ўверх на 25, 30 метраў»[94]. Рыгор Галаўнёў быў таксама прыкладна ў 200 м ад тэатра ў час выбуху. Ён апісаў тое, што ўбачыў:

> **Я ішоў па вуліцы, якая вядзе да драматычнага тэатра... Я бачыў драматычны тэатр перад сабой... Ён быў прыкладна ў 200 м ад мяне... Я чуў шум самалёта... але ў той час насамрэч не надта звярнуў на яго ўвагу, бо [самалёты] лёталі пастаянна... Потым я ўбачыў, як дах будынка выбухнуў... Ён падскочыў на 20 м і затым абваліўся... і тады я ўбачыў шмат дыму і завалы... Я не верыў сваім вачам, бо тэатр быў святыняй. Там было два вялікія надпісы «дзеці»[95].**

Віталь Контараў, 48-гадовы кіроўца грузавіка, у момант нападу ішоў па ваду прыкладна ў 1 км ад тэатра. Ён расказаў Amnesty International пра тое, што ўбачыў: «Мы чулі самалёты... Я бачыў дзве ракеты, пушчаныя з аднаго самалёта ў бок тэатра». А затым ён убачыў дым, які ішоў з тэатра[96].

Найбольш імаверна, што расійскія самалёты, што ўдарылі па тэатры, – гэта мнагамэтавыя знішчальнікі, такія, як Су-25, Су-30 ці Су-34, якія базаваліся на найбліжэйшых расійскіх аэрадромах і часта дзейнічалі над поўднем Украіны[97]. Іншыя расійскія самалёты, здольныя несці ўзбраенне, якое, імаверна, прымяняліся для гэтага ўдару, такія, як вышынныя стратэгічныя бамбавальнікі,

93 Інтэрв'ю Amnesty International з Марыяй Кутняковай, 30 сакавіка 2022 г.

94 Інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Марозам, 20 красавіка 2022 г.

95 Інтэрв'ю Amnesty International з Рыгорам Галаўнёвым, 10 красавіка 2022 г.

96 Інтэрв'ю Amnesty International з Віталём Контаравым, 14 красавіка 2022 г.

97 Напрыклад, Су-30 базуюцца на авіябазе Мілерава непадалёк ад мяжы з Украінай; Janes, “Ukraine reportedly strikes Russian airbase,” janes.com/defence-news/news-detail/ukraine-reportedly-strikes-russian-airbase; самалёты Су-25 і Су-34 базуюцца на аэрадроме Прыморска-Ахтарска на процілеглым ад Марыупаля беразе Азоўскага мора; твіт Роба Лі, 14 лютага 2022 г., twitter.com/RALee85/status/1493423800259653637

паводле паведамленняў, выкарыстоўваліся выключна для запуску крылатых ракет з тэрыторыі далёка за межамі Украіны, каб пазбегнуць пагрозы быць збітымі ўкраінскімі ракетамі дальняга дзеяння класа «зямля-паветра», таму, хутчэй за ўсё, яны не ўдзельнічалі ў гэтым нападзе (сцэнар удару крылатай ракетай разглядаецца ў гэтым брыфінгу далей)[98].

Каб вызначыць, якія авіябомбы ў расійскім арсенале ўтрымліваюць 400-800 кг чыстай масы выбуховага рэчыва, як гэта вызначылася ў матэматычнай мадэлі, Amnesty International правяла аналіз лічбавага кантэнту з адкрытых крыніцаў і высветліла, што сярод узбраення, якое прымяняла расійская тактычная знішчальная авіяцыя падчас вайны ва Украіне, пераважную большасць складаюць 500-кілаграмовыя бомбы. Паказальна, што не было знойдзена ніякіх доказаў фактычнага прымянення (г.зн. боепрыпасаў, якія б не разарваліся, ці ідэнтыфікаваных асколкаў) авіябомбаў вагой больш за 500 кг, што робіць малаверагодным выкарыстанне аднаго буйнейшага баявога сродку[99]. У гэтым канфлікце Расія прымяняла некалькі відаў 500-кілаграмовых авіябомбаў, у тым ліку ФАБ-500 М54 (чыстая маса выбуховага рэчыва – 220 кг)[100], ФАБ-500 М62 (чыстая маса выбуховага рэчыва – 300 кг)[101] і ОФАБ-500 (чыстая маса выбуховага рэчыва – 230 кг)[102]. Баявыя сродкі, якія выкарыстоўваліся ў гэтым выпадку, – гэта, хутчэй за ўсё, дзве 500-кілаграмовыя бомбы адной і той жа мадэлі, што ў суме дае чыстую масу выбуховага рэчыва ў 440-600 кг, і гэта ўкладаецца ў рамкі матэматычнай мадэлі[103].

Да таго ж, паказанні сведкаў пра значную таўшчыню асколка бомбы пацвярджаюць гэтую выснову. Адзін чалавек, апытаны Amnesty, трымаў у руках асколак боепрыпаса, атрыманага ад людзей, якіх ён бачыў у тэатры і якія сказалі яму, што знайшлі яго ў тэатры пасля ўдару[104]. Ён апісаў асколак так: 40 см у даўжыню, 10 см у шырыню і 4 см у таўшчыню, вельмі цяжкі ў параўнанні з памерам, адзін бок – тонка апрацаваны, а зубчастыя краі такія вострыя, што, трымаючы асколак, ён баяўся парэзацца. Гэта надзвычай паказальнае апісанне асколка бомбы, асабліва характэрных вытачаных краёў.

Наносячы ўдар па драматычным тэатры, расійскія ВПС, імаверна, дабіліся двух прамых трапленняў у цэнтр масы – праз памер цэлі гэта магчыма нават пры выкарыстанні некіраваных бомбаў. 500-кілаграмовыя бомбы былі, імаверна, некіраванымі, з улікам таго, што Расія, як паведамлялася,

98 Business Insider, “Pentagon says some Russian jets are avoiding Ukraine’s airspace during sorties to avoid being shot down,” 11 сакавіка 2022 г., businessinsider.com/russian-jets-avoiding-ukraine-airspace-to-avoid-being-shot-down-2022-3

99 Некалькі фотаздымкаў больш буйных авіябомбаў, такіх, як УПАБ-1500, з’явіліся ў ананімных акаўнтах у сацыяльных сетках, але Amnesty International не знайшла сведчанняў, што такая зброя выкарыстоўвалася ва Украіне. Гл., напрыклад, выдалены твіт @dusics, web.archive.org/web/20220317153253/https://twitter.com/dusics/status/1504480668440416264

100 Твіт @coupsure, 6 сакавіка 2022 г., twitter.com/COUPSURE/status/1500389727035404289; «Калектыўная інфармаванасць пра боепрыпасы, якія не разарваліся» (CAT-UXO), “Авіябомба ФАБ-500 М54”, cat-uxo.com/explosive-hazards/aircraft-bombs/fab-500-m54-aircraft-bomb

101 Твіт @war_noir, 3 March 22, 15 June 22, twitter.com/war_noir/status/1499503140554649603; Расабаронэкспарт, “ФАБ-500 M-62,” roe.ru/eng/catalog/aerospace-systems/air-bombs/fab-500-m-62

102 Rosoboronexport, “OFAB-500U,” roe.ru/eng/catalog/aerospace-systems/air-bombs/ofab-500u

103 500-кілаграмовыя расійскія авіябомбы ўтрымліваюць у сярэднім ад 200 да 220 кг выбуховага рэчыва. Астатняя вага прыходзіцца на металічную абалонку боепрыпаса. Падрабязней гл.: «Калектыўная інфармаванасць пра боепрыпасы, якія не разарваліся» (CAT-UXO), “Авіябомба ОФАБ-500 М54”, cat-uxo.com/explosive-hazards/aircraft-bombs/ofab-500-m54-aircraft-bomb; «Калектыўная інфармаванасць пра боепрыпасы, якія не разарваліся» (CAT-UXO), “Авіябомба ФАБ-500 М54”, cat-uxo.com/explosive-hazards/aircraft-bombs/fab-500-m54-aircraft-bomb

104 Інтэрв’ю Amnesty International з Алегам Карынным, 10 красавіка 2022 г.



↑ *Дым над галоўным уваходам у тэатр неўзабаве пасля нападу. На зямлі вялікімі літарамі напісанае слова «ДЗЕЦІ».*
*© Прыватны здымак*





↑↑ *Задні ўваход у драматычны тэатр неўзабаве пасля нападу 16 сакавіка 2022 г., хутка пасля выбуху. © Сяргей Забагонскі*

↑ *Мужчына ідзе міма поля абломкаў тэатра неўзабаве пасля нападу. © Прыватны здымак*



← Поле абломкаў на месцы, дзе была палявая кухня, 16 сакавіка 2022 г., неўзабаве пасля нападу.
© Сяргей Забагонскі

↓ Бок тэатра праз некалькі гадзінаў пасля нападу.
© Прыватны здымак



практычна не здолела задзейнічаць высокадакладныя кіраваныя бомбы ў гэтым канфліце[105]. Не да канца зразумела, якое кругавое імавернае адхіленне (КІА) – радыус кола, у межах якога чакаецца пападанне 50% прыцэльнай зброі, – маюць некіраваныя расійскія бомбы[106]. Міністэрства абароны Расіі сцвярджае, быццам мадэрнізацыя прыцэльна-навігацыйных сістэмаў знізіла КІА іх некіраваных бомбаў да менш, чым 15 м[107]. Гэта малаверагодна. Некіраваныя амерыканскія бомбы Mk 82 маюць заяўленае КІА 94,5 м[108]. Сам драматычны тэатр меў памеры 80 м на 40 м, і таму хаця пілоту было складана нацэліцца на асноўную частку будынка і двойчы дакладна трапіць у цэль, гэта цалкам імаверна.

Да таго ж, Amnesty International не змагла ідэнтыфікаваць іншую магчымую цэль у межах КІА 500-кілаграмовых бомбаў. На спадарожнікавых здымках, зробленых праз некалькі хвілінаў пасля ўдару, у раёне вакол тэатра не відаць вялікіх бронетранспарцёраў, артылерыі ці іншых вялікіх ваенных цэляў. (Гл. Спадарожнікавыя здымкі на ст. 31.) Акрамя таго, з улікам планіроўкі тэрыторыі і парка вакол тэатра, – шырока адкрытай зоны, дзе да найбліжэйшай вялікай пабудовы больш за 100 м, – крайне малаверагодна, што цэллю быў іншы будынак, апроч драматычнага тэатра.

# 3.2 ПРАЎДАПАДОБНАЯ АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ ТЭОРЫЯ: РАСІЙСКАЯ КРЫЛАТАЯ РАКЕТА

Найбольш праўдападобнай альтэрнатывай расійскаму ўдару авіябомбай выглядае ўдар расійскай крылатай ракеты. Напрыклад, ракета «Калібр» падводнага базавання і ракета Х-55 паветранага базавання нясуць боегалоўкі масай прыкладна на 500 кг[109]. Расія рэгулярна выкарыстоўвала крылатыя ракеты падчас канфлікту. Гэта таксама надзвычай дакладная зброя, з КІА усяго 3 м[110]. Пададзеныя ніжэй доказы ўказваюць на тое, што выкарыстанне крылатых ракетаў малаверагоднае. Аднак калі б крылатая ракета сапраўды была выкарыстаная, яе высокая дакладнасць даводзіць, што тэатр, несумненна, быў намечанай цэллю.

Некалькі доказаў зніжаюць імавернасць таго, што ў гэтым нападзе выкарыстоўвалася крылатая ракета. У першы месяц канфлікту Расія не прадэманстравала здольнасці выкарыстоўваць удары крылатымі ракетамі для непасрэднай падтрымкі наземных наступаў камбінаваным узброеным чынам, і гэта азначае, што расійскія наземныя, паветраныя і марскія войскі супрацоўнічалі, нападаючы на канкрэтныя тактычныя цэлі. «Калібры» і іншыя крылатыя ракеты выкарыстоўваліся

105 New York Times, “Russian Guided Weapons Miss the Mark, U.S. Defense Officials Say,” 9 траўня 2022 г., nytimes.com/2022/05/09/us/politics/russia-air-force-ukraine.html

106 Жэнеўскі міжнародны гуманітарны цэнтр Дэмінга, “Уздзеянне выбуховай зброі”, люты 2017 г., gichd.org/fileadmin/GICHD-resources/rec-documents/Explosive_weapon_effects_web.pdf

107 Расійская навінавая агенцыя ТАСС, “Russia’s Aerospace Forces can use standard air bombs as precision weapons,” 18 чэрвеня 2019 г., tass.com/defense/1064347

108 Жэнеўскі міжнародны гуманітарны цэнтр Дэмінга, “Уздзеянне выбуховай зброі”, люты 2017 г., gichd.org/fileadmin/GICHD-resources/rec-documents/Explosive_weapon_effects_web.pdf

109 Washington Post, “What to know about the long-range cruise missile Russia says it fired,” 24 сакавіка 2022 г., washingtonpost.com/world/2022/03/24/russia-kalibr-cruise-missile-ukraine-weapons

110 Альянс падтрымкі супрацьракетнай абароны, “Калібр 3М-14”, травень 2017 г., missiledefenseadvocacy.org/missile-threat-and-proliferation/todays-missile-threat/russia/ss-n-30a-kalibr

хутчэй амаль выключна дзеля ўдараў па стратэгічных ваенных цэлях, такіх, як аэрадромы, паліўныя склады і склады боепрыпасаў у гарадах па ўсёй Украіне, часта ў сотнях кіламетраў ад расійскіх наземных нападаў[111]. Сведкі апісвалі баі, якія падчас нападу на тэатр ішлі ў яго ваколіцах, – на адлегласці, нашмат бліжэйшай, чым гэта назіралася яшчэ дзе-небудзь ва Украіне, паміж наземнымі войскамі і ўдарамі крылатых ракетаў[112].

Да таго ж, асколкі бомбы з паказанняў сведкі (гл. вышэй), якія, як паведамляецца, знайшлі на месцы нападу на драматычны тэатр, адрозніваюцца ад асколкаў, выяўленых пасля ўдараў расійскіх крылатых ракетаў[113]. Правераныя фотаздымкі і відэа асколкаў, якія засталіся на месцах пацверджаных атакаў расійскімі крылатымі ракетамі, паказваюць, што буйныя часткі рухавіка вытрымліваюць удар[114], а расследаванне Amnesty International 14 сакавіка 2022 г., якое тычылася ўдару крылатай ракеты па тэлевежы ў Роўне, выявіла фрагменты баявой сістэмы (у тым ліку частку рэактыўнага рухавіка ракеты), якія істотна адрозніваюцца ад асколкаў авіябомбаў[115].

Да таго ж, дадзеныя радыётэхнічнай выведкі не ўказваюць на ўдар крылатай ракетай. Многія такія ўдары наносяцца стратэгічнымі бамбавальнікамі[116]. Amnesty International вядома пра шэсць радыёчастотаў, якія, імаверна, выкарыстоўвалі расійскія стратэгічныя бамбавальнікі каля 16 сакавіка 2022 г.[117] (Распаўсюд і запіс на гэтых частотах вядзецца іншымі метадамі, чым тыя, якія выкарыстоўвае тактычная знішчальная авіяцыя, якая, хутчэй за ўсё, і нанесла ўдар.) Дзве з гэтых частотаў у дыяпазоне 5-8 МГц былі вылучаныя, відаць, для галасавой сувязі ў светлы час сутак. Amnesty International прааналізавала актыўнасць на абедзвюх частотах з 7 да 12 раніцы па ўсходнееўрапейскім часе. Ніякай актыўнасці не выявілася[118].

Amnesty не мела доступу да запісаў на ніжэйшай частаце, якая, як паведамляецца, выкарыстоўвалася для галасавой сувязі у вечаровы і начны час. Аднак малаверагодна, што гэтая частата выкарыстоўвалася паміж 7 і 12 гадзінамі раніцы па ўсходнееўрапейскім часе, бо дзённыя іёнасферныя ўмовы абмяжоўвалі яе эфектыўнасць. 16 сакавіка ўзыход сонца быў у Марыупалі каля 5:40.

Гэтак жа Amnesty не змагла праверыць запісы трох астатніх частотаў, якія расійскія стратэгічныя бамбавальнікі нібыта выкарыстоўвалі для азбукі Морзэ. Аднак ранейшая актыўнасць на гэтых частотах прыцягнула да сябе ўвагу ў інтэрнэце і, імаверна, была запісаная і абнародаваная.

111 Дыстанцыйнае інтэрв'ю са старшым аналітыкам па абароне (ананімнае), 11 красавіка 2022 г.

112 Паказальна, што гэты бой адбыўся далёка за межамі КІА 500-кілаграмовай некіраванай бомбы.

113 Інтэрв'ю Amnesty International з Алегам Карынным, 10 красавіка 2022 г.

114 Напрыклад, твіт @blueboy1969, 4 красавіка 2022 г., twitter.com/blueboy1969/status/1511076014897733635

115 Твіт @brian_castner, 11 красавіка 2022 г., twitter.com/Brian_Castner/status/1513501250578526227

116 The Drive, "We May Have Our First Sight Of A Russian Bomber Launching Missiles At Ukraine," 11 траўня 2022 г., thedrive.com/the-war-zone/we-may-have-our-first-sight-of-a-russian-bomber-launching-missiles-at-ukraine

117 Мноства анлайн-радыёназіральнікаў дзеляцца ў сацыяльных сетках справаздачамі пра гэтыя частоты ў рэжыме рэальнага часу. Напрыклад, гл. твіт @te3ej, 13 сакавіка 2022 г., twitter.com/te3ej/status/1503182068477485056; 15 сакавіка 2022 г., twitter.com/te3ej/status/1503884701915832325, 12 красавіка 2022 г., twitter.com/te3ej/status/1514004032980934659; і 17 красавіка 2022 г., twitter.com/te3ej/status/1515849637118238726.

118 Крыніца ананімная з меркаванняў бяспекі.

Даследаванні адкрытых крыніцаў не выявілі ніякіх доказаў таго, што азбука Морзэ перадавалася на гэтых частотах 16 сакавіка ва ўказаны прамежак часу.

Гэты аналіз грунтуецца на высокачастотных радыёперамовах, перахопленых за межамі Украіны. Магчыма, радыёперамовы мелі месца, але іх не перахапілі праз умовы распаўсюду і размяшчэнне прыёмных антэнаў. Расійскія стратэгічныя бамбавальнікі маглі таксама працаваць на частотах, невядомых Amnesty International, або без выкарыстання радыёсувязі[119].

Акрамя таго, той раніцай ні на поўдні, ні на ўсходзе Украіны сістэма апавяшчэння ўкраінскай цывільнай абароны не падавала сігналаў трывогі, якія сведчылі б пра пагрозу з'яўлення крылатай ракеты ці стратэгічнага бамбавальніка[120]. На момант удару па тэатры паветраная трывога была абвешчаная ў трох месцах: у 9:51 – у Вінніцы, у 9:53 – у Жытоміры і ў 9:54 – у Кіеве[121]. Гэта адпавядае дадзеным украінскіх сістэмаў супрацьпаветранай абароны, якія выявілі лакалізаваны наземны пуск, нацэлены на канкрэтны раён, у дадзеным выпадку – толькі на паўночна-цэнтральную частку Украіны. Калі б у паветры знаходзіліся бамбавальнікі Ту-22 ці Ту-95, якія нясуць крылатыя ракеты паветранага базавання, можна было б чакаць як радыёперамоваў, так і агульнай паветранай трывогі ва Украіне, бо гэтыя ракеты здольныя наносіць удары на вялікія адлегласці. І такім жа чынам, калі б украінская сетка супрацьпаветранай абароны зафіксавала запушчаную з Чорнага мора крылатую ракету падводнага базавання, да высвятлення яе траекторыі была б абвешчаная агульная паветраная трывога[122].

# 3.3 НЕПРАЎДАПАДОБНЫЯ ТЭОРЫІ

Amnesty International разгледзела і адхіліла тры іншыя тэорыі пра тое, хто здзейсніў напад і якая зброя выкарыстоўвалася.

Першы сцэнар прадугледжвае, што гэта быў напад аднаго з бакоў канфлікту з выкарыстаннем лягчэйшай зброі. Гэта найменш імаверна. Тэатр быў зруйнаваны адным ударам, і ніводзін з лягчэйшых боепрыпасаў, якія выкарыстоўваліся ўкраінскімі ці расійскімі войскамі ў Марыупалі ці яго ваколіцах падчас атакі, улучна з мінамётамі, артылерыяй, танкавымі боепрыпасамі, рэактыўнымі сістэмамі залпавага агню ці ракетамі для запуску з пляча і кіраванымі ракетамі і г.д. – і блізка не мае выбуховай сілы, здольнай нанесці пашкоджанні такога роду.

Другі сцэнар прадугледжвае, што тэатр атакавалі ўкраінскія войскі, якія выкарысталі авіяцыю ці балістычную ракету. Буйная авіябомба ці ракетная боегалоўка – адзіная на ўзбраенні ўкраінскіх

119 Кансультацыя Amnesty International з экспертам па тэлекамунікацыйных сістэмах (ананімная).

120 Нацыянальная сістэма апавяшчэння для выяўлення дальніх атакаў не рэагуе на тактычную авіяцыю, якая, хутчэй за ўсё, і нанесла ўдар. У час нападу на тэатр мясцовая сістэма апавяшчэння жыхароў пра наземныя напады (такія, як ракеты ці артылерыя) ці тактычныя ўдары з паветра (якія здзяйсняюцца, напрыклад, тактычнымі знішчальнікамі) больш не функцыянавала.

121 Тэлеграм-канал "AirAlert_UA", t.me/air_alert_ua

122 Механізм дзеяння ўкраінскай сеткі супрацьпаветранай абароны і сістэмы апавяшчэння, паводле асабістага інтэрв'ю з абласным супрацоўнікам міністэрства інфармацыі, 22 сакавіка 2022 (ананімнае).

войскаў зброя дастатковага памеру, здольная нанесці пашкоджанні, якія назіраюцца ў тэатры. Абодва варыянты крайне малаверагодныя. Паведамляецца, што на момант удару расійскія ВПС здзяйснялі ад 200 да 300 самалёта-вылетаў на дзень, у той час як украінскія ВПС – толькі ад 5 да 10[123]. Асноўная частка нешматлікіх украінскіх вылетаў прыходзілася на паветраныя баявыя патрулі з узбраеннем класа «паветра-паветра», прызначаным для атакаў на расійскія самалёты[124]. Акрамя таго, адзіная балістычная ракета, якую, як паведамляецца, запускала ў гэтым канфлікце Украіна, – гэта «Кропка-У», якая нанесла вельмі абмежаваную колькасць удараў, кожны раз з выкарыстаннем аднаго комплексу[125]. Больш за тое, «Кропка-У» пакідае пасля сябе характэрны ракетны рухавік – у драматычным тэатры яго не знайшлі. Да таго ж, не было ніякіх паведамленняў пра ўкраінскія самалёты ў Марыупалі ў момант удару і ніхто, у тым ліку Расія, не абвінавачваў украінскіх вайскоўцаў у нападзе на тэатр з паветра.

Трэці сцэнар прадугледжвае тое, што напад быў аперацыяй пад фальшывым сцягам украінскага палка «Азоў», які наўмысна зруйнаваў будынак знутры. Міністэрства абароны Расіі і афіцыйныя расійскія СМІ заявілі, быццам украінскі полк «Азоў» узарваў тэатр у якасці дыверсіі[126]. 16 сакавіка МЗС Расіі абвінаваціла Украіну ў спробе падставіць яе з дапамогай выбуху ў тэатры[127]. У міністэрстве адмаўлялі тое, што адказнасць за напад нясе Расія, і абвінавачвалі ў ім украінскія войскі. «Удзень 16 сакавіка ніякіх задачаў, звязаных з нанясеннем удараў па наземных цэлях у гарадской рысе Марыупаля, расійская авіяцыя не выконвала. Паводле правераных звестак, баевікі нацыяналістычнага батальёна «Азоў» здзейснілі новую крывавую правакацыю, узарваўшы замінаваны імі будынак тэатра», – паведамляе міністэрства[128].

Каб гэтая заява адпавядала рэчаіснасці, байцам «Азова» трэба было б закласці і ўзарваць у тэатры не менш за 400-800 кг выбуховага рэчыва. Трынітраталуол такой масы заняў бы прастору прыкладна ў адзін кубічны метр. Больш за тое, улічваючы характар пашкоджанняў у тэатры, выбуховае рэчыва неабходна было размясціць на сцэне ці над ёй. Зрабіць гэта трэба было без ведама цывільных жыхароў тэатра, у тым ліку тых, што хаваліся ў канцэртнай зале. Вонкавыя самаробныя выбуховыя

123 New York Times, “How Ukraine’s Outgunned Air Force is Fighting Back Against Russian Jets,” 22 сакавіка 2022 г., nytimes.com/2022/03/22/world/europe/ukraine-air-force-russia.html; твіт @beverstine, 21 сакавіка 2022 г., twitter.com/beverstine/status/1505920628431462408

124 Drive, “Ukrainian MiG-29 Pilot’s Front-line Account of the Air War Against Russia,” 1 красавіка 2022 г., thedrive.com/the-war-zone/45019/fighting-russia-in-the-sky-mig-29-pilots-in-depth-account-of-the-air-war-over-ukraine

125 Падрабязней гл. Euromaidan Press, “Ukrainian forces launch missile attack on Russia’s military airfield,” 25 лютага 2022 г., euromaidanpress.com/2022/02/25/ukrainian-forces-launch-missile-attack-on-russias-military-airfield/; гл. таксама: Republic World, “Ukraine Fires OTR-21 Tochka Ballistic Missile Again in Berdyansk; Russia Intercepts Strike,” 20 сакавіка 2022 г. (перахопленая ракета ў Бярдзянску, 19 сакавіка 2022 г.), republicworld.com/world-news/russia-ukraine-crisis/ukraine-fires-otr-21-tochka-ballistic-missile-again-in-berdyansk-russia-intercepts-strike-articleshow.html; CNN, “Ukrainians claim to have destroyed large Russian warship in Berdyansk,” 25 сакавіка 2022 г. (удар па расійскім ваенным караблі «Саратаў» 24 сакавіка 2022 г.); Guardian, “Russia accuses Kyiv of deadly missile attack in Donetsk,” 14 сакавіка 2022 г. (удар, у выніку якога, як паведамляецца, загінулі цывільныя асобы ў Данецку, 14 сакавіка 2022 г.), theguardian.com/world/2022/mar/14/russia-accuses-kyiv-of-deadly-missile-attack-on-donetsk

126 Расійская навінавая агенцыя ТАСС, “Azov battalion militants blow up Mariupol theatre building – Defense Ministry,” 16 сакавіка 2022 г., tass.com/world/1423275

127 Reuters, “Russia accuses Ukraine of trying to frame it over Mariupol theatre attack,” 17 сакавіка 2022 г., reuters.com/article/ukraine-crisis-mariupol-theatre-russia/russia-accuses-ukraine-of-trying-to-frame-it-over-mariupol-theatre-attack-idINL2N2VK0SL

128 Расійская навінавая агенцыя ТАСС, “Azov battalion militant blow up Mariupol theatre building – Defense Ministry,” 16 сакавіка 2022 г., tass.com/world/1423275

прылады, усталяваныя на транспартных сродках, нават на вялікіх грузавіках, не выклікалі б тых наступстваў, якія назіраюцца: поле абломкаў і абвальванне дахавай сістэмы ўказваюць на тое, што выбух адбыўся ўнутры будынка. І ніводзін сведка ці чалавек, які хаваўся ў тэатры, не паведамляў пра актыўнасць такога кшталту ў зоне сцэны ці любой іншай частцы тэатра.

За чатыры дні да нападу шэраг прарасійскіх тэлеграм-каналаў і твітар-акаўнтаў папярэджвалі, што «Азоў» плануе правесці ў марыупальскім драматычным тэатры аперацыю пад фальшывым сцягам і абвінаваціць у гэтым Расію[129]. Ёсць толькі некалькі магчымых тлумачэнняў дакладнасці гэтых прадказанняў нападу на тэатр: па-першае, расійская службовая асоба паведаміла пра хуткі напад першай крыніцы гэтых звестак; па-другое, першая крыніца сапраўды аднекуль дазналася пра запланаваную «Азовам» аперацыю, якая ў такім разе насамрэч мела месца; па-трэцяе, гэта было супадзенне.

Небесстаронні характар першай крыніцы паведамленняў выклікае відавочныя пытанні адносна іх праўдзівасці і мэты. Паведамленні ў тэлеграм-каналах часта паўтараліся даслоўна, іх відавочна выразалі і ўстаўлялі, таму вызначыць, адкуль паведамленне ўзялося, складана. Аднак падобна, што першым паведамленне запосціў Дзмітрый Сцешын, якога апазіцыйны Форум свабоднай Расіі апісвае як прапагандыста таблоіда «КП», што знаходзіцца пад санкцыямі Украіны. Пасля яго паведамленне было працытаванае ў твітар-акаўнце @elenaevdokimov7 у твіце, які затым шырока распаўсюдзіўся[130]. Акаўнт @elenaevdokimov7, у прыватнасці, прасоўваў шэраг тэорый змовы на тэму аперацыі пад фальшывым сцягам, якія або выявіліся цалкам ілжывымі (напад Украіны на хімічны завод у Гарлоўцы), або абвінавачвалі ўкраінскія войскі ў дзеяннях, учыненых Расіяй ці войскамі, якія падтрымлівала Расія (інсцэніроўка падрыву джыпа кіраўніка паліцыі ў Данецку як правакацыя дзеля таго, каб пачаць уварванне)[131]. Акаўнт @elenaevdokimov7 у твітары таксама прасоўваў відэа Bonanza Media – дэзынфармацыйнага праекта, арганізаванага Галоўным кіраваннем Генеральнага штаба Узброеных сіл (шырока вядомым як ГРУ), расійскай ваеннай выведкай – але Amnesty International не ўдалося ўсталяваць прамую сувязь паміж акаўнтам @ elenaevdokimov7 і выведвальнай службай[132]. Калі падчас наступнага расследавання ўдасца ўсталяваць прамую сувязь паміж гэтым акаўнтам і расійскім урадам, гэта зрабілася б доказам таго, што расійскія ўзброеныя сілы наўмысна і загадзя планавалі нанесці ўдар па драматычным тэатры.

---

129 Паведамленне ў тэлеграме, 12 сакавіка 2022 г., t.me/DmitriySteshin/4246; твіт @elenaevdokimov7, 13 сакавіка 2022 г., twitter.com/elenaevdokimov7/status/1502875319170387968

130 Твіт @elenaevdokimov7, 17 сакавіка 2022 г., twitter.com/elenaevdokimov7/status/1504343197379874816; Твіт @elenaevdokimov7, 13 сакавіка 2022 г., twitter.com/elenaevdokimov7/status/1502875319170387968

131 Твіт @elenaevdokimov7, 18 лютага 2022 г., twitter.com/elenaevdokimov7/status/1494678321833328640; твіт @elenaevdokimov7, 19 лютага 2022 г., twitter.com/elenaevdokimov7/status/1495250807981109257

132 Твіт @elenaevdokimov7, 15 ліпеня 2020 г., twitter.com/elenaevdokimov7/status/128326779911725875; твіт @elenaevdokimov7, 30 жніўня 2020 г., twitter.com/elenaevdokimov7/status/1299992105935228928; твіт @ elenaevdokimov7, 30 кастрычніка 2022 г., https://twitter.com/elenaevdokimov7/status/1322356998864662528; Bellingcat, “The GRU’s MH17 Disinformation Operations Part 1: The Bonanza Media Project,” 12 лістапада 2020 г., bellingcat.com/news/uk-and-europe/2020/11/12/the-grus-mh17-disinformation-operations-part-1-the-bonanza-media-project

# 3.4 СТРАТЫ

У выніку ўдару загінула шмат людзей. Многія іншыя былі сур'ёзна параненыя. Дакладная колькасць ахвяраў невядомая. Праз дзевяць дзён пасля ўдару па тэатры Марыупальская гарадская рада, спасылаючыся на відавочцаў, паведаміла ў сваім тэлеграм-канале, што загінула каля 300 чалавек[133]. Associated Press апублікавала ў траўні расследаванне, у якім прыйшло да высновы, што магло загінуць парадку 600 чалавек[134]. Amnesty International не змагла дакладна ацаніць колькасць загінулых, аднак сведчанні паказваюць, што яна нашмат меншая, чым паведамлялася раней.

Amnesty International апытала 28 чалавек, якія прысутнічалі ў тэатры ў час атакі, у тым ліку шасцярых, якія бачылі атаку ці выбух здалёк, і васьмярых, якія прыйшлі ў тэатр пасля ўдару. Amnesty International спытала кожнага рэспандэнта, ці ведаюць яны кагосьці, хто загінуў ці быў сур'ёзна ранены ў выніку ўдару. Агулам апытаныя назвалі Amnesty International імёны і прозвішчы чатырох чалавек, якія загінулі ў выніку авіяўдару: Міхаіл Грабянецкі, Любоў Свірыдава, Алена Кузняцова і Ігар Чысцякоў[135]. Апытаныя таксама назвалі Amnesty International імёны (без прозвішчаў) яшчэ траіх чалавек, якіх яны ведалі і якія, на іх думку, загінулі ў выбуху[136]. Некалькі выжылых і іншыя сведкі паведамілі таксама, што бачылі целы людзей, якіх не маглі апазнаць. (Падрабязней пра гэтых загінулых і іншыя страты гл. раздзел 3.6 «Паведамленні з першых рук пра страты» ніжэй.)

Amnesty International таксама правяла грунтоўны агляд традыцыйных СМІ і сацыяльных сетак (на англійскай, украінскай і рускай мовах), каб высветліць, ці не паведамлялася публічна пра іншыя смяротныя выпадкі. Агулам Amnesty высветліла, што традыцыйныя СМІ паведамілі пра яшчэ тры смяротныя выпадкі: Анастасія Хаджава, Караліна Хаджава і Аляксандр Хаджава[137]. Пра іншыя тры смяротныя выпадкі паведамлялася ў сацыяльных сетках: Максім Портасаў, Любоў Гваздзялюк, Аляксандр Шаўчэнка[138].

Таксама Amnesty International звязалася з Нацыянальнай паліцыяй, Офісам Генеральнага пракурора і Марыупальскай гарадской радай, запытаўшы імёны загінулых, чые смерці былі

133 Associated Press, "Ukraine reports 300 dead in airstrike on Mariupol theatre," 26 сакавіка 2022 г., apnews.com/article/russia-ukraine-zelenskyy-kyiv-europe-moscow-b56759e5d40db18e94bef8e42db23e47

134 Associated Press, "AP evidence points to 600 dead in Mariupol theatre airstrike," 4 траўня 2022 г., apnews.com/article/Russia-ukraine-war-mariupol-theater-c321a196fbd568899841b506afcac7a1; Associated Press, "AP Methodology: Calculating Mariupol theatre airstrike dead," 4 траўня 2022 г., apnews.com/article/russia-ukraine-business-europe-donetsk-0e361756c6acc287e8974103913abfc6

135 Інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй Ткачэнка, 6 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 4 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Аленай Мацюшынай, 25 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Мацюшыным, 30 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй Грабянецкай і Яўгенам Грабянецкім, 16 красавіка 2022 г.; Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 28 красавіка 2022 г.

136 Інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Пласкіным, 21 чэрвеня 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Анастасіяй Карпеевай, 19 красавіка 2022 г.; Інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 8 траўня 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй Ганчаровай, 2 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 28 красавіка 2022 г.

137 BBC News Ukraine, "'I dug up my daughter in the fire.' Stories from the Mariupol Drama theatre," Diana Kurysho, 8 красавіка 2022 г.

138 Пра гэтыя смяротныя выпадкі паведамілі ў тэлеграм-канале "Загінулыя, Памяць, Марыупаль," t.me/mariupolRIP/18136, t.me/mariupolRIP/22797, t.me/mariupolRIP/16596; пра два таксама паведамілі на фэйсбуку, facebook.com/photo.php?fbid=5117351998329895&set=a.292400204158456&type=3, facebook.com/100025173259444/posts/1096787414503690/?d=n

пацверджаныя ці зарэгістраваныя. Нацыянальная паліцыя пацвердзіла, што атрымала паведамленне пра адзін са смяротных выпадкаў, пра які Amnesty International ужо было вядома[139].

Грунтуючыся на нашым аглядзе паказанняў сведкаў і іншых крыніцах, Amnesty International мяркуе, што ў выніку ўдару загінула як мінімум дзесяць чалавек, а таксама што шэраг смяротных выпадкаў, імаверна, застаўся незарэгістраваным. З улікам сітуацыі сабраць нават прыблізныя звесткі пра колькасць ахвяраў, асабліва загінулых, надзвычай складана. У нармальных абставінах паліцыя і служба па надзвычайных сітуацыях мелі б бяспечны доступ да тэатра і маглі б выкапаць целы і паспрабаваць іх апазнаць. Аднак пасля нападу на тэатр весці такія працы немагчыма. Хаця некалькі чалавек змаглі застацца ў тэатры ці вярнуцца туды пасля нападу, каб шукаць выжылых і выцягваць ахвяраў, яны зрабілі гэта, моцна рызыкуючы сваёй бяспекай, у іх было мала часу і яны маглі перасоўваць абломкі толькі ўручную. Належныя ж раскопкі патрабуюць цяжкай тэхнікі. Больш за тое, паведамляецца, што расійскія войскі, якія ўзялі пад кантроль раён вакол тэатра, перашкаджалі свабоднаму доступу незалежных журналістаў і цывільных асобаў да месца ўдару[140]. І як толькі службы па надзвычайных сітуацыях ДНР і Расіі атрымалі доступ да тэатра, яны, як паведамляецца, расчысцілі тэрыторыю бульдозерамі і вывезлі целы, не зарэгістраваўшы тых, хто загінуў[141]. Паводле словаў Дзмітрыя Пласкіна, які наведаў тэатр прыкладна праз тыдзень пасля ўдару і пагаварыў з супрацоўнікам службы па надзвычайных сітуацыях ДНР, той сказаў, што яны кожны дзень выкопваюць каля 3-4 целаў[142].

Той факт, што тэлекамунікацыйная сетка ў Марыупалі не функцыянавала, таксама надзвычай ускладніў пошук выжылых і ўсталяванне з імі сувязі. Многія людзі, якія хаваліся ў драматычным тэатры, маглі ніколі не мець магчымасці расказаць сябрам ці сямейнікам пра тое, што былі там. Хаця валанцёры ў тэатры рэгістравалі людзей, якія там хаваліся, мяркуецца, што ніводзін з гэтых запісаў не захаваўся. Пасля нападу выжылых хутка раскідала ў розныя бакі. Многія выжылыя, з якімі размаўляла Amnesty, ведаюць толькі пра тых, з кім сышлі з тэатра ці былі ў момант атакі.

## 3.5 АЦЭНКА ШКОДЫ І НЕЗАРЭГІСТРАВАНЫХ СТРАТАЎ

Каб лепш зразумець колькасць незарэгістраваных ахвяраў удару, Amnesty International сабрала звесткі пра колькасць і размяшчэнне людзей у тэатры ў час нападу, а таксама пра тыя месцы ў ім, якія людзі наведалі пасля ўдару. Таксама Amnesty International сабрала фота- і відэадоказы наступстваў удару. Затым Amnesty International параўнала гэтыя паказанні і візуальныя доказы з экспертнымі ацэнкамі маштабаў выбуху і яго лакалізацыі, а таксама імавернага ўздзеяння на будынак і людзей унутры.

---

139 Ліставанне Amnesty International з Нацыянальнай паліцыяй, 21 траўня 2022 г.

140 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімныя). Нават доступ да ўсяго Марыупаля вельмі абмежаваны.

141 Washington Post, “At the scene of Mariupol theater tragedy, Russia prepares for a parade,” 5 траўня 2022 г., washingtonpost.com/world/2022/05/05/ukraine-mariupol-theater-russia-military-parade/; варта адзначыць, што ў паведамленнях СМІ пра расчыстку завалаў расійскай службай па надзвычайных сітуацыях у абломках відаць як мінімум адно цела: твіт @jack_mrgln, 21 красавіка 2022 г., twitter.com/Jack_Mrgln/status/1517194773559402496

142 Інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Пласкіным, 21 чэрвеня 2022 г.

# ПЛАНЫ ПАВЕРХАЎ ДАНЕЦКАГА АКАДЭМІЧНАГА АБЛАСНОГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА Ў МАРЫУПАЛІ.



*Падвал*



*Першы паверх*

- *пярэдні падвал*
- *канцэртная зала, кулісы, сцэна і падвал*
- *задняя частка*
- *пярэдні надземны ўзровень*
- *вонкавая зона*

**Пярэдні падвал** *уключае ўсе падземныя памяшканні пад фасадам тэатра і ўваходам у канцэртную залу.*

**Пярэдні надземны ўзровень** *уключае ўсю надземную частку паміж галоўным уваходам і канцэртнай залай, у тым ліку калідоры на першым, другім і трэцім паверхах, якія атачаюць канцэртную залу.*

**Задняя частка тэатра** *уключае ўсе памяшканні над і пад зямлёй паміж заднім уваходам і сцэнай.*

**Канцэртная зала** *уключае глядацкую зону ў партэры, балконы ўнутры тэатра і сцэну (у тым ліку кулісы па абодва бакі ад яе), а таксама прастору пад сцэнай.*




*Другі паверх*




*Трэці паверх*




*Чацвёрты паверх*

Як падрабязна апісвалася вышэй, колькасць насельнікаў тэатра павялічвалася паміж 24 лютага і 14 сакавіка і пасля рэзка зменшылася паміж 14 сакавіка, калі людзі пачалі эвакуявацца, і раніцай 16 сакавіка, калі быў нанесены ўдар. Ацэнкі агульнай колькасці людзей у тэатры і вакол яго падчас нападу істотна адрозніваюцца; выжылыя і сведкі падалі прыблізныя лічбы ад 300 ці 400 чалавек як мінімум да больш чым 1000 як максімум. Некаторыя валанцёры, якія ўдзельнічалі ў арганізацыі пражывання людзей у тэатры, ацанілі іх колькасць у тэатры падчас нападу каля 600-800 чалавек[143]. Чалавек, які валанцёрыў на палявой кухні, сказаў, што ў дзень нападу яны ўсё яшчэ гатавалі на 800 чалавек[144].

Хаця Amnesty не мае дакладнага ўяўлення пра колькасць чалавек ці іх размяшчэнне, паказанні выжылых у большай ці меншай ступені ўказваюць на тое, дзе канцэнтраваліся людзі і што, у самых агульных рысах, адбывалася з імі ў розных частках тэатра. Больш за тое, хаця паказанні сапраўды ўказваюць на месцы, дзе некаторыя людзі загінулі ці атрымалі сур’ёзныя раненні, і дазваляюць меркаваць, у якіх зонах насельнікі тэатра ў большасці выпадкаў не гінулі і не былі сур’ёзна параненыя, цалкам імаверна, што збыткоўны ціск выбуховай хвалі, асколкі ці іншыя наступствы выбуху маглі выклікаць сур’ёзныя раненні ці смерці ў тых частках тэатра, якія засталіся непашкоджанымі[145].

Дзеля паяснення тэатр можна раздзяліць на пяць зонаў:

## ПЯРЭДНІ ПАДВАЛ

Пярэдні падвал уключае ўсе падземныя памяшканні пад фасадам тэатра і ўваходам у канцэртную залу, у тым ліку вялікае памяшканне (былы рэстаран), якое цягнецца да зоны (і атачае яе) пад часткай канцэртнай залы. Яго часта называюць «бамбасховішчам».

Amnesty International апытала чатырох выжылых, якія падчас нападу знаходзіліся ў пярэднім падвале, і яшчэ некалькіх, якія зайшлі туды адразу пасля нападу[146]. Таксама Amnesty International апытала аднаго чалавека, які пакінуў падвал раніцай 16 сакавіка[147], і некалькіх валанцёраў, якія наведалі падвал за дзень да ўдару[148]. Паводле іх паказанняў, значная частка жыхароў тэатра – магчыма, траціна ці больш, або 200-300 чалавек, – былі там падчас нападу.

143 Інтэрв’ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 6 траўня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімныя).

144 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 20 чэрвеня 2022 г.

145 Выбуховыя траўмы выклікаюцца чатырма асобнымі механізмамі. Першасныя траўмы звязаныя з самім выбуховым рэчывам і збыткоўным ціскам выбуховай хвалі, якая пашкоджвае тканкі чалавека. Другасныя траўмы ўзнікаюць ад асколкаў боепрыпасаў і іншых лятаючых прадметаў, адкінутых выбуховай хваляй. Трацічныя траўмы выклікаюцца тым, што выбуховая хваля адкідвае саміх людзей. Чацвярцічныя траўмы робяцца вынікам апёкаў і ўздзеяння атрутных газаў; гл. Цэнтр па кантролі і прафілактыцы захворванняў, “Выбухі і выбуховыя траўмы”, cdc.gov/masstrauma/preparedness/primer.pdf

146 Інтэрв’ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 6 траўня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Наталляй Ганчаровай, 22 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае) 22 сакавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 22 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 7 траўня 2022 г.

147 Інтэрв’ю Amnesty International з Антонам Гузем, 23 сакавіка 2022 г.

148 Інтэрв’ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 6 траўня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 2 траўня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Наталляй Ганчаровай, 22 красавіка 2022 г.

Дзякуючы апорным сценам і бетонным перакрыццям паміж гэтай зонай і месцам выбуху пярэдні падвал аказаўся найбольш абароненым ад удару. Ён мог найменш пацярпець ад збыткоўнага ціску, і туды не трапілі асколкі боепрыпасаў.

Сведкі, якіх мы апыталі, адзначылі, што ўсе ці амаль усе ў падвале, як мяркуецца, выжылі, аднак некалькі чалавек атрымалі раненні. Падчас удару ў падвале хавалася жанчына ў познім падлеткавым узросце са сваім хлопцам і маці. «За секунду ўсё змянілася. Усё скаланулася... Людзі пачалі крычаць. Было шмат пылу... Я ўбачыла людзей у крыві. Мы схапілі дакументы і сышлі... Некаторым пашанцавала менш», – сказала яна[149]. «Быў моцны грук і пасля – воблака пылу... Было шмат цяжкапараненых. Людзі крычалі... Мы заставаліся ў падвале каля 15 хвілінаў. Хацелі застацца даўжэй, але людзі сказалі, што тэатр гарыць», – паведаміў Amnesty International бацька сямейства, якое эвакуявалася з 23-га мікрараёна[150].

Наталля Ганчарова, якая знаходзілася на лесвічнай клетцы збоку тэатра паміж першым і другім паверхамі і ў выніку выбуху была параненая, расказала Amnesty International, што сустрэлася са сваёй сям’ёй у падвале неўзабаве пасля ўдару. «Мы прабылі ў падвале каля 20 хвілінаў... мы не ведалі, што рабіць, бо падвал добра сябе паказаў [вытрымаўшы ўдар], але тады іншыя пачалі казаць, што будынак гарыць. Мы сабралі мінімум рэчаў і сышлі», – сказала яна[151]. «Усе ў падвале пад галоўным вестыбюлем выжылі. [Многія людзі з іншых частак тэатра] спусціліся ў падвал [схавацца] на некаторы час пасля выбуху», – сказаў Amnesty International Сяргей Забагонскі[152].

Некалькі выжылых, якія вярнуліся ў падвал пасля нападу, сказалі, што не бачылі там целаў. Гэтыя паказанні падмацоўваюць відэа-матэрыялы, знятыя праз некалькі тыдняў пасля нападу асобай, якая назвала сябе незалежным журналістам і якой расійскія войскі забяспечылі прывілеяваны доступ у тэатр: яны паказваюць частку падвала, якая засталася цалкам непашкоджанай[153].

## ПЯРЭДНІ НАДЗЕМНЫ ЎЗРОВЕНЬ

Пярэдні надземны ўзровень уключае ўсю надземную частку паміж галоўным уваходам і канцэртнай залай, у тым ліку калідоры на першым, другім і трэцім паверхах, якія атачаюць канцэртную залу.

149 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 22 сакавіка 2022 г.

150 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 7 траўня 2022 г.

151 Інтэрв’ю Amnesty International з Наталляй Ганчаровай, 2 красавіка 2022 г.

152 Інтэрв’ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022.

153 Patrick Lancaster, “Inside Mariupol Drama Theatre Where 300+ Were Killed in Russian-Ukraine War,” 22 красавіка 2022 г., www.youtube.com/watch?v=GVlu6XsLKmE

Amnesty International апытала 14 выжылых, якія знаходзіліся ў пярэдняй частцы тэатра ў зоне паміж уваходам і канцэртнай залай ці непасрэдна перад уваходам у тэатр[154], а таксама некалькіх іншых людзей, якія былі ў гэтай частцы тэатра пасля нападу[155]. Паводле іх паказанняў, значная частка жыхароў тэатра – магчыма, траціна, – хавалася ў гэтай зоне.

Масіўная выгнутая сцяна, якая аддзяляла сцэну ад уваходу ў тэатра, забяспечвала людзям, якія там хаваліся, пэўную абарону. Збыткоўны ціск выбуховай хвалі мог быць тут мацнейшым, чым у пярэднім падвале, але людзі ўсё адно былі абароненыя ад асколкаў боепрыпасаў.

Паводле словаў выжылых, якіх апытала Amnesty International, і відэазапісаў з некаторых частак гэтай зоны, усе ці амаль усе ў ёй выжылі, аднак многія былі параненыя. Amnesty International апытала жанчыну, якія была ў гардэробе ў пярэдняй частцы тэатра, калі здарыўся выбух. «Я пайшла туды, каб дапамагчы раздаць ежу, – сказала яна. – Хлопчык побач са мной быў сур’ёзна паранены шклом... ён крыкнуў мне, што нам трэба ісці [з гардэроба]… мы пайшлі ў вестыбюль. Мы нічога не бачылі. Там было воблака пылу... людзі крычалі», – сказала яна[156]. Вікторыя Дубавіцкая была падчас выбуху ў апаратным памяшканні ў задняй частцы канцэртнай залы з двума сваімі дзецьмі і адным чужым. Яна паведаміла, што яе зусім маленькую дачку засыпала абломкамі[157].

Адзін чалавек, які размаўляў з Amnesty, зрабіў відэа адразу пасля выбуху. На ім відаць мноства пакрытых пылам людзей на лесвічных клетках ля галоўнага ўваходу[158]. Аўтар відэа расказаў Amnesty пра тое, што ён бачыў, але што не трапіла на відэа. «Было шмат параненых, многія былі ў крыві. Там была пажылая жанчына ў позе эмбрыёна, якая схапілася за лесвіцу», – сказаў ён[159].

Amnesty апытала некалькіх чалавек, якія пасля выбуху хадзілі па розных частках калідораў на першым, другім і трэцім паверхах. Яны бачылі параненых людзей, некаторыя з якіх выйшлі з канцэртнай залы, але ніхто з іх не бачыў целаў[160].

154 Інтэрв’ю Amnesty International з Наталляй Ткачэнка, 6 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 4 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Наталляй Ганчаровай і Валерам Ганчаровым, 22 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Ліліяй Міхайлюк і Аляксеем Міхайлюком, 10 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Марыяй Радыёнавай, 7 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Вікторыяй Дубавіцкай, 6 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Аленай Мацюшынай, 25 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Анастасіяй Карпеевай, 19 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімныя), 5 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімныя), 6 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 23 красавіка 2022 г.

155 Інтэрв’ю Amnesty International з Ігарам Наўкам, 22 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Ігарам Мацюшыным, 30 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 2 траўня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Алегам Карынным, 10 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімныя), 22 траўня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 28 траўня 2022 г.

156 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 25 красавіка 2022 г.

157 Інтэрв’ю Amnesty International з Вікторыяй Дубавіцкай, 8 красавіка 2022 г.; падрабязней пра гісторыю Вікторыі гл.: Associated Press, “AP evidence points to 600 dead in Mariupol theatre airstrike,” 4 траўня 2022 г., apnews.com/article/Russia-ukraine-war-mariupol-theater-c321a196fbd568899841b506afcac7a1

158 Відэа апублікаваў Guardian, “Inside Mariupol theatre after deadly bombing,” дасяжнае на: www.youtube.com/watch?v=AToLpVOTljU

159 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 5 красавіка 2022 г.

160 Інтэрв’ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 12 чэрвеня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Алегам Карынным, 10 красавіка 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International з Ігарам Наўкам, 13 чэрвеня 2022 г.; інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 25 красавіка 2022 г.

## ЗАДНЯЯ ЧАСТКА

Задняя частка тэатра ўключае ўсе памяшканні над і пад зямлёй паміж заднім уваходам і сцэнай. Яна ўлучае «кухню», «медыцынскі кабінет», «радыёрубку» і шматлікія памяшканні і калідоры, дзе спалі людзі.

Amnesty апытала пяцярых чалавек, якія былі ў памяшканнях паміж задняй часткай сцэны і заднім уваходам у тэатр[161], аднаго, які быў у часткова падземным падвале бліжэй да задняй часткі тэатра[162], і некалькіх чалавек, якія зайшлі ў заднюю частку тэатра пасля ўдару[163]. Паводле іх паказанняў, у задняй частцы тэатра ў памяшканнях паміж сцэнай і заднім уваходам было каля 100 чалавек; як паведамляецца, яшчэ прыкладна 20 чалавек хавалася ў заднім падвале.

У выніку ўдару задняя частка тэатра атрымала вялікія пашкоджанні ад выбуху і асколкаў. Высокі збыткоўны ціск і абвальванне апорных частак будынка прычыніліся да шматлікіх сур'ёзных раненняў. У памяшканні на другім паверсе задняй часткі тэатра знаходзіліся жанчына, яе маці і бабуля. У выніку выбуху ўсе трое атрымалі сур'ёзныя раненні (гл. раздзел 3.6 ніжэй)[164]. Сяргей Забагонскі і Яўгенія Забагонская былі падчас выбуху ў памяшканні адразу за сцэнай. Сяргей сказаў Amnesty International, што выбух знішчыў дзверы іх памяшкання, аднак сцены, у тым ліку сцяну за сцэнай, не разбурыў[165]. Таксама Сяргей расказаў Amnesty, што ў памяшканні побач з тым, дзе былі яны з Яўгеніяй і якое таксама прымыкала да сцэны, была група цяжарных жанчынаў і маладых маці. Ён паведаміў Amnesty International, што сцяна ў тым пакоі таксама вытрымала і жанчыны выжылі[166].

Ігар Наўка, яго жонка Надзея і сяброўка Надзеі былі падчас выбуху на ўнутранай кухні ў задняй частцы тэатра. Ігар расказаў Amnesty, што частка столі на кухні абвалілася. «Мы з жонкай аказаліся пад заваламі, – сказаў ён. – Ёй удалося выбрацца з кухні без чужой дапамогі. Яна прывяла [двух чалавек, мужа і пляменніка сяброўкі], каб дапамагчы мне... яны зрабілі дзірку ў сцяне»[167].

Таксама Amnesty International апытала мужа і жонку, якія дапамагалі выкопваць Ігара з-пад завалаў. Жонка, якая ў час атакі знаходзілася ў гардэробе ў пярэдняй частцы тэатра, расказала Amnesty International, як яна адтуль выйшла, абышла тэатр, зайшла праз задні ўваход і пасля – у задні падвал, дзе знайшла свайго мужа і дзяцей, а таксама яшчэ некалькіх чалавек, у тым ліку Рыту, жонку забітага выбухам Ігара Чысцякова. Рыта і яе сыны жылі ў падвале побач. Жанчына прыгадала:

> **Я ўбачыла свайго мужа; ён быў у крыві. У Рыты былі параненыя грудзі... Мы дапамаглі ўсім выбрацца з-пад завалаў... Нам удалося [бяспечна] выцягнуць Рыту і жанчынаў трох пакаленняў, якія таксама былі ў падвале... мы сышлі, узяўшы**

161 Інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Галінай Кутняковай, 1 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Наўкам, 22 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 22 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Забагонскай, 2 траўня 2022 г.

162 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 28 красавіка 2022 г.

163 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімныя), 19 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімныя), 3 траўня 2022 г., інтэрв'ю Amnesty International (ананімныя), 4 траўня 2022 г.

164 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 22 красавіка 2022 г.

165 Інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.

166 Інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.

167 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 28 красавіка 2022 г.

**толькі сваіх дзяцей і дакументы... па дарозе мы пачулі, як хлопчык кліча на дапамогу... ён спрабаваў адкапаць сваю цётку на кухні... мой муж пайшоў яму дапамагчы... і ім удалося выцягнуць [цётку хлопчыка] і [Ігара Наўку] з кухні[168].**

## КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛА/СЦЭНА/КУЛІСЫ + ПАДВАЛ

Канцэртная зала ўключае глядацкую зону ў партэры, балконы ўнутры тэатра і сцэну (у тым ліку кулісы па абодва бакі ад яе), а таксама прастору пад сцэнай.

Amnesty International апытала дваіх чалавек, якія былі ў канцэртнай зале падчас выбуху – Наталлю Грабянецкую і Яўгена Грабянецкага. У прыватнасці, падчас выбуху яны знаходзіліся на балконе першага паверха ля сцэны[169]. Наталля была параненая. Amnesty International апытала таксама пяць чалавек, якія былі ў канцэртнай зале незадоўга да нападу[170]; двое з іх пасля яго вярнуліся на балконы[171]. Таксама Amnesty International апытала чалавека, які дапамагаў адкопваць двух чалавек, пахаваных пад абломкамі ў канцэртнай зале[172].

Канцэртная зала/сцэна тэатра атрымалі самыя сур'ёзныя пашкоджанні, якія ўлучаюць абвальванне даху. На галоўную прастору тэатра прыйшоўся надзвычайны збыткоўны ціск выбуховай хвалі, і ва ўсе бакі разляцеліся асколкі боепрыпасаў. Больш за ўсё маглі б пацярпець людзі на сцэне, за кулісамі і на месцах у партэры. Людзі на верхніх балконах, самых далёкіх ад сцэны, маглі б зведаць збыткоўны ціск у 4 фунты на квадратны дзюйм – узровень, дастатковы для таго, каб выклікаць вялізныя траўмы і, магчыма, смерць[173]. Незразумела, колькі чалавек тут выжыла. Любы чалавек у гэтай зоне аказаўся б надзвычай блізка да месца выбуху і з высокай доляй імавернасці загінуў бы ці атрымаў сур'ёзныя раненні.

Ацэнкі, якія атрымала Amnesty International, вагаюцца ад 20 да 50 чалавек, якія знаходзіліся ў гэтай зоне падчас удару; многія з іх былі на балконе другога паверха ці на першым паверсе пад балконамі. Паводле паказанняў, большая частка людзей на балконах выжыла. Дзмітрый Сіманенка пабываў пасля нападу на балконе другога паверха і паведаміў Amnesty International, што, на яго думку, людзі там выжылі. «Яны мусілі застацца ў жывых, бо я быў там пасля і не бачыў крыві ці целаў, толькі пыл і элементы канструкцыі»[174]. Таксама ён бачыў сядзенні на балконе трэцяга паверху і не бачыў аніякіх целаў.

168 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 25 красавіка 2022 г.

169 Інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй Грабянецкай і Яўгенам Грабянецкім, 16 красавіка 2022 г.

170 Інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй Ткачэнка, 6 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 4 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Марыяй Радыёнавай, 7 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 2 траўня 2022 г.

171 Інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 4 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.

172 Інтэрв'ю Amnesty International з Алегам Карынным, 10 красавіка 2022 г.

173 Калькулятар параметраў выбуху Кінгеры-Булмаш праграмы ААН SaferGuard паказвае, што на адлегласці ў 50 м выбух 500 кг у тратылавым эквіваленце стварае другасны ціск у 4,2 фунта на квадратны дзюйм, што можа выклікаць сур'ёзныя траўмы, unsaferguard.org/un-saferguard/kingery-bulmash; Zipf and Cashdollar, "Effects of blast pressure on structures and the human body," cdc.gov/niosh/docket/archive/pdfs/niosh-125/125-explosionsandrefugechambers.pdf

174 Інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 12 чэрвеня 2022 г.

Дзмітрый таксама быў у зоне за заслонай прыкладна за паўгадзіны перад нападам. Ён сказаў, што бачыў там каля 10 чалавек, у тым ліку дзяцей[175]. Сяргей Забагонскі, які быў на сцэне за некалькі хвілінаў да ўдару, сказаў, што не бачыў там людзей, апроч аховы складу прыпасаў, што мясціўся за кулісамі. «Генератар [які быў на сцэне] у гэты час не працаваў», – сказаў ён[176]. Меркавалася, што за кулісамі, якія прымыкалі да сцэны, ці ў падвале пад ёй было зусім мала людзей; паведамлялася, аднак, што ля выхаду да палявой кухні, якая мясцілася ля склада, амаль заўсёды збіралася некалькі чалавек[177]. Паведамлялася таксама, што лесвіца ля выхаду да палявой кухні засталася пасля выбуху непашкоджанай[178].

Зарэгістраваны адзін смяротны выпадак (Любоў Свірыдава), які падчас удару меў месца ў канцэртнай зале. Пацярпелая змагла выбрацца, але памерла ад атрыманых траўмаў (гл. раздзел 3.6 ніжэй). Amnesty International заслухала паказанні пра адзін неапазнаны труп ля калідора ў зоне пад сцэнай[179]. Алег Карынны таксама паведаміў, што дапамог выкапаць двух цяжкапараненых з-пад завалаў у канцэртнай зале (гл. раздзел 3.6 ніжэй).

## ВОНКАВАЯ ЗОНА, ПЕРАДУСІМ ПАЛЯВАЯ КУХНЯ

Падчас нападу вакол тэатра былі людзі, асабліва перад ім (ля аўтацыстэрны з вадой) і на палявой кухні, дзе гатавалі ежу, якую раздавалі ўнутры. Падчас нападу палявая кухня была адгароджаная драўлянымі паддонамі. Невялікая колькасць людзей гатавала таксама ежу на меншых вогнішчах у раёне палявой кухні далей ад будынка.

Людзі ля задняй часткі будынка, асабліва побач з кулісамі, былі абароненыя ад асколкаў боепрыпасаў, але ўсё адно маглі пацярпець ад выбуху. Згодна са створанай для Amnesty матэматычнай мадэллю, нават непасрэдна ля тэатра збыткоўны ціск выбуховай хвалі дасягаў 2,6 фунта на квадратны дзюйм – узроўню, якога дастаткова, каб атрымаць сур’ёзныя траўмы, асабліва звязаныя з падзеннем абломкаў канструкцыі[180].

---

175 Інтэрв’ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 21 чэрвеня 2022 г.

176 Інтэрв’ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.

177 Інтэрв’ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 20 чэрвеня 2022 г.

178 Інтэрв’ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 20 чэрвеня 2022 г.

179 Інтэрв’ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 2 траўня 2022 г.

180 Dr. F. Dalnoki-Veress, CNS/MIIS, “Memo: Investigating the Mariupol Drama Theatre Bombing,” 9 траўня 2022 г., дасяжнае на: oneamnesty.sharepoint.com/sites/app-secretariatopensend/Shared%20Documents/Forms/AllItems.aspx?id=%2Fsites%2Fapp%2Dsecretariatopensend%2FShared%20Documents%2FResearch%2FMariupol%20%2D%20Ukraine%20EMBARGOED%2030%20JUNE%202022%2FInvestigation%20into%20the%20Mariupol%20Theatre%20Bombing%2FMemo%20%2D%20Investigating%20the%20Mariupol%20theater%20bombing%2Epdf&parent=%2Fsites%2Fapp%2Dsecretariatopensend%2FShared%20Documents%2FResearch%2FMariupol%20%2D%20Ukraine%20EMBARGOED%2030%20JUNE%202022%2FInvestigation%20into%20the%20Mariupol%20Theatre%20Bombing&p=true&ga=1; Zipf and Cashdollar, “Effects of blast pressure on structures and the human body,” cdc.gov/niosh/docket/archive/pdfs/niosh-125/125-explosionsandrefugechambers.pdf

Amnesty International пагаварыла з чатырма людзьмі, якія былі на палявой кухні за некалькі хвілінаў да нападу[181], і двума людзьмі, якія былі на палявой кухні прыкладна за 30 хвілінаў да яго[182]. Паводле іх ацэнак, у гэтым раёне было ад 5 да 20 чалавек, пра некаторых з якіх вядома, што яны загінулі[183].

Адзін мужчына, які раней быў валанцёрам на кухні, расказаў Amnesty, што сышоў адтуль усяго за некалькі хвілінаў да ўдару, каб паесці з сям'ёй. «Я быў на палявой кухні за пяць-сем хвілінаў да нападу. Затым пайшоў паесці [у падвал у задняй частцы тэатра]… на жаль, там было шмат людзей [на палявой кухні, калі я сыходзіў], бо яны гатавалі», – сказаў ён Amnesty International[184].

Amnesty International пацвердзіла тры ўжо пацверджаныя смяротныя выпадкі ў раёне палявой кухні: Міхаіл Грабянецкі, Алена Кузняцова і Ігар Чысцякоў. Апытаныя таксама назвалі Amnesty International імёны (без прозвішчаў) траіх чалавек, якія, на іх думку, загінулі ў выніку нападу, у тым ліку дваіх чалавек, якія загінулі на палявой кухні, і аднаго, які, імаверна, загінуў на сцэне ці ля яе[185].

## 3.6 ПАВЕДАМЛЕННІ З ПЕРШЫХ РУК ПРА СТРАТЫ

Апытаныя далі Amnesty International паказанні пра чатырох чалавек, якія загінулі ў выніку авіяўдару.

Наталля Грабянецкая і Яўген Грабянецкі былі ў момант выбуху ў канцэртнай зале. Міхаіл Грабянецкі, муж Наталлі і бацька Яўгена, быў звонку на палявой кухні. Ён загінуў у выніку нападу. Яўген расказаў Amnesty, што пасля выбуху адправіўся шукаць бацьку і знайшоў яго цела пад абломкамі:

> **Я вярнуўся, каб знайсці тату... Было шмат параненых. Я памятаю адну жанчыну, у якой тырчаў з нагі метал. Яна клікала на дапамогу... Паліцыя спрабавала выцягваць людзей з-пад завалаў... Спачатку я ўбачыў яго руку. Спачатку я ўбачыў знаёмую руку. Ты ж ведаеш руку сваіх блізкіх. Яго твар быў у крыві. Яго цела было пакрытае цэглай... Я не хацеў, каб мама бачыла[186].**

Дзмітрый Сіманенка і Наталля Ткачэнка жылі ў канцэртнай зале з Любоўю Свірыдавай і яе партнёрам Анатолем[187]. У выніку ўдару Люба загінула. Наталля і Дзмітрый расказалі Amnesty

181 Інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй Ганчаровай і Валерам Ганчаровым, 22 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімныя), 19 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 20 чэрвеня 2022 г.

182 Інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Наўкам, 13 чэрвеня 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Яўгеніяй Забагонскай, 20 чэрвеня 2022 г.

183 Паводле Associated Press, у палявой кухні было 100 чалавек; аднак паказанні, сабраныя Amnesty International, не пацвярджаюць гэтую лічбу. Гл. Associated Press, "AP evidence points to 600 dead in Mariupol theatre airstrike," 4 траўня 2022 г., apnews.com/article/Russia-ukraine-war-mariupol-theater-c321a196fbd568899841b506afcac7a1

184 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 19 красавіка 2022 г.

185 Інтэрв'ю Amnesty International з Анастасіяй Карпеевай, 20 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 20 чэрвеня 2022 г.

186 АмІнтэрв'ю Amnesty International з Яўгенам Грабянецкім, 16 красавіка 2022 г.

187 Інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 8 красавіка 2022 г.; інтэрв'ю Amnesty International з Наталляй ТКачэнка, 6 красавіка 2022 г.



↑ *Наталля Грабянецкая і Яўген Грабянецкі ў Запарожжы, Украіна, 16 красавіка 2022 г.*
*Міхаіл Грабянецкі, муж Наталлі і бацька Яўгена, загінуў у нападзе на драматычны тэатр.*
*© Вольга Івашчанка*

International, што за некалькі хвілінаў да нападу яны выйшлі з канцэртнай залы і падышлі да аўтацыстэрны перад тэатрам, каб набраць вады. У момант удару яны былі ў тэатры ля галоўнага ўваходу. Дзмітрый расказаў Amnesty International, як убачыў Любу пасля выбуху, перад тым, як яна памерла. «Я ўбачыў Любу. Яна была цяжка параненая. Ёй удалося выпаўзці з-пад завалаў... нехта наклаў ёй на сцягно імправізаваныя павязкі... неўзабаве яна памерла... яна папрасіла нас запомніць яе імя, бо адчувала, што памірае»[188].

Алена Мацюшына паведаміла Amnesty International імя сваёй сяброўкі Алены Кузняцовай, якая нарадзілася ў 1976 г. і загінула ў выніку ўдару. «Я даглядала яе сына Сашу, калі ў тэатр трапіла бомба. Яна памерла на палявой кухні», – сказала Алена Amnesty International. Нацыянальная паліцыя Украіны таксама перадала Amnesty International звесткі пра смерць Алены Кузняцовай[189].

Адзін з выжылых у нападзе на тэатр назваў Amnesty International свайго сябра Ігара Чысцякова, які, паводле яго словаў, загінуў у выніку ўдару. Падчас нападу Ігар быў на палявой кухні. Жонка Ігара Рыта і сыны Давід і Цімур знаходзіліся ў падвале ў задняй частцы тэатра, калі здарыўся напад. Яны выжылі[190].

Таксама выжылыя і сведкі апісалі тых загінулых, якіх не змаглі апазнаць. «[Пасля ўдару], раскопваючы завалы [ля палявой кухні], каб [знайсці кухара, які працаваў на палявой кухні], я бачыў рукі і ногі, але мы не былі ўпэўненыя, чые яны», – паведаміў Amnesty International Дзмітрый Сіманенка[191]. Адзін мужчына, які выйшаў з палявой кухні за некалькі хвілінаў да нападу і падчас удару быў у тэатры ля галоўнага ўваходу, расказаў Amnesty, што збег з тэатра са сваёй сям'ёй праз некалькі хвілінаў пасля нападу, але пасля вярнуўся, каб забраць дакументы сваё сям'і з першага паверха ля галоўнага ўвахода. Ён прыгадаў, што калі пайшоў па дакументы, то бачыў некалькі трупаў. «Я бачыў, як людзі выносілі целы вонкі. Шмат целаў, пакрытых коўдрамі. Я стараўся не глядзець на іх. Я бачыў ногі і рукі ўнутры драматычнага тэатра»[192]. Марыя Радыёнава выйшла з канцэртнай залы за некалькі хвілінаў да ўдару, каб набраць вады. Яна была ля галоўнага ўваходу ў тэатр, калі здарыўся выбух. «Я бачыла чалавека тварам уніз у [лужыне] крыві ля ўвахода», – сказала яна[193].

Выжылыя і сведкі расказалі пра людзей, якія былі сур'ёзна параненыя ў выніку ўдару. Адна жанчына была са сваёй 57-гадовай маці і 86-гадовай бабуляй у задняй частцы тэатра, калі здарыўся выбух. Яна расказала Amnesty International, што знайшла сваіх маці і бабулю пад абломкамі, яны былі непрытомныя:

> **[Мама і бабуля выжылі] дзякуючы мне. Але мама ў жудасным стане, на яе галаву абвалілася столь... Я выцягнула іх з агню. Я была адзінай, хто не страціла прытомнасці. Быў чорны дым, і сцены і столь абвальваліся... Спатрэбіўся паўны час, каб знайсці целы мамы і бабулі. Выбуховая хваля ссунула іх... Я змагла знайсці іх дзякуючы абутку...**

188 Інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 8 красавіка 2022 г.
189 Ліставанне Amnesty International з Нацыянальнай паліцыяй, 21 траўня 2022 г.
190 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 28 красавіка 2022 г.
191 Інтэрв'ю Amnesty International з Дзмітрыем Сіманенкам, 8 красавіка 2022 г.
192 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 28 красавіка 2022 г.
193 Інтэрв'ю Amnesty International з Марыяй Радыёнавай, 7 красавіка 2022 г.

**Я цягнула маму... у яе былі выбітыя зубы... яе нага была ненатуральна вывернутая... ніхто не мог мне дапамагчы, бо ўсе выкрыквалі імёны сваіх сямейнікаў... Мама сказала, што хоча памерці... Калі мы выбраліся з тэатра, то папрасілі машыну спыніцца і забраць нас[194].**

Потым яна расказала пра пакутлівы досвед у шпіталі ў Марыупалі, а затым – пра цяжкое падарожжа з Марыупаля ў шпіталь на падкантрольнай Украіне тэрыторыі, дзе доктар паведаміў ёй, што ў яе маці зламаныя таз, нага, рука, калена і ключыца і што яна перанесла цяжкую чэрапна-мазгавую траўму[195].

Лілія Міхайлюк расказала Amnesty International, як яе параніла і які хаос і жах яна назірала пасля ўдару:

**Я стаяла звонку [тэатра], проста ля цэнтральнага ўвахода, каб праверыць, ці няма эвакуацыйных аўтобусаў. Муж быў па іншы бок сцяны ля галоўнага уваходу ў тэатр. Перад гэтым мы абмяркоўвалі, што чуем самалёт... потым быў выбух. Мяне адкінула выбуховай хваляй у жывот... Я думала пра сваю дачку...**

**Я праверыла, ці не параненая галава... Я ўдарылася галавой. Я думала, што памру. У мяне на галаве была вялізная рана... Я пабегла ў сярэдзіну. Я нічога не бачыла. Было шмат пылу і дыму. Людзі выкрыквалі імёны. Дзеці выкрыквалі імёны. Я чула, як мой муж выкрыкваe маё імя... мы дакрануліся адно да аднаго і, ні слова не кажучы, пабеглі на трэці паверх, каб праверыць дачку... было шмат параненых, якія стагналі і крычалі... мы пабеглі на трэці паверх... мы знайшлі сваю дачку і дачку нашай суседкі... мы сказалі ім забраць рэчы... потым мы пайшлі ў падвал... муж застаўся звонку [падвала], каб выкрыкваць імя Марыі [Кутняковай][196].**

Выбраўшыся з кухні, Ігар Наўка адправіўся шукаць сваю маці і, пакуль шукаў яе, убачыў шмат цяжкапараненых. «Я бачыў чалавека з амаль адарванай нагой. Іншы чалавек звычайным нажом адразаў нагу, каб накласці жгут... Я бачыў шмат людзей са зламанымі канцавінамі... Дапамог аднесці двух параненых з тэатра [у суседнюю кватэру]», – расказаў ён Amnesty[197].

Amnesty пагаварыла з некалькімі іншымі людзьмі, якія таксама дапамагалі знайсці людзей, пахаваных пад заваламі. Алег Карынны, ваенны медык паводле адукацыі, які, аднак апошнія два гады працаваў як журналіст, падчас нападу ішоў да тэатра, каб набраць вады. Ён сутыкнуўся з сябрам, які быў у тэатры падчас удару. «[Мой сябар] быў увесь у пыле», – сказаў Алег. Ён дапамог сябру, а пасля вырашыў адправіцца ў тэатр шукаць выжылых. Разам з іншым мужчынам яму ўдалося адкапаць з-пад завалаў у канцэртнай зале двух чалавек:

**Я вярнуўся ў кватэру, каб узяць аптэчку... Потым я пабег праз цэнтральны ўваход тэатра. Я бачыў пыл і дым. Я ішоў з суседам... Нам удалося трапіць у канцэртную залу. Мы выйшлі на сцэну... Мы ўвайшлі ў канцэртную залу. Гэта**

194 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 22 красавіка 2022 г.
195 Інтэрв’ю Amnesty International (ананімнае), 22 красавіка 2022 г.
196 Інтэрв’ю Amnesty International з Ліліяй Міхайлюк і Аляксеем Міхайлюком, 10 красавіка 2022 г.
197 Інтэрв’ю Amnesty International з Ігарам Наўкам, 22 красавіка 2022 г.

**была крушня з abломкаў, бетону і дрэва... Мы пачалі капаць. Знайшлі цела мужчыны. Гэта быў стары. Ён быў без прытомнасці. Я знайшоў яго пульс. Але ў яго не было ніводнай нагі... Я заліў яго раны лекамі. Мы паклалі яго на коўдру [як на імправізаваныя насілкі] і вынеслі з драматычнага тэатра.**

**Звонку мы ўбачылі суседзяў, якія размяшчалі [іншых параненых] людзей у машыне – белым нісане... [Месца ў іх машыне больш не было, таму] мы аднеслі параненага ў раён [парка] ля туалетаў, дзе ўжо ляжалі некалькі іншых параненых... Мы ўзялі яшчэ адну коўдру і тым жа шляхам вярнуліся ў тэатр... Было чуваць, як у гарадскім цэнтры лётаюць самалёты і скідваюць бомбы...**

**Мы працягвалі раскопваць завалы. Мы чулі, як нехта стогне... Чалавек, якога мы знайшлі, быў засыпаны бетонам. Абедзве яго нагі былі пашкоджаныя. У яго былі адкрытыя пераломы на абедзвюх нагах... У мяне быў адзін жгут. Ён стагнаў, і мы не маглі зразумець, што ён гаворыць... Мы выцягнулі яго за адзенне і паклалі на коўдру... Я наклаў жгут, бо ён губляў шмат крыві. Мы наклалі павязкі... Ён быў цяжка паранены. Спрабавалі спыніць крывацёк... Мы аднеслі яго ў тое ж месца, дзе паклалі першага чалавека...**

**Мы пачалі вяртацца трэці раз, але выбухі былі зусім побач. Мы маглі адчуваць [вібрацыі ад выбухаў] уласнымі целамі[198].**

Ігар Мацюшын расказаў Amnesty International, што пасля выбуху дапамог пасадзіць некалькіх параненых у машыны[199]. Іншы чалавек расказаў Amnesty International, што неўзабаве пасля нападу пайшоў у задні падвал. «Мы знайшлі мужчыну і жанчыну. Жанчына была ў шоку, а мужчына быў пад абломкамі. Я дапамог яго вынесці»[200]. Яшчэ адзін чалавек сказаў, што выцягнуў з-пад завалаў маладую жанчыну і хлопчыка[201]. Сяргей Забагонскі расказаў, што дапамог выцягнуць з-пад завалаў траіх чалавек ў раёне ля палявой кухні[202].

198 Інтэрв'ю Amnesty International з Алегам Карынным, 10 красавіка 2022 г.

199 Інтэрв'ю Amnesty International з Ігарам Мацюшыным, 30 красавіка 2022 г.

200 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 3 траўня 2022 г.

201 Інтэрв'ю Amnesty International (ананімнае), 4 траўня 2022 г.

202 Інтэрв'ю Amnesty International з Сяргеем Забагонскім, 18 чэрвеня 2022 г.

# 4. МІЖНАРОДНАЯ ПРАВАВАЯ АСНОВА

Асноўнымі крыніцамі міжнароднага права з’яўляюцца дамовы і звычаёвае права[203]. Міжнароднае права дазваляе дзяржавам выкарыстоўваць сілу толькі ў абмежаваных абставінах, у прыватнасці, дзеля самаабароны ці пры наяўнасці санкцыі Рады Бяспекі ААН дзеля падтрымання ці ўзнаўлення міжнароднага міру ці бяспекі[204]

Незаконнае прымяненне сілы з’яўляецца злачынствам агрэсіі[205]. 28 лютага Генеральная Асамблея ААН пастанавіла, што ўварванне Расійскай Федэрацыі ва Украіну было незаконным прымяненнем сілы, якое парушыла Статут ААН[206]. 16 сакавіка 2022 г. Міжнародны суд ААН прыняў у дачыненні да Расіі часовыя меры, каб прыпыніць яе ваенную аперацыю[207].

## МІЖНАРОДНАЕ ГУМАНІТАРНАЕ ПРАВА

Міжнароднае гуманітарнае права (МГП), якое таксама называюць правам узброеных канфліктаў ці законамі вайны, – гэта корпус права, якое галоўным чынам рэгулюе ўзброеныя канфлікты. Усе бакі канфлікту звязаныя аднымі і тымі ж нормамі МГП незалежна ад таго, удзельнічаюць яны ў законным (напрыклад, дзеля самаабароны) ці незаконным прымяненні сілы (напрыклад, у агрэсіі)[208].

203 ААН, Венская канвенцыя аб праве міжнародных дамоваў паміж дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі ці паміж міжнароднымі арганізацыямі, 12 сакавіка 1986 г., дасяжная на: refworld.org/docid/3ae6b3924.html; Згодна з Артыкулам 2(1)(a) Венскай канвенцыі аб праве міжнародных дамоваў, 1969, дамова – гэта «міжнароднае пагадненне, якое заключанае паміж дзяржавамі ў пісьмовай форме і рэгулюецца міжнародным правам[.]”; звычаёвае міжнароднае права адносіцца да міжнародна-прававых абавязацельстваў, якія выцякаюць з усталяванай міжнароднай практыкі, у адрозненне ад пісаных канвенцый і дамоваў – вызначэнне формаў гл.: Інстытут прававой інфармацыі, “Звычаёвае міжнароднае права”, law.cornell.edu/wex/customary_international_law

204 ААН, Статут Арганізацыі Аб’яднаных Нацый і Статут Міжнароднага суда (Статут ААН), 24 кастрычніка 1945 г., Артыкул 51, дасяжны на: refworld.org/docid/3ae6b3930.html; Статут ААН, Артыкул 39 (цытаваўся раней).

205 Генеральная Асамблея ААН, Рымскі статут Міжнароднага крымінальнага суда (апошняе змяненне – 2010 г.), 17 ліпеня 1998 г., Артыкул 8, дасяжны на: refworld.org/docid/3ae6b3a84.html

206 Генаральная Асамблея ААН, Рэзалюцыя, прынятая Генеральнай Асамблеяй 2 сакавіка 2022 г., 18 сакавіка 2022 г., дасяжная на: documents-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/N22/293/36/PDF/N2229336.pdf?OpenElement

207 Міжнародны суд ААН, “Заявы пра генацыд у адпаведнасці з Канвенцыяй аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго (Украіна супраць Расійскай Федэрацыі)”, 16 сакавіка 2022 г., icj-cij.org/public/files/case-related/182/182-20220316-ORD-01-00-EN.pdf

208 Міжнародны агляд Чырвонага Крыжа, Adam Robert, The equal application of the laws of war: a principle under pressure, Том 90 Нумар 872, снежань 2008 г., international-review.icrc.org/sites/default/files/irrc-872-6.pdf

Розныя дамовы і звычаі МГП прымяняюцца ў залежнасці ад таго, вядзецца пра міжнародны (МУК) ці пра неміжнародны ўзброены канфлікт (НУК). МУК узнікае тады, калі дзве дзяржавы ўступаюць ва ўзброены канфлікт адна з адной[209]. Канфлікт паміж Расійскай Федэрацыя і Украінай адносіцца да МУК[210]. Асноўнымі дамовамі, якія рэгулююць МУК, з'яўляюцца Гаагская канвенцыя, чатыры Жэнеўскія канвенцыі (ЖКІ-IV) і Дадатковы пратакол I да Жэнеўскіх канвенцый (ДПІ), – усе яны адносяцца да звычаёвага міжнароднага права і, такім чынам, з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх бакоў канфлікту, у тым ліку ўрадаў Расіі і Украіны. Расійская Федэрацыя і Украіна ратыфікавалі Гаагскія канвенцы, ЖКІ-IV і ДПІ[211].

Нормы МГП абмяжоўваюць метады і сродкі вядзення вайны, іх мэта – звядзенне да мінімум чалавечых пакутаў і забеспячэнне абароны цывільных асобаў і асобаў, якія не бяруць непасрэднага ўдзелу ў баявых дзеяннях. МГП уключае некалькі ўзаемазвязаных асноўных прынцыпаў. Асаблівае значэнне ў нападзе на Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр у Марыупалі маюць прынцыпы ваеннай неабходнасці, адрознення, прапарцыйнасці і засцярогі.

Прынцып *ваеннай неабходнасці* прадугледжвае, што дзяржавам дазваляецца прымяняць сілу толькі ў тым выпадку, калі гэта «неабходна дзеля дасягнення законных ваенных мэтаў і іншым чынам не забараняецца міжнародным гуманітарным правам»[212]. Адзіная законная ваенная мэта ва ўзброеным канфлікце – знішчыць ці аслабіць ваенны патэнцыял іншага боку[213].

Прынцып *адрознення* – ключавы прынцып МНП – палягае ў тым, што бакі ва ўзброеным канфлікце мусяць заўсёды праводзіць розніцу паміж цывільнымі асобамі і цывільнымі аб'ектамі, з аднаго боку, і вайскоўцамі і ваенным аб'ектамі, з іншага. Ваенныя аб'екты могуць рабіцца цэллю нападу, удары ж па цывільных асобах і цывільных аб'ектах з'яўляюцца незаконнымі[214].

У той час як цывільнае насельніцтва абароненае ад прамых нападаў, іх законным аб'ектам могуць быць вайскоўцы ўзброеных сілаў (за выключэннем рэлігійнага і медыцынскага персаналу, а таксама асобаў, якія выбылі з шыхту ў выніку ранення, хваробы ці паланення) і асобы, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у баявых дзеяннях. Асобныя цывільныя асобы могуць страціць імунітэт ад нападаў на час, калі яны непасрэдна ўдзельнічаюць у баявых дзеяннях. У сумнеўных выпадках асобы мусяць лічыцца цывільнымі і абараняцца ад непасрэднага нападу[215]. Супрацоўнікі праваахоўных органаў, такіх, як паліцыя, не

209 Пракурор супраць Душкі Тадзіча ака «Дуле» (Меркаванне і суджэнне), IT-94-1-T, Міжнародны крымінальны трыбунал па былой Югаславіі (ICTY), 7 траўня 1997 г., с. 561, refworld.org/cases,ICTY,4027812b4.html

210 Міжнародны суд ААН, "Заявы пра генацыд у адпаведнасці з Канвенцыяй аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго (Украіна супраць Расійскай Федэрацыі)", 16 сакавіка 2022 г., icj-cij.org/public/files/case-related/182/182-20220316-ORD-01-00-EN.pdf

211 МКЧК, Дамовы, дзяржавы-ўдзельніцы і каментары: Украіна, ihl-databases.icrc.org/applic/ihl/ihl.nsf/vwTreatiesByCountrySelected.xsp?xp_countrySelected=UA; ICRC, Treaties, States Parties, and Commentaries: Russian Federation, ihl-databases.icrc.org/applic/ihl/ihl.nsf/vwTreatiesByCountrySelected.xsp?xp_countrySelected=RU

212 МКЧК, "Ваенная неабходнасць", casebook.icrc.org/glossary/military-necessity

213 МКЧК, "Ваенная неабходнасць", casebook.icrc.org/glossary/military-necessity

214 МКЧК, Звычаёвае МНП, Нормы 1 і 7, дасяжныя на: ihl-databases.icrc.org/customary-ihl/eng/docs/v1_rul_rule1 і; ihl-databases.icrc.org/customary-ihl/eng/docs/v1_rul_rule7 і; Дадатковы пратакол да Жэнеўскіх канвенцый 12 жніўня 1949 г., які тычыцца абароны ахвяраў неміжнародных узброеных канфліктаў (Пратакол II), 8 чэрвеня 1977 г., 1125 UNTS 609, дасяжны на: refworld.org/docid/3ae6b37f40.htm

215 Пратакол I, Артыкул 50(1).

лічацца камбатантамі, калі толькі яны не інтэграваныя ва ўзброеныя сілы і не ўдзельнічаюць у баявых дзеяннях[216]. Прамыя напады на цывільнае насельніцтва і асобных цывільных асобаў, якія не бяруць непасрэднага ўдзелу ў баявых дзеяннях, забароненыя і з’яўляюцца ваеннымі злачынствамі[217].

У нападзе мяжа мусіць праводзіцца не толькі паміж цывільнымі асобамі і камбатантамі, але і «паміж цывільнымі аб’ектамі і ваеннымі цэлямі»[218]. Цывільныя аб’екты абараняюцца ад нападу, за выключэннем выпадкаў і на той час, калі яны не выкарыстоўваюцца для ваенных мэтаў. Ваенныя цэлі – «аб’екты, якія па сваім характары, размяшчэнні, прызначэнні ці выкарыстанні робяць істотны ўнёсак у баявыя дзеянні, і ў абставінах, якія складваюцца на той ці іншы момант, іх частковае ці поўнае знішчэнне, захоп ці абясшкоджванне даюць пэўную ваенную перавагу»[219]. Напад на цывільныя аб’екты з’яўляецца ваенным злачынствам[220].

З прынцыпу адрознення выцякае забарона на невыбіральныя напады[221]. Невыбіральныя напады – тыя, якія «(а) не накіраваныя на канкрэтную ваенную цэль; (б) выкарыстоўваюць метад ці сродак вядзення бою, якія не могуць быць накіраваныя на канкрэтную ваенную цэль, ці (в) выкарыстоўваюць метад ці сродак вядзення бою, наступствы якіх не могуць быць абмежаваныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі міжнароднага гуманітарнага права; адпаведна, кожны з такіх выпадкаў па прыродзе сваёй прадугледжвае нанясенне ўдараў як па ваенных цэлях, так і па цывільных асобах ці цывільных аб’ектах без адрознення»[222]. Невыбіральныя напады, якія «прыводзяць да гібелі ці раненняў цывільных асобаў або пашкоджання цывільных аб’ектаў», паводле звычаёвага міжнароднага права з’яўляюцца ваеннымі злачынствамі; прэцэдэнтная практыка пацвярджае, што паводле Рымскага статуту яны таксама могуць трактавацца як ваенныя злачынствы, калі прыраўноўваюцца да нападаў, скіраваных на цывільных асобаў[223].

Прынцып *прапарцыйнасці* прадугледжвае, што напады не мусяць быць непрапарцыйнымі. Напад з’яўляецца непрапарцыйным, калі «можна чакаць, што ён пацягне за сабой выпадковыя смерці і раненні цывільных асобаў і пашкоджанні цывільных аб’ектаў, ці тое і іншае разам, якія былі б празмернымі ў дачыненні да канкрэтнай і непасрэднай ваеннай перавагі, якую чакаецца атрымаць»[224]. Напад, здзейснены з веданнем, што ён прывядзе да празмерных выпадковых смерцяў, раненняў ці пашкоджанняў, з’яўляецца ваенным злачынствам[225].

Перад любым нападам вайскоўцы мусяць прыняць захады засцярогі, каб пераканацца: іх упэўненасць у тым, што іх цэль – не цывільныя асобы і цывільныя аб’екты, абгрунтаваная. Падчас ваенных аперацый «неабходна пастаянна клапаціцца пра тое, каб зберагчы цывільнае насельніцтва, цывільных асобаў

216 МКЧК, Звычаёвае МНП, Практыка адносна нормы 4.
217 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 156, с. 591; Рымскі статут МКС, арт. 8 (2) (e) (i).
218 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 7.
219 МКЧК, Звычаёвае МНП, Нормы 8 і 10.
220 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 156, с. 597.
221 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 11; АР 54(1).
222 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 12.
223 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 156.
224 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 14.
225 Дадатковы пратакол I, Артыкул 85(3)(b).

і цывільныя аб’екты»; мусяць быць прынятыя «ўсе магчымыя засцярогі», каб пазбегнуць выпадковых смерцяў і раненняў цывільных асобаў і пашкоджання цывільных аб’ектаў і звесці іх да мінімуму[226].

Тыя, хто плануе напады і прымае адпаведныя рашэнні, мусяць таксама рабіць усё магчымае, каб праверыць, ці з’яўляюцца іх цэлі ваеннымі, выбіраць сродкі і метады нападаў, якія звядуць да мінімуму выпадковыя смерці сярод цывільных і пашкоджанні, ацэньваць прапарцыйнасць нападаў і адмяняць ці прыпыняць іх, калі робіцца відавочным, што яны маюць няправільны кірунак ці з’яўляюцца непрапарцыйнымі[227]. Калі абставіны дазваляюць, бакі мусяць загадзя эфектыўна папярэджваць пра напады, якія могуць зачапіць цывільнае насельніцтва[228]. Прымаць усе магчымыя засцярогі – вызначаны паводле міжнароднага гуманітарнага права абавязак, які мае істотнае значэнне для забеспячэння таго, што напады не будуць невыбіральнымі і непрапарцыйнымі.

Бакі канфлікту мусяць прымаць усе магчымыя засцярогі дзеля абароны цывільных асобаў і цывільных аб’ектаў, якія знаходзяцца пад іх кантролем, ад наступстваў нападу праціўніка[229]. У прыватнасці, кожны бок мусіць, наколькі гэта магчыма, пазбягаць размяшчэння ваенных цэляў у густанаселеных раёнах ці побач з імі і прыбіраць цывільных асобаў і аб’екты, якія знаходзяцца пад яго кантролем, з непасрэднай блізкасці ад ваенных цэляў[230]. Катэгарычна забараняецца выкарыстоўваць «жывыя шчыты», гэта значыць, карыстацца прысутнасцю (ці перамяшчэннямі) цывільных ці іншых абароненых асобаў дзеля аховы пэўных пунктаў ці тэрыторый (або ўзбоеных сілаў) ад ваенных аперацый[231]. Выкарыстанне «жывога шчыта» з’яўляецца ваенным злачынствам[232].

У сумнеўных выпадках бакі канфлікту мусяць трымацца таго, што традыцыйна цывільны аб’ект захоўвае свой цывільны статус. Культурныя каштоўнасці карыстаюцца ў адпаведнасці з МГП асаблівай абаронай[233]. Наўмысны напад на культурныя каштоўнасці з’яўляецца ваенным злачынствам[234].

Парушэнне МГП адным з бакоў канфлікту ніякім чынам не змяншае абавязкі іншых сілаў, якія ўдзельнічаюць у канфлікце, абіраць законныя цэлі, наносіць па іх удары так, каб яны не былі невыбіральнымі ці непрапарцыйнымі, і рабіць усе магчымыя захады, каб як мага менш нашкодзіць цывільнаму насельніцтву[235].

---

226 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 15; падрабязней пра захады засцярогі пры нацэльванні гл. William H. Boothby, The Law of Targeting, Oxford University Press, 2012, раздзел 5.

227 МКЧК, Звычаёвае МНП, Нормы 16-19.

228 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 20.

229 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 22.

230 МКЧК, Звычаёвае МНП, Нормы 23 і 24.

231 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 97.

232 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 156.

233 Пратакол II да Гаагскай канвенцыі аб культурных каштоўнасцях. МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 40.

234 Рымскі статут, артыкул 8(2)(b)(ix): “Наўмыснае нанясенне ўдараў па будынках, якія выкарыстоўваюцца дзеля рэлігійных, адукацыйных, мастацкіх, навуковых ці дабрачынных мэтаў, гістарычных помніках, шпіталях і месцах, дзе збіраюцца хворыя і параненыя, калі яны не з’яўляюцца ваеннымі аб’ектамі[.]”.

235 Пратакол I, артыкул 51(8): “Любое парушэнне гэтых забаронаў не вызваляе бакі канфлікту ад юрыдычных абавязацельстваў у дачыненні да цывільнага насельніцтва і цывільных асобаў, у тым ліку ад абавязацельства рабіць захады засцярогі, прадугледжаныя Артыкулам 57”.

## МІЖНАРОДНАЕ КРЫМІНАЛЬНАЕ ПРАВА

Міжнароднае права ў галіне правоў чалавека прымяняецца да ўсіх дзяржаваў ва ўсе часы, у тым ліку падчас МУК[236]. Артыкул 6(1) Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах гаворыць, што «кожны чалавек мае неад'емнае права на жыццё. Ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены жыцця». Гэтае права – імператыўная норма міжнароднага права, і яго ніколі нельга прыпыніць ці нейкім чынам адступіць ад яго, ні ў мірны, ні ў ваенны час[237]. Абавязацельства краіны-ўдзельніцы паважаць права на жыццё распаўсюджваецца на «асобаў, якія знаходзяцца за межамі любой тэрыторыі, што эфектыўна кантралюецца дзяржавай, чыё права на жыццё, тым не менш, прамым і разумна прадказальным чынам закранаюць ваенныя ці іншыя дзеянні»[238]. У сітуацыях узброенага канфлікту, – такіх, як вайна ва Украіне, – дзе прымяняюцца МГП і нормы ў галіне правоў чалавека, парушэнні МГП, якія вядуць да гібелі цывільных і іншых абароненых асобаў, таксама з'яўляюцца адвольным пазбаўленнем жыцці і такім чынам парушаюць права на жыццё[239].

## МІЖНАРОДНАЕ КРЫМІНАЛЬНАЕ ПРАВА

Міжнароднае крымінальнае права (МКП) – гэта корпус права, які ўтрымлівае нормы, што забараняюць пэўныя дзеянні як ваенныя злачынствы. Асобы, якія здзейснілі ваенныя злачынствы, нясуць крымінальную адказнасць. Не ўсе парушэнні МГП з'яўляюцца ваеннымі злачынствамі, аднак імі з'яўляюцца сур'ёзныя парушэнні дамоваў ці звычаёвых нормаў МГП, асабліва тыя, якія ствараюць пагрозу для цывільных ці іншых абароненых асобаў ці аб'ектаў[240]. Рымскі статут з'яўляецца прававым дакументам, які утрымлівае пералік злачынстваў, што трапляюць пад юрысдыкцыю Міжнароднага крымінальнага суда (МКС)[241]. Пэўныя парушэнні МГП могуць быць ваеннымі злачынствамі паводле звычаёвага міжнароднага права, але не ваеннымі злачынствамі паводле Рымскага статута.

Як і ў нацыянальных сістэмах крымінальнага права, злачынствы паводле МКП патрабуюць, каб забароненыя паводзіны (супрацьпраўнае дзеянне – *actus reus*) мелі месца ў пэўным стане розуму (злачынны намер, ці *mens rea*). Станы розуму, якія маюць дачыненне да МКП, уключаюць *намер*, які прадугледжвае асэнсаванне таго, што дзеянне прывядзе да выніку, і волю, каб дабіцца гэтага выніку, *бяздумнасць* (вядомую таксама як ускосны намер), якая прадугледжвае наўмыснае прыняцце рызыкі, якая, як вядома, можа прывесці да выніку (г.зн. свядомае ігнараванне імавернасці выніку),

---

236 Міжнародны суд ААН, Законнасць пагрозы ядзернай зброяй або яе прымяненнем, кансультатыўнае заключэнне, 8 ліпеня 1996 г., даклады Міжнароднага суда ААН 1996 г.; Юрыдычныя наступствы будаўніцтва сцяны на акупаванай палесцінскай тэрыторыі, кансультатыўнае заключэнне, 9 ліпеня 2004 г., даклады Міжнароднага суда ААН 2004 г., параграф 106 і; Amnesty International, Deadly Assistance: The role of European States in US drone strikes, красавік 2018, с. 22, amnesty.org/en/documents/act30/8151/2018/en/ .і; Міжнародны агляд Чырвонага Крыжа, Louise Doswald-Beck, The right to life in armed conflict: does international humanitarian law provide all the answers? Том 88, нумар 864, снежань 2006 г., дасяжны на: icrc.org/en/doc/assets/files/other/irrc_864_doswald-beck.pdf і; Клініка правоў чалавека Калумбійскай школы і Цэнтра стратэгічных даследаванняў Саны, "Out of the Shadows: Recommendations to Advance Transparency in the Use of Lethal Force," чэрвень 2017 г., outoftheshadowsreport.com/

237 Камітэта па правах чалавека ААН, Агульны каментар 36 да Артыкула 6: Права на жыццё (2018), CCPR/C/GC/36, пар. 2.

238 Агульны каментар 36, пар. 63.

239 Агульны каментар 36, пар. 64.

240 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 156.

241 Генеральная Асамблея ААН, Рымскі статут Міжнароднага крымінальнага суда, Артыкул 8 (апошняе змяненне – 2010 г.), 17 ліпеня 1998 г., ISBN No. 92-9227-227-6, дасяжны на: refworld.org/docid/3ae6b3a84.html

без фактычнага жадання дабіцца яго, і *грубая нядбайнасць*, якая прадугледжвае ігнараванне пэўных захадаў засцярогі, якія ў такой сітуацыі чакаюцца ад разумнага чалавека. Злачынны намер, які ляжыць у аснове аднаго і таго ж злачынства, можа па-рознаму разглядацца звычаёвым міжнародным правам, асобнымі дамовамі (такімі, як Рымскі статут) і дзяржаўнымі судамі[242].

Асобы, якія здзяйсняюць ваенныя злачынствы ці аддаюць адпаведныя загады, нясуць індывідуальную крымінальную адказнасць[243]. Ваенныя камандзіры і цывільныя чыноўнікі могуць таксама несці адказнасць за дзеянні сваіх падначаленых, калі яны ведалі ці мелі падставы ведаць, што такія злачынствы вось-вось будуць здзейсненыя ці ўжо здзейсніліся, і не зрабілі патрэбных захадаў, каб прадухіліць іх ці пакараць тых, хто нясе адказнасць за ўжо здзейсненыя злачынствы[244].

## АБАВЯЗАК РАССЛЕДАВАЦЬ І ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА СУДА

У адпаведнасці з міжнародным правам расійскія ўлады абавязаныя праводзіць аператыўныя, старанныя, незалежныя, бесстаронніх, празрыстыя і эфектыўныя расследаванні сітуацый, калі гаворка ідзе пра адвольнае пазбаўленне жыцця і парушэнні міжнароднага гуманітарнага права (МГП), – такія, як дзеянні, апісаныя ў гэтым дакладзе[245]. Урад Украіны таксама мусіць расследаваць патэнцыйна незаконныя забойствы ў межах сваіх абавязацельстваў абараняць права на жыццё ўсіх, хто знаходзіцца пад яго юрысдыкцыяй[246]. Да таго ж, урад Расіі мусіць забяспечыць поўнаю кампенсацыю шкоды ахвярам парушэнняў МГП і права на жыццё[247].

Усе дзяржавы маюць права надзяляць свае нацыянальныя суды ўніверсальнай юрысдыкцыяй ў дачыненні да ваенных злачынстваў, здзейсненых у іншых дзяржавах[248]. Яны мусяць расследаваць ваенныя злачынствы, у дачыненні да якіх маюць юрысдыкцыю і, калі гэта неабходна, прыцягваць падазраваных да суда ці выдаваць іх іншай дзяржаве, якая можа гэта зрабіць[249].

242 A. Cassese, “Cassese’s International Criminal Law,” Oxford University Press, 2008, раздзел 3.2.

243 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 151.

244 МКЧК, Звычаёвае МНП, Нормы 152 і 153.

245 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 158; Арыткул 2(3) МПГПП. Гл. Камітэт па правах чалавека ААН, Агульны каментар 31 пра характар агульнага юрыдычнага абавязацельства, якое накладаецца пактам на дзяржавы-ўдзельніцы, CCPR/C/21/Rev.1/Add.13, пар. 15, 16 і 18: Агульны каментар 36 да Артыкула 6: Права на жыццё (2018), CCPR/C/GC/36, para. 27-28; гл. таксама Прынцыпы ААН па эфектыўным папярэджанні і расследаванні пазасудовых, адвольных і сумарных пакаранняў смерцю, Прынцыпы з 9 па 20; Асноўныя прынцыпы і палажэнні ААН, якія тычацца права на юрыдычную абарону і кампенсацыю шкоды для ахвяраў грубых парушэнняў міжнародных нормаў у галіне правоў чалавека і сур’ёзных парушэнняў міжнароднага гуманітарнага права, пар. 3; Мінесоцкі пратакол па расследаванні патэнцыйна незаконнай смерці (2016) (апублікаваны УВКПЧ у 2017 г.), пар. 20.

246 Каметэт па правах чалавека ААН, Агульны каментар 36, пар. 27.

247 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 150, дасяжная на: ihl-databases.icrc.org/customary-ihl/eng/docs/home; Генеральная Асамблея ААН, Асноўныя прынцыпы і палажэнні ААН, якія тычацца права на юрыдычную абарону і кампенсацыю шкоды для ахвяраў грубых парушэнняў міжнародных нормаў у галіне правоў чалавека і сур’ёзных парушэнняў міжнароднага гуманітарнага права: рэзалюцыя / прынятая Генарльанй Асамблеяй ААН, 21 сакавіка 2006 г., A/RES/60/147; refworld.org/docid/4721cb942.html; Камітэт па правах чалавека, Агульны Каментар 36, пар. 19 і 28.

248 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 157.

249 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 158.

# 4.1 НАПАД НА ТЭАТР ПАВОДЛЕ МІЖНАРОДНАГА ПРАВА

Сведчанні, пададзеныя ў гэтым дакладзе, паказваюць, што ў нападзе на драматычны тэатр расійскія войскі, імаверна, выкарысталі дзве 500-кілаграмовыя бомбы. Сведчанні дакладна не вызначаюць, *чаму* напад на тэатр адбыўся, а гэта важна для вызначэння таго, ці з'яўляецца ён ваенным злачынствам. Аднак вывучэнне чатырох магчымых тлумачэнняў нападу паказвае, што *ўсе* імаверныя сцэнары з'яўляюцца ваеннымі злачынствамі.

Amnesty International прапанавала чатыры магчымыя тлумачэнні, чаму расійскія войскі напалі на тэатр:

1. Тэатр зрабілі цэллю з веданнем, што гэта цывільны аб'ект.
2. Тэатр зрабілі цэллю, мяркуючы, што гэта сапраўдны ваенны аб'ект.
3. Тэатр не быў цэллю, а пацярпеў у выніку невыбіральнага нападу.
4. Тэатр не быў цэллю, а памылкова пацярпеў у нападзе на іншае месца, здзейсненым з думкай, што яно з'яўляецца ваенным аб'ектам.

Сведчанні пераканаўча даводзяць, што драматычны тэатр быў намечанай цэллю нападу. Тэатр быў вялікім пазнавальным будынкам і культурнай славутасцю горада. Да таго ж, ён стаяў адасоблена у цэнтры вялікага парку, аточаны прыкладна 100-метровай зялёнай зонай, вакол якой ішла шырокая дарога. Удар адбыўся ясным ранкам і прыйшоўся на ўнутраную частку асноўнага корпуса тэатра. Побач з тэатрам не было законных ваенных цэляў.

Калі тэатр быў цэллю, то з улікам першага магчымага тлумачэння ёсць сур'ёзныя падставы меркаваць, што расійскія войскі ведалі, што гэта цывільны аб'ект. Цывільны характар тэатра быў відавочны і лёгка пазнавальны для ўсіх бакоў канфлікту. Як мінімум за тры дні да нападу на зямлі ля галоўнага і задняга ўваходаў у тэатр напісалі па-руску слова «ДЗЕЦІ», прычым літары былі дастаткова вялікімі, каб іх можна было ўбачыць з самалётаў.

Больш за тое, у перыяд паміж пачаткам вайны і часам нападу было відавочна, што ў тэатры і ля яго прысутнічае шмат цывільных асобаў: сотні цывільных асобаў жылі ў тэатры і яшчэ больш наведвала яго штодня, каб набраць вады і атрымаць звесткі пра эвакуацыйныя калідоры. І хаця многія цывільныя асобы хаваліся ўнутры тэатра, іх прысутнасць – іх «вобраз жыцця» – мусіла быць лёгка пазнавальнай для расійскіх войскаў. Людзі рэгулярна станавіліся ў чаргу, каб набраць вады з вялікай аўтацыстэрны, якая стаяла перад тэатрам, і гатавалі на палявой кухні і невялікіх вогнішчах за яе межамі, цывільныя асобы – у тым ліку дзеці – заходзілі ў тэатр і выходзілі з яго.

Сведчанні не толькі дэманструюць прысутнасць цывільных асобаў, але і даводзяць, што тэатр не быў сапраўднай ваеннай цэллю. Згодна з паказаннямі сведкаў і спадарожнікавымі здымкамі, у тэатры ці ля яго не было ваеннай тэхнікі, ніхто з вайскоўцаў не вёў з тэатра агонь і не хаваўся там на рэгулярнай аснове. Больш за тое, спадарожнікавыя здымкі не паказваюць маштабнай ваеннай прысутнасці ў тэатры за некалькі дзён да нападу і праз некалькі хвілінаў

пасля яго. Ваенная прысутнасць у тэатры ці ля яго ў дні да нападу была, у найлепшым выпадку, нязначнай і спарадычнай, а падчас нападу яе магло ўвогуле не быць. Невялікая колькасць вайскоўцаў, якія бывалі ў тэатры, або дастаўлялі ежу, распаўсюджвалі інфармацыю, высаджвалі цывільных асобаў, эвакуяваных з іншых частак горада, або, у рэдкіх выпадках, наведвалі свае сем'і. Ніводнае з гэтых дзеянняў нават блізка не магло прывесці да страты тэатрам свайго цывільнага статусу.

Гэтыя і іншыя факты, якія выкладзеныя ў гэтым дакладзе і ў якіх дэталёва прапісваецца відавочна цывільны характар тэатра і адсутнасць любых законных ваенных цэляў у ім ці ля яго (асабліва тых, якія патрабавалі б такога нападу), указваюць на тое, што расійскія войскі, хутчэй за ўсё, наўмысна абралі тэатр цэллю, ведаючы, што гэта цывільны аб'ект. Калі гэта так, то напад парушыў ключавы прынцып адрознення паводле МГП і мусіць трактавацца як ваеннае злачынства – напад на цывільных асобаў[250].

Калі тэатр быў намечанай цэллю, то (беручы пад увагу другі варыянт) няма падставаў меркаваць, што расійскія войскі вартым даверу чынам выканалі свае абавязацельствы паводле міжнароднага гуманітарнага права, асабліва тыя, што тычацца захадаў засцярогі, і шчыра верылі, што тэатр – сапраўдная ваенная цэль.

Калі б расійскія войскі нанеслі ўдар па тэатры, мяркуючы, што гэта ваенная цэль, законнасць удару залежала б ад таго, ці былі ў такога меркавання законныя падставы (г.зн., ці схіліліся яны да яго пасля таго, як выканалі свае абавязацельствы паводле міжнароднага гуманітарнага права зрабіць захады засцярогі, каб цэллю не зрабіліся цывільныя асобы і цывільныя аб'екты). Сведчанні паказваюць, што гэтага быць не можа. Тэатр лёгка пазнаваўся як цывільны аб'ект, і гэта мусілі ведаць расійскія войскі, якія дзейнічалі ў тым раёне. Не існуе разумнай інтэрпрэтацыі фактаў, паводле якой расійскія войскі выканалі свае абавязацельствы, прыняўшы захады засцярогі, і тым не менш падчас нападу памылкова палічылі тэатр законнай ваеннай цэллю.

Мяркуючы са сведчанняў, якія разгледзела Amnesty International, любая выснова пра тое, што тэатр быў сапраўднай ваеннай цэллю, будзе грунтавацца на памылках, якія нельга лічыць выключна вынікам нядбайнасці (ці нават грубай нядбайнасці), якая хоць і з'яўляецца парушэннем МГП,[251] усё ж, па сутнасці, не раўназначная ваеннаму злачынству; вінаватыя, хутчэй, мусілі дзейнічаць бяздумна, свядома пагарджаючы імавернымі наступствамі сваіх дзеянняў, а менавіта ўдару па цывільнай цэлі і забойства цывільных асобаў. Такі бяздумны ўдар быў бы ваенным злачынствам

250 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма I, ihl-databases.icrc.org/customary-ihl/eng/docs/v1_rul_rule1; Рымскі статут, артыкул 8(2)(b)(i) "Наўмыснае нанясенне ўдараў па цывільным насельніцтве як такім ці па асобных цывільных асобах, якія непасрэдна не ўдзельнічаюць у баявых дзеяннях"; і 8(2)(b)(i) "Наўмыснае нанясенне ўдараў па цывільных аб'ектах, гэта значыць, аб'ектах, якія не з'яўляюцца ваеннымі цэлямі".

251 A. Cassese, "Cassese's International Criminal Law," Oxford University Press, 2008, раздзел 3.2.

паводле звычаёвага міжнароднага права і, магчыма, таксама паводле Рымскага статута[252].

Хаця прыведзенае вышэй даследаванне паказвае, чаму расійскія войскі не маглі вартым даверу чынам і законна лічыць тэатр сапраўднай ваеннай цэллю, тэарэтычна магчыма, што ў якасці цэлі яны маглі абраць вайскоўцаў. Напрыклад, расійскія войскі маглі напасці на тэатр, мяркуючы (імаверна, памылкова), што ўнутры знаходзіцца невялікая колькасць салдатаў. Калі гэта так, то напад быў непрапарцыйным. Нанясенне ўдару па аб’екце, дзе размясцілася такая вялікая колькасць цывільных асобаў, з выкарыстаннем зброі, якой дастаткова для таго, каб выклікаць разбуральныя наступствы на вялікай заселенай тэрыторыі, будзе непрапарцыйным, калі толькі там няма надзвычай важнай ваеннай цэлі, якую немагчыма знішчыць ці нейтралізаваць іншымі сродкамі і не папярэдзіўшы цывільнае насельніцтва. Сведчанні даводзяць, што наяўнасць такой ваеннай цэлі – ці чагосьці, што можна было б законна, хоць і памылкова, палічыць ёй, – унутры тэатра не з’яўляецца верагоднай. Такі непрапарцыйны напад быў бы ваенным злачынствам[253].

Калі тэатр не быў цэллю нападу і, улічваючы трэцюю магчымасць, удар быў нанесены невыбіральна, паводле звычаёвага міжнароднага права ён будзе лічыцца ваенным злачынствам – невыбіральным нападам, у якім загінулі цывільныя асобы[254]. Невыбіральныя напады расійскіх войскаў здзяйсняліся па ўсёй Украіне і былі зарэгістраваныя ў Марыупалі[255]. Аднак ёсць мала падставаў меркаваць, што авіяўдар па тэатры быў невыбіральным, асабліва калі ўлічыць адасобленае размяшчэнне будынка.

Калі тэатр не быў цэллю нападу і, улічваючы чацвёртую магчымасць, удар па ім нанеслі памылкова пры спробе трапіць у іншую цэль, якая лічылася ваенным аб’ектам, законнасць нападу будзе залежаць ад таго, ці быў законным памылковы ўдар. Міжнароднае права дапускае промахі пры ўмове, што камандзір намерваўся трапіць у сапраўдную цэль, а выкарыстаныя сродкі і метады адпавядалі ёй.

252 Прэцэдэнтнае права, якое пацвярджае выснову пра тое, што бяздумнасць з’яўляецца дастатковай у якасці злачыннага намеру для здзяйснення ваенных злачынстваў у сітуацыях нападу на цывільных асобаў, гл. Міжнародны крымінальны трыбунал па былой Югаславіі (ICTY), Пракурор супраць Галіча, Справа No. IT-98-29-T, Рашэнне Судовай палаты, 5 снежня, 2003 г. Інфармацыю пра дэбаты вакол бяздумнасці як злачыннага намеру для ваенных злачынстваў паводле звычаёвага міжнароднага права гл: Браян Л. Кокс, “Recklessness, intent, and war crimes: refining the legal standard and clarifying the role of international criminal tribunals as a source of customary international law,” Cornell Law Faculty Publications, 23 чэрвеня 2022 г.; хаця Рымскі статут наўпрост не ўключае бяздумнасць, навукоўцы сцвярджаюць, што яна падразумяваецца ў вызначэнні намеру ў статуце. Гэтае меркаванне прасоўвае Антонiё Касезэ ў працы “Cassese’s International Criminal Law”, дзе бяздумнасць (ці так званы dolus eventualis, або ўскосны намер) вызначаецца як “стан розуму, у якім чалавек прадбачыць, што яго ці яе дзеянне можа прывесці да забароненых наступстваў, і тым не менш добраахвотна ідзе на рызыку”. Падрабязней пра дэбаты пра бяздумнасць як злачынны намер для ваенных злачынстваў паводле Рымскага статут гл. Gerhard Werle and Florian Jessberger, ‘Unless Otherwise Provided’: Article 30 of the ICC Statute and the Mental Element of Crimes under International Criminal Law, Journal of International Criminal Justice, Том 3, 2005.

253 Рымскі статут, артыкул 8(2)(b)(iv) “Наўмысны напад, здзейснены з веданнем, што ён пацягне за сабой выпадковы смерці і раненні цывільных асобаў ці шкоду цывільным аб’ектам або маштабную, доўгатэрміновую і сур’ёзную шкоду прыроднаму асяроддзю, якая відавочна будзе празмернай у параўнанні з канкрэтнай і непасрэднай ваеннай перавагай, якую чакаецца атрымаць”.

254 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 11; МКЧК, Звычаёвае МНП, Практыка адносна нормы 11.

255 Гл. Amnesty International, ‘Anyone Can die at any time’: Indiscriminate attacks by Russian forces in Kharkic, Ukraine, 13 чэрвеня 2022 г., amnesty.org/en/documents/eur50/5682/2022/en/; Amnesty International, “Ukraine: Russia’s cruel siege warfare tactics unlawfully killing civilians – new testimony and investigation,” 1 красавіка 2021 г., www.amnesty.org/en/latest/news/2022/04/ukraine-russias-cruel-siege-warfare-tactics-unlawfully-killing-civilians-new-testimony-and-investigation/; Amnesty International, ‘He’s Not Coming Back’: War Crimes in Northwest Areas of Kyiv Oblast,” 6 траўня 2022 г., amnesty.org/en/documents/eur50/5561/2022/en/

Каб памылковы ўдар быў у такім выпадку законным, у межах КІА выкарыстанай зброі – 500-кілаграмовай бомбы ці крылатай ракеты, – ці вельмі блізка ад яго мусіла быць ваенная цэль. Як ужо згадвалася, цэнтр масы ўдару па геаграфічна ізаляванай цэлі робіць такі промах надзвычай малаімаверным. А асаблівы і адасоблены характар тэатра робіць памылку пілота крайне малапраўдападобнай. Больш за тое, спадарожнікавыя здымкі і паказанні сведкаў, якія ўказваюць на тое, што падчас нападу ў прылеглых да тэатра раёнах ваенныя дзеянні не вяліся, яшчэ раз пацвярджаюць, што ўдар не быў памылковым. І хаця, як паведамляецца, прыкладна ў час нападу ў ваколіцах тэатра ішлі баі, яны былі недастаткова блізка, каб апраўдаць такі промах.

Да таго ж, нават калі б побач была ваенная цэль, расійскія войскі ўсё адно мусілі б зрабіць захады засцярогі, каб «пазбегнуць выпадковых смерцяў і раненняў цывільных асобаў і пашкоджанняў цывільных аб’ектаў і, ва ўсякім разе, звесці іх да мінімуму»[256]. Як апісвалася вышэй, у гэтым нападзе, відаць, не былі зробленыя магчымыя захады засцярогі, каб пазбегнуць траплення ў лёгка пазнавальны цывільны аб’ект, вакол якога было мноства цывільных асобаў. У выніку, калі б па тэатры прыйшоўся ўдар, цэллю якога быў іншы аб’ект, гэта ў любым разе сведчыла б пра тое, што не былі зробленыя магчымыя захады засцярогі, каб цэллю стаўся сапраўдны ваенны аб’ект і каб пазбегнуць удараў па цывільных асобах і/ці аб’ектах. Такі бяздумны ўдар быў бы ваенным злачынствам як паводле звычаёвага міжнароднага права, так, магчыма, і паводле Рымскага статута.

256 МКЧК, Звычаёвае МНП, Норма 151.

# 5. ВЫСНОВЫ І РЭКАМЕНДАЦЫІ

Напад на Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр у Марыупале быў трагедыяй. Таксама ён зрабіўся трагічным сімвалам адчайнага становішча цывільных жыхароў Марыупаля ў бягучым канфлікце. Хаця яны спрабавалі ўцячы ад яго, схаваўшыся ў тэатры, вайна прыйшла да іх, і мноства цывільных асобаў загінула і атрымала жудасныя раненні.

Чаму на гэтых цывільных асобаў быў здзейснены напад, невядома, але відавочна, што ўдар не быў ваеннай неабходнасцю. Актыўнасць цывільных асобаў у Данецкім акадэмічным абласным драматычным тэатры лёгка ідэнтыфікавалася, і, паколькі хоць нейкай значнай ваеннай прысутнасці там не было, можна меркаваць, што расійскія войскі, імаверна, наўмысна нанеслі па тэатры ўдар, ведаючы, што гэта цывільны аб'ект, і гэта з'яўляецца ваенным злачынствам. Таксама сведчанні паказваюць, што пры любой разумнай інтэрпрэтацыі трох іншых, менш імаверных сцэнароў – што тэатр зрабілі цэллю, палічыўшы яго сапраўдным ваенным аб'ектам, што па ім памылкова нанеслі ўдар падчас нападу на іншую цэль ці што ён пацярпеў у выніку невыбіральнага нападу, – удар усё адно будзе лічыцца ваенным злачынствам.

Любыя следчыя, якія вывучаюць гэты інцыдэнт, у тым ліку Канцылярыя Пракурора МКС, мусяць старанна разгледзець яго найбольш імавернае тлумачэнне, а таксама іншыя праўдападобныя тлумачэнні, і правесці адпаведнае расследаванне. Гэта найменшае, чаго заслугоўваюць выжылыя ў нападзе, сем'і ахвяраў і насельніцтва Марыупаля.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ

### УРАДУ РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

- Спыніць усе прамыя напады на цывільных асобаў, невыбіральныя напады і іншыя сур'ёзныя парушэнні міжнароднага гуманітарнага права.
- Цалкам выконваць нормы міжнароднага гуманітарнага права падчас планавання і правядзення нападаў, у тым ліку перагледзець крытэры выбару цэляў, каб быць пэўнымі,

што яны не скіроўваюцца на цывільных асобаў, і рабіць у планаванні і правядзенні нападаў усе магчымыя захады засцярогі, у тым ліку адмяняць удары, калі ёсць сумнеў, ці з'яўляецца цэль ваеннай або калі ўдары могуць быць непрапарцыйнымі ці невыбіральнымі.

- Правесці незалежнае, бесстаронняе, старраннае і празрыстае расследаванне нападу ў Данецкім акадэмічным абласным драматычным тэатры.
- Пры наяўнасці дастатковых дапушчальных доказаў злачынства прыцягнуць падазраваных да адказнасці ў межах справядлівага судовага разбору без прымянення смяротнага пакарання.
- Супрацоўнічаць з незалежнымі расследаваннямі нападу на драматычны тэатр, у тым ліку даўшы незалежным даследчыкам, такім, як следчыя па крымінальных справах, праваабаронцы і журналісты, вольны доступ да месца нападу.
- Прызнаць страты сярод цывільнага насельніцтва, прычыненыя нападам на тэатр, і прапанаваць кампенсацыі і тлумачэнні выжылым і сем'ям тых цывільных асобаў, якія загінулі.
- Забяспечыць ахвярам нападу на тэатр і іх сем'ям доступ да правасуддзя і поўную кампенсацыю, у тым ліку рэстытуцыю, кампенсацыйныя выплаты, рэабілітацыю, задавальненне патрабаванняў і гарантыі непаўтарэння.

## УРАДУ І ОФІСУ ГЕНЕРАЛЬНАГА ПРАКУРОРА УКРАІНЫ

- Правесці незалежнае, бесстаронняе, старраннае і празрыстае расследаванне нападу ў Данецкім акадэмічным абласным драматычным тэатры.
- Пры наяўнасці дастатковых дапушчальных доказаў злачынства прыцягнуць падазраваных да адказнасці ў межах справядлівага судовага разбору без прымянення смяротнага пакарання.

## МІЖНАРОДНАМУ КРЫМІНАЛЬНАМУ СУДУ

- Расследаваць напад на Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр.

## ІНШЫМ УРАДАМ

- У адпаведнасці з прынцыпам універсальнай юрысдыкцыі правесці расследаванне і прыцягнуць да адказнасці вінаватых у нападзе на Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр.

**AMNESTY INTERNATIONAL – ГЭТА СУСВЕТНЫ РУХ У АБАРОНУ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА. КАЛІ НЕСПРАВЯДЛІВАСЦЬ ЗДАРАЕЦЦА З АДНЫМ ЧАЛАВЕКАМ, ГЭТА ТЫЧЫЦЦА ЎСІХ НАС.**


ЗВЯЗАЦЦА З НАМІ

info@amnesty.org

+44 (0)20 7413 5500


ДАЛУЧАЙЦЕСЯ ДА АБМЕРКАВАННЯ

www.facebook.com/AmnestyGlobal

@Amnesty



↑ Сяргей Забагонскі, актор, які раней выступаў у тэатры і выжыў у нападзе, стаіць ля задняй часткі тэатра праз некалькі імгненняў пасля выбуху.
© Сяргей Забагонскі

# «ДЗЕЦІ»
## НАПАД НА ДАНЕЦКІ АКАДЭМІЧНЫ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР У МАРЫУПАЛІ, УКРАІНА

16 сакавіка 2022 года, неўзабаве пасля 10:00, расійскі авіяўдар зруйнаваў Данецкі акадэмічны абласны драматычны тэатр у Марыупалі, Украіна. Падчас нападу ў тэатры і вакол яго знаходзіліся сотні цывільных асобаў; многія з іх загінулі. Тэатр выразна ўспрымаўся як цывільны аб'ект, магчыма, нават у большай ступені, чым любое іншае месца ў горадзе. Сведчанні, сабраныя Amnesty International, паказваюць, што напад быў ваенным злачынствам.

У перыяд з 16 сакавіка па 21 чэрвеня Amnesty International сабрала і прааналізавала шэраг сведчанняў, звязаных з нападам на тэатр, у тым ліку атрыманыя з першых рук паказанні 53 выжылых і тых, хто быў сведкам нападу і яго наступстваў, 28 з якіх знаходзіліся падчас нападу у тэатры ці побач з ім.

Сур'ёзнасць парушэння і выкліканыя ім чалавечыя пакуты падкрэсліваюць неабходнасць правесці далейшыя неадкладныя і празрыстыя расследаванні, каб вызначыць поўны маштаб чалавечых стратаў і прыцягнуць вінаватых да крымінальнай адказнасці за гібель і сур'ёзныя раненні цывільных асобаў і шкоду, нанесеную цывільнай інфраструктуры.

Індэкс: EUR 50/5713/2022 Belarusian
Чэрвень 2022
amnesty.org